**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па гуманітарнай адукацыі**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
______ А.І.Жук
30.04.2012
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № ТД- Д.206 /тып.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XX — ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

**Тыпавая праграма**
**для устаноў вышэйшай адукацыі**
**па спецыяльнасцях**
**1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках)**

**УЗГОДНЕНА**

Старшыня
Вучэбна-метадычнага аб'яднання
па гуманітарнай адукацыі
______ У.Л. Клюня
12.04.2012

**УЗГОДНЕНА**

Начальнік Упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
______ С.І.Раманюк
30.04.2012

Прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі
"Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы"
______ В.І. Шупляк
20.04.2012

Эксперт-нормакантралёр
______ Н.В Сіняк
20.04.2012

Мінск 2012

Складальнікі:
**Бельскі Алесь Іванавіч**, прафесар кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар;
**Верабей Анатоль Леанідавіч,** дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
**Казлова Вольга Васільеўна,** дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
**Навуменка Павел Іванавіч**, дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
**Навумовіч Уладзімір Аляксандравіч**, дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
**Тычына Міхась Аляксандравіч**, прафесар кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта, доктар філалагічных навук;
**Шамякіна Таццяна Іванаўна**, загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар

Рэцэнзенты:
Кафедра беларускай літаратуры Установы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава";
ШТЭЙНЕР Іван Фёдаравіч, загадчык кафедры беларускай літаратуры Установы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны", доктар філалагічных навук, прафесар.

Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:

Кафедрай беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта (пратакол № 9 ад 22.03.2011 г.);

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 21.04.2011).

Навукова-метадычным саветам па філалагічных спецыяльнасцях Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі (пратакол № 5 ад 28.04.2011).

Адказны за выпуск: Т. І. Шамякіна

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая праграма "Гісторыя беларускай літаратуры XX — пачатку XXI ст." адрасавана студэнтам філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі і заклікана адыграць пазітыўную ролю ў падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў, у прапагандзе дасягненняў і набыткаў нацыянальнага мастацтва слова.

Праграма арыентуе на канцэптуальнае навуковае разуменне гісторыі беларускай літаратуры, яе ідэйна-эстэтычнага руху, нацыянальнай спецыфікі, мастацкіх формаў адлюстравання і светапазнання, жанрава-стылёвых тэндэнцый развіцця, глыбокае спасціжэнне гуманістычнай філасофіі і засваенне духоўных каштоўнасцей, якія закладзены ў творах класічнай спадчыны і сучасных майстроў слова. Галоўная мэта вучэбнага курса: раскрыць разнастайнасць і асаблівасці гісторыка-літаратурнага працэсу ў XX стагоддзі.

Падрыхтаваная праграма мае сістэмны характар у прэзентацыі літаратурнага матэрыялу і ахапіла зместам не толькі XX стагоддзе (з улікам напрацаваных мастацкіх традыцый), але і пачатак XXI стагоддзя; яна разглядае адначасова і вынікі папярэдняга этапу, і складаныя працэсы пераходу ў новую эпоху, прамежкавы стан літаратуры і культуры.

Праграма створана ў рэчышчы новай культурнай мадэлі і распрацавана ў плане жыццесцвярджальнай парадыгмы, а не песімізму і крытычнага стаўлення да ўласнай гісторыі, як гэта мела месца раней, у 90-я гады. Яе асноўны пафас — падвядзенне літаратурных вынікаў XX стагоддзя, паказ разнастайнасці "літаратурнага ландшафту" Беларусі, мастацкага і культурнага багацця, назапашанага класікамі і сучаснымі майстрамі слова. З гэтае прычыны ў распрацоўках тэм прэваліруе ў цэлым пазітыў, увага скіравана на дасягненні і поспехі беларускай літаратуры, у тым ліку ў савецкі час. Патрыятычныя пачуцці, высокія маральна-этычныя прынцыпы і эстэтычны густ, як паказвае практыка выкладання ва ўстановах вышэйшай адукацыі, выхоўваюцца ў арыентацыі на станоўчыя прыклады. Праграма перш за ўсё скіравана на духоўнатворчы і культуратворчы працэс ўдасканалення асобы, выхаванне ў маладога пакалення маральнасці, патрыятызму і гуманізму, а таксама на развіццё творчага мыслення студэнтаў, актывізацыю іх навукова-даследчага пошуку.

Новую праграму характарызуе перш за ўсё гісторыясофскі падыход, які ўлічвае дыялектычныя супярэчнасці ў развіцці грамадства.

Асноўныя напрамкі ў распрацоўцы аглядавых і манаграфічных тэм наступныя:

1) XX стагоддзе асэнсоўваецца як асобная гісторыка-культурная эпоха, якая мае сваю нацыянальную адметнасць у літаратуры Беларусі;

2) асноўная ўвага беларускай літаратуры XX — пачатку XXI стагоддзя скіравана на жыццё і праблемы соцыуму;

3) раскрываецца веліч класікі і значэнне эстэтычных традыцый, іх узаемадзеянне з авангарднымі тэндэнцыямі на працягу ўсяго перыяду;

4) гісторыя літаратуры разглядаецца як гісторыя мастацкіх кірункаў і плыняў, жанраў і стыляў;

5) паслядоўна праводзіцца лінія “аўтар — літаратурны працэс”;

6) увага акцэнтуецца на біяграфіі пісьменніка, раскрыцці яго творчай індывідуальнасці, шматгранным выяўленні, пазначаны пафас і асноўныя тэндэнцыі творчасці;

7) значна пашыраецца інтэртэкст, культурны кантэкст; беларуская літаратура паўстае ў сваіх вертыкальных (у глыбіню архаікі, у міфалогію) і гарызантальных (узаемадачыненні з іншымі літаратурамі) сувязях;

8) прэзентуецца ідэя экацэнтрызму як асноватворная ў разуменні ўзаемаадносінаў чалавека і прыроды;

9) асэнсоўваецца канцэпцыя асобы як адна з цэнтральных у беларускай мастацкай літаратуры;

10) выяўляюцца асаблівасці нацыянальнага вобраза свету, беларускай ментальнасці, народнага характару;

11) прасочваецца сувязь фальклору і прыгожага пісьменства;

12) вызначаюцца нацыянальныя архетыпы, сэнсаўтваральныя паняцці і дамінанты, феномены мастацкай свядомасці;

13) вылучаюцца як прыярытэтныя агульначалавечыя духоўныя і маральныя каштоўнасці;

14) закранаюцца гендэрныя праблемы;

15) пры распрацоўцы кожнай з тэм нязменна ў цэнтры ўвагі знаходзяцца пытанні паэтыкі.

У праграме прадстаўлены асучаснены погляд на літаратурную класіку — з улікам дасягненняў беларускага літаратуразнаўства. Па-новаму расстаўлены акцэнты ў раздзелах, прысвечаных творчасці пісьменнікаў савецкага часу. Фіксуюцца мастацкія пошукі маладых пісьменнікаў Беларусі. Уведзены новыя манаграфічныя тэмы — пашырана кола аўтараў, якія атрымалі заслужанае прызнанне ў беларускіх чытачоў. Разам з тым праграма не прэтэндуе на ўсёабдымнасць і вычарпальнасць, хоць яе аўтары імкнуліся да універсальнасці, шырыні ахопу літаратурнага матэрыялу. Можна, бясспрэчна, прысвяціць манаграфічныя тэмы іншым аўтарам, разгарнуць тэзісы і пэўныя аспекты праграмы, што, на наш погляд, здолеюць з поспехам зрабіць выкладчыкі, плануючы тэматыку самастойнай работы студэнтаў у адпаведнасці з рабочымі праграмамі кафедры і метадычнай сістэмай у вучэбнай дзейнасці кафедры.

Аглядавыя тэмы даюць цэласнае ўяўленне пра гісторыка-храналагічнае развіццё беларускай літаратуры XX — пачатку XXI стагоддзя. Манаграфічныя тэмы, дзе шматбакова разглядаецца творчасць класікаў і вядомых пісьменнікаў, прымыкаюць да аглядавых і ўтвараюць адзіны сэнсава-змястоўны кантэкст, пашыраюць і ўзбагачаюць разуменне ідэйна-эстэтычнага руху нацыянальнага мастацтва слова ў аспекце “творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс”.

Упершыню надзвычай поўна пададзены спіс мастацкіх тэкстаў для чытання і навуковая літаратура па курсу (асноўная і дадатковая), якая

рэкамендуецца для самападрыхтоўкі, выкарыстання пры напісанні курсавых і дыпломных работ.

**Мэта** дысцыпліны "Беларуская літаратура ХХ — пачатку ХХІ ст." — даць студэнтам цэласнае ўяўленне пра гісторыка-храналагічнае развіццё беларускай літаратуры ў дадзены перыяд; зарыентаваць на канцэптуальнае навуковае разуменне гісторыі беларускай літаратуры, яе ідэйна-эстэтычнага руху, нацыянальнай спецыфікі, мастацкіх формаў адлюстравання і светапазнання, жанрава-стылёвых тэндэнцый развіцця; раскрыць разнастайнасць і асаблівасці гісторыка-літаратурнага працэсу ў ХХ — пачатку ХХІ ст.

**Задачы** дысцыпліны "Беларуская літаратура ХХ — пачатку ХХІ ст.":
- раскрыць значэнне беларускай літаратуры ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў;
- паказаць веліч і значэнне беларускай класікі;
- вызначыць узаемадзеянне традыцый і наватарства ў развіцці беларускай літаратуры ХХ – пачатку ХХІ ст.;
- даць характарыстыку найбольш важным напрамкам, плыням, індывідуальным стылям, пэўным фактам у беларускай літаратуры ХХ – пачатку ХХ ст.

У выніку вывучэння дысцыпліны "Беларуская літаратура ХХ — пачатку ХХІ ст." студэнты павінны
***ведаць:***
- літаратурны працэс у сувязі з гісторыяй грамадства;
- спасціжэнне гісторыі літаратуры, яе ідэйна-эстэтычнага развіцця;
- творчасць буйных беларускіх пісьменнікаў;
- нацыянальную спецыфіку беларускай літаратуры;

***умець:***
- характарызаваць ХХ – пачатак ХХІ ст. як асаблівы перыяд у літаратуры;
- характарызаваць літаратурны напрамак, плынь, жанр;
- аналізаваць творчасць пісьменніка, заканамернасці літаратурнага развіцця.

## ФОРМЫ І МЕТАДЫ НАВУЧАННЯ

У працэсе выкладання дысцыпліны "Беларуская літаратура ХХ — пачатку ХХІ ст." выкарыстоўваюцца наступныя формы і метады:
1. Вуснае выкладанне інфармацыі выкладчыкам і актыўная пазнавальная дзейнасць студэнтаў (лекцыя, расказ, тлумачэнне, ілюстрацыя, дэманстрацыя).
2. Замацаванне вывучаемага матэрыялу.
3. Самастойная праца студэнтаў па асэнсаванні і замацаванні вывучаемага

матэрыялу (праца з арыгінальнымі мастацкімі і крытычнымі тэкстамі, навуковымі працамі, энцыклапедыямі; вядзенне чытальніцкага дзённіка; выкананне дамашніх заданняў).

4. Вучэбная праца па выкарыстанні ведаў на практыцы і выпрацоўцы ўменняў і навыкаў (тэставыя заданні; праца з тэкстамі; напісанне водзываў, анатацый, рэцэнзій; напісанне рэфератаў).

Праверка і ацэнка ведаў, уменняў і навыкаў (індывідуальнае, франтальнае апытванне, кантрольныя работы, індывідуальныя тэставыя заданні).

На вывучэнне дысцыпліны "Беларуская літаратура XX — пачатку XXI ст." для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія" адведзена максімальна 494 гадзіны, у тым ліку 204 аўдыторныя гадзіны: з іх лекцыі – 150, практычныя заняткі – 54.

Размеркаванне тэм ажыццяўляецца паводле тыпавой праграмы з улікам спецыфікі адпаведнай профільнай падрыхтоўкі і вучэбна-метадычнай працы ў канкрэтнай навучальнай установе.

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы заняткаў | Назва раздзела, тэмы заняткаў | Колькасць аўдыторных гадзін | | Усяго |
|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | |
| | **Уводзіны.** | 4 | | **4** |
| **1.** | **Беларуская літаратура перыяду нацыянальнага адраджэння (1900–1930).** | 4 | | **4** |
| 1.1. | Янка Купала | 8 | 4 | **12** |
| 1.2. | Якуб Колас | 8 | 4 | **12** |
| 1.3. | Максім Багдановіч | 4 | 2 | **6** |
| 1.4. | Цётка | 2 | | **2** |
| 1.5. | Ядвігін Ш. | 2 | | **2** |
| 1.6. | Змітрок Бядуля | 2 | 2 | **4** |
| 1.7. | Максім Гарэцкі | 4 | 2 | **6** |
| 1.8. | Цішка Гартны | 2 | | **2** |
| 1.9. | Алесь Гарун | 2 | | **2** |
| 1.10. | Вацлаў Ластоўскі | 2 | | **2** |
| **2.** | **Беларуская літаратура 30-х – першай паловы 50-х гадоў.** | 4 | | **4** |
| 2.1. | Кузьма Чорны | 6 | 4 | **10** |
| 2.2. | Кандрат Крапіва | 4 | 2 | **6** |
| 2.3. | Міхась Лынькоў | 2 | | **2** |
| 2.4. | Уладзімір Дубоўка | 2 | 2 | **4** |
| 2.5. | Міхась Зарэцкі | 4 | 2 | **6** |
| 2.6. | Язэп Пушча | 2 | | **2** |
| 2.7. | Андрэй Мрый | 2 | | **2** |
| 2.8. | Уладзімір Жылка | 2 | | **2** |
| 2.9. | Лукаш Калюга | 2 | | **2** |
| 2.10. | Янка Маўр | 2 | | **2** |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **3.** | **Беларуская літаратура другой паловы 50-х – 60-х гадоў.** | 2 | | **2** |
| 3.1. | Максім Танк | 4 | 2 | **6** |
| 3.2. | Пятрусь Броўка | 2 | | **2** |
| 3.3. | Аркадзь Куляшоў | 2 | 2 | **4** |
| 3.4. | Янка Брыль | 4 | 2 | **6** |
| 3.5. | Пімен Панчанка | 2 | 2 | **4** |
| 3.6. | Іван Мележ | 4 | 2 | **6** |
| 3.7. | Андрэй Макаёнак | 2 | 2 | **4** |
| 3.8. | Міхась Стральцоў | 2 | | **2** |
| **4.** | **Беларуская літаратура 70-х – першай паловы 80-х гадоў.** | 2 | | **2** |
| 4.1. | Васіль Быкаў | 4 | 4 | **8** |
| 4.2. | Іван Навуменка | 4 | | **4** |
| 4.3. | Алесь Адамовіч | 2 | | **2** |
| 4.4. | Уладзімір Караткевіч | 6 | 4 | **10** |
| 4.5. | Ніл Гілевіч | 2 | | **2** |
| 4.6. | Анатоль Вярцінскі | 2 | | **2** |
| 4.7. | Іван Пташнікаў | 2 | | **2** |
| 4.8. | Вячаслаў Адамчык | 2 | | **2** |
| **5.** | **Сучасная літаратура Беларусі (з сярэдзіны 80-х гадоў).** | 4 | | **4** |
| 5.1. | Іван Шамякін | 4 | 6 | **10** |
| 5.2. | Іван Чыгрынаў | 2 | 2 | **4** |
| 5.3. | Рыгор Барадулін | 2 | | **2** |
| 5.4. | Янка Сіпакоў | 2 | | **2** |
| 5.5. | Віктар Казько | 2 | | **2** |
| 5.6. | Раіса Баравікова | 2 | | **2** |
| 5.7. | Алесь Разанаў | 2 | 1 | **3** |
| 5.8. | Яўгенія Янішчыц | 2 | 1 | **3** |
| 5.9. | Аляксей Дудараў | 2 | | **2** |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | **Усяго:** | **150** | **54** | **204** |

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## УВОДЗІНЫ

ХХ стагоддзе як гістарычная эпоха. Гістарычны дэтэрмінізм у развіцці літаратуры ХХ-ХХІ стст. Асноўныя сацыяльна-палітычныя і эканамічныя працэсы ХХ ст.: развіццё тэхнасферы; гістарычная “праверка” ідэі сацыялізму ў СССР; глабалізацыя; сусветны тэрарызм; інфармацыйная вайна. Трагічныя абставіны, у якіх развівалася мастацкая культура. Іншыя, чым у ХІХ ст., светапоглядныя ўяўленні пра рэчаіснасць, пра характар руху гісторыі.

ХХ стагоддзе як культурная эпоха. Агульны рух і асноўныя тэндэнцыі мастацкай літаратуры ХХ стагоддзя. Рух рэалізму і авангардызму. Час і творчая асоба. Савецкая гісторыя: знакавыя падзеі, вынікі і ўрокі. Гуманістычныя традыцыі савецкай культуры.

Мастацкая літаратура ў сучасным свеце. Літаратура ў сістэме адукацыі. Лёс мастацкай літаратуры ў пачатку ІІІ тысячагоддзя: пошук новай культурнай парадыгмы ў канцы ХХ — пачатку ХХІ ст.

Анталагічныя асновы беларускай літаратуры.

Перыядызацыя беларускай літаратуры ХХ-ХХІ стст. Нацыянальныя асаблівасці беларускай літаратуры. Веліч нацыянальнай класікі. Жанравастылёвае багацце беларускай літаратуры ХХ-ХХІ стст., міжродавыя формы і дыфузія жанраў.

Літаратура і літаратурная тэорыя ў ХХ-ХХІ стст. Знакамітыя беларускія літаратуразнаўцы і крытыкі.

Чалавек і розныя формы соцыуму — цэнтральная праблема мастацкай культуры ХХ ст.

Страта надзеі — пасля крушэння сацыялізму — на новыя формы быцця. Інтэлектуальны хаос эпохі постмадэрнізму, адыход ад рацыянальнасці мыслення. Рэфлексіі ў сувязі з адчуваннем катастрафічнасці гісторыі.

Герой беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай традыцыі.

Феномен творчай асобы. Праблема таленту, фантазіі, інтэлектуальнасці.

Філалагічны аналіз літаратурнага тэксту.

Уплыў іншых відаў мастацтва і СМІ на літаратуру ХХ ст. Маніпуляцыйныя магчымасці СМІ ў працэсе змен ментальнасці сучаснай цывілізацыі.

Паскарэнне развіцця мастацкага працэсу — і сусветнага, і ўласнабеларускага. Нарастанне інтэнсіўнасці ўзаемадзеяння нацыянальных культур.

## *РАЗДЗЕЛ 1.* БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРЫЯДУ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ (1900—1930)

Беларуская літаратура і нацыянальна-вызваленчы рух на мяжы стагоддзяў — ХІХ і ХХ: нацыянальныя традыцыі і мастацкае наватарства.

Дынамічны малюнак лёсавызначальных момантаў развіцця беларускай літаратуры Новай і Навейшай гісторыі — ад ідэі мясцовага, рэгіянальнага патрыятызму да ідэі нацыянальнага духоўна-культурнага адраджэння.

Літаратурацэнтрызм беларускага вызваленчага руху і роля творчай інтэлігенцыі ў абуджэнні нацыянальнай і чалавечай годнасці беларусаў. Багацце творчых індывідуальнасцей, шматстайнасць ідэйнага і эстэтычнага пошуку. Асноўныя філасофска-мастацкія ідэі, архетыпы і вобразы, міфалагемы і лейтматывы беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя. Жанрава-стылёвы абсяг мастацкай літаратуры.

**а) Літаратура пачатку XX стагоддзя.**

Масавая папулярнасць ідэй сацыялізму, сацыял-дэмакратычных партый (эсэры, Польская партыя сацыялістаў, Бунд, РСДРП, Беларуская сацыялістычная грамада) і грамадскіх рухаў. Рэвалюцыя 1905 г. і яе ўплыў на літаратуру.

Асветніцка-выдавецкая і грамадска-палітычная дзейнасць дзеячаў нацыянальнага Адраджэння. Значэнне штотыднёвіка "Наша доля" (1906).

Роля газеты "Наша ніва" (1906—1915) у абуджэнні нацыянальнай самасвядомасці народа, у абгрунтаванні адраджэнскай ідэалогіі, у збіранні маладых літаратурных талентаў, у стварэнні кола нацыянальнай інтэлігенцыі. Літаратурныя дыскусіі на старонках газеты.

Эстэтычная шматграннасць беларускай літаратуры гэтага перыяду. Мадэрнісцкія тэндэнцыі. Дынаміка мастацкіх плыняў: рамантызм, рэалізм, сімвалізм, імпрэсіянізм і інш.

**б) Літаратура 20-х гадоў.**

Уплыў Першай сусветнай вайны, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 года на сацыяльна-палітычную і культурную сітуацыю ў Беларусі. Складанасць і супярэчлівасць гісторыка-палітычнай сітуацыі і цяжкасці драматычнага станаўлення нацыянальнай культуры і літаратуры. Жыццё, лёс і творчасць беларускіх пісьменнікаў у гэты перыяд.

Літаратурныя арганізацыі. Беларускамоўная прэса.

*Паэзія 20-х гадоў.* Публіцыстычны пафас лірыкі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Вацлава Ластоўскага, Цішкі Гартнага, Міхася Чарота (ранні перыяд), Уладзіміра Дубоўкі, Язэпа Пушчы, Уладзіміра Жылкі, Паўлюка Труса, Уладзіміра Хадыкі, Тодара Кляшторнага, Валерыя Маракова, Алеся Дудара, Анатоля Вольнага, Андрэя Александровіча і інш. Прыход у літаратуру маладой генерацыі (Сяргей Дарожны, Пятро Глебка, Максім Лужанін, Аркадзь Куляшоў, Пятрусь Броўка, Юрка Лявонны, Змітрок Астапенка, Аркадзь Моркаўка, Алесь Звонак, Сяргей Астрэйка, Віктар Казлоўскі, Янка Бобрык, Міхась Багун, Янка Туміловіч, Паўлюк Шукайла, Сяргей Фамін, Зінаіда Бандарына, Наталля Вішнеўская, Яўгенія Пфляўмбаўм). Паэтычнае асэнсаванне рэвалюцыйнай эпохі і падвядзенне "рахункаў з мінулым". Ідэйна-мастацкая і жанрава-стылёвая разнастайнасць лірыкі 20-х гадоў. Авангардысцкія тэндэнцыі і "рэвалюцыя ў паэзіі" "Маладняка" і "Узвышша". Уплыў мадэрнісцкіх плыняў і рэформа верша.

*Проза 20-х гадоў.* Жанрава-стылёвае станаўленне і развіццё беларускай прозы 20-х гг. Творчы росквіт апавядання як жанру. Матывы развітання з мінулым у апавяданнях Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Цішкі Гартнага, Максіма Гарэцкага. Пафас мастацкага абнаўлення жанравай формы апавядання ў творчасці Кузьмы Чорнага, Міхася Зарэцкага, Кандрата Крапівы, Міхася Лынькова, Рыгора Мурашкі, Васіля Каваля, Платона Галавача, Яна Скрыгана, Янкі Нёманскага. "Маладнякоўскае апавяданне" як феномен беларускай прозы 20-х гг. (героіка, рамантычныя эфекты, вобразна-метафарычная квяцістасць, прыгодніцкі сюжэт). Лірычнае і псіхалагічнае, засваенне новай тэматыкі. Стылістыка, вобразнасць у апавяданнях другой паловы дзесяцігоддзя. Сатыра ў апавяданнях Якуба Коласа, Кандрата Крапівы, Кузьмы Чорнага, Платона Галавача, Міколы Нікановіча. Паэтычная проза Міхася Лынькова, Васіля Каваля, Сымона Баранавых, Барыса Мікуліча, Рыгора Мурашкі, Янкі Нёманскага, Хведара Шынклера.

Жанравае станаўленне беларускай аповесці і рамана. Аўтабіяграфізм, дакументалізм, псіхалагізм, філасафізм як прыкметы буйных твораў Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Максіма Гарэцкага, Цішкі Гартнага, Кузьмы Чорнага, Міхася Зарэцкага, Янкі Нёманскага, Рыгора Мурашкі. "Маладнякоўская аповесць" Міхася Чарота, Анатоля Вольнага, Андрэя Александровіча, Алеся Дудара, Міколы Нікановіча, Янкі Нёманскага. Ідэйна-мастацкая эвалюцыя і жанрава-стылёвыя асаблівасці аповесцей і раманаў маладых празаікаў (Сымон Баранавых, Васіль Каваль, Лукаш Калюга, Ян Скрыган, Сямён Хурсік, Хведар Шынклер), пераадоленне хвароб творчага росту (рэпартажнасць, фактаграфізм, бытапісальніцтва, сюжэтная аморфнасць), пашырэнне тэматычных абсягаў, прыкметы літаратуры сацыялістычнага рэалізму.

*Драматургія 20-х гадоў* і станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. Агляд творчасці Я. Купалы, Ф. Аляхновіча, У. Галубка, М. Гарэцкага, Е. Міровіча, М. Грамыкі, Я. Дылы, М. Чарота, Л. Родзевіча, В. Шашалевіча, В. Гарбацэвіча, В. Сташэўскага, Р. Кобеца, Я. Раманоўскага.

*Літаратура для дзяцей* (Я. Купала, Я. Колас, З. Бядуля, Я. Маўр, А. Якімовіч).

## 1.1. ЯНКА КУПАЛА
(1882—1942)

Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч) — народны паэт Беларусі (1925), класік беларускай літаратуры. Біяграфія. Радавод Купалы. Вершы на польскай мове. Творы Ф. Багушэвіча і В. Дуніна-Марцінкевіча ў станаўленні Я. Купалы як беларускага паэта. Ранні вершы 1904—1907 гг. Ідэі, вобразы і асаблівасці лірыкі Я. Купалы пачатку XX ст.

Мастацкая эвалюцыя ў зборніках "Жалейка" (1908), "Гусляр" (1910), "Шляхам жыцця" (1913. Архетыпы і вобразы-сімвалы. Асноўныя матывы, танальнасці, іх трансфармацыя. Санаты, сімфоніі, трэны (плачы), гімны ў купалаўскай творчасці.

Я. Купала як прарок нацыянальнага Адраджэння. Паэтызацыя і адкрыццё праз вобраз мужыка беларускага народа, Грамадзянскі пафас. Канцэпт Бацькаўшчыны як адзін з галоўных у творчасці.

Філасофская і пейзажная лірыка. Міфалагічныя вобразы, сюжэты і матывы.

Інтымная лірыка Я. Купалы. Непаўторнасць, таямніца, сіла і глыбіня пачуцця, прыгажосць яго выяўлення. Меладычнасць вершаў, іх народна-песенная аснова.

Рамантычнае светаадчуванне і характар асобы ў лірыцы Я. Купалы. Драматызм пачуццяў, вольналюбівыя матывы і гераічны пафас купалаўскай лірыкі. Рамантычнае, сімвалічнае і рэалістычнае ў паэзіі Я. Купалы. Традыцыі фальклору Літаратурныя традыцыі ў ёй. Адметнасць лірычнага таленту паэта-неарамантыка.

Асаблівасці паэтыкі Я. Купалы, павышаная экспрэсіўнасць, надзвычайная музычнасць, метафарызацыя, увага да выключнага, прыхільнасць да паэтычнай умоўнасці, маштабных вобразаў. Рытміка-інтанацыйнае багацце верша.

Ранніх паэмы Я. Купалы: "Зімою", "Нікому", "Калека", "Адплата кахання", "У Піліпаўку", "За што?" (1906—1908). Ідэі. Жыццёвыя вытокі. Сацыяльны, рэалістычны, апавядальна-побытавы характар і рамантычныя прыкметы ў абмалёўцы герояў і абставінаў.

Рамантычныя паэмы 1910—1913 гг. Духоўная веліч героя, услаўленне непадкупнасці, свабоды мастака, чалавечай годнасці, фальклорны каларыт і непаўторнасць выяўленчых сродкаў у паэмах "Курган" (1910) і "Бандароўна" (1913). Роздум над сутнасцю беларускага нацыянальнага быцця, адметнасць асэнсавання і мастацкага ўвасаблення ніцшэанскай ідэі пра звышчалавека, трагедыя выключнай асобы, яе канфлікт з грамадствам і духоўнае падзенне, дэманічнае і гераічнае ў персанажах паэмы "Магіла льва" (1913). Услаўленне кахання, жанчыны і працы, гармонія і прыгажосць жыцця ў паэме-ідыліі "Яна і я" (1913), яе мастацкія асаблівасці. Твор у сусветным і нацыянальным літаратурным кантэксце ("Песня песняў" Саламона, "Буколікі", "Георгікі" Вергілія, "Дафніс і Хлоя" Лонга, "Герман і Даратэя" Ё.-В. Гётэ, першы раздзел "Леснікова пасада" з паэмы "Новая зямля" Якуба Коласа).

Гістарызм паэм "Курган", "На Куццю" (1911), "Гарыслава" (1912), "На Дзяды" (1912), "Бандароўна", "Магіла льва". Рамантычная ідэалізацыя мінуўшчыны ў іх і пошукі адказаў на балючыя пытанні сучаснасці. Асэнсаванне гісторыі праз народную песню і легенду. Героіка-рамантычны і фальклорна-рамантычны характар паэм Я. Купалы, іх праблематыка, кампазіцыйная будова, мастацкая дасканаласць, вобразы і паэтыка.

Драматычныя паэмы. Праблематыка "Адвечнай песні" (1908). Міфалагічна-фалькорная сімволіка ў паэме. Твор у літаратурным кантэксце (п'есы "Жыццё чалавека" Л. Андрэева, "Адвечная казка" С. Пшыбышэўскага, інш.). Мастацкая адметнасць "Адвечнай песні". Кампазіцыя і вобразна-выяўленчыя сродкі. "Адвечная песня" як містэрыя.

Мастацкія асаблівасці драматычнай паэмы "Сон на кургане" (1910). Міфалагічныя вобразы — увасабленне таямнічых, невядомых, злых і варожых чалавеку сіл, што ўплываюць на яго лёс.

Літаратурныя традыцыі і эстэтычныя вытокі драматургіі Я. Купалы. Камедыя "Паўлінка" (1912). Прататыпы дзейных асоб. Праблематыка і вобразы. Сатырычны аспект. Камедыйнае і драматычнае ў п'есе. Мастацкая змястоўнасць характараў. Нацыянальны каларыт, дух твора. Майстэрства Я. Купалы-камедыёграфа ў арганізацыі інтрыгі, разгортванні сцэнічнага дзеяння, стварэнні камічных сітуацый, індывідуалізацыі мовы персанажаў, увядзенні вакальных і харэаграфічных элементаў, звароце да гумару, іроніі, сатыры, шаржу, гратэску, буфанады. Гісторыя сцэнічнага ўвасаблення п'есы.

Драма "Раскіданае гняздо" (1913). Аўтабіяграфічная аснова, сацыяльна-філасофскі і сімвалічны характар. Сінтэз у творы мастацкіх набыткаў Я. Купалы. Нацыянальная адметнасць вобраза раскіданага гнязда як сімвала "раскіданай Беларусі" (М. Гарэцкі) і ўніверсальнасць гэтага вобраза. "Раскіданае гняздо" як драма ідэй. Унутраная змястоўнасць персанажаў, іх сімвалізм, духоўныя пошукі кожнага з сям'і Зяблікаў. Моцная сувязь з зямлёй і пошукі праўды Лявонам, яго мастацкая адметнасць як вобраза-тыпу, блізкасць з такімі вобразамі-тыпамі, як Міхал у паэме "Новая зямля" Я. Коласа, Міхал Тварыцкі ў рамане "Трэцяе пакаленне" К. Чорнага, Васіль Дзяцел у "Палескай хроніцы" І. Мележа, Пятрок Багацька ў аповесці "Знак бяды" В. Быкава.

Публіцыстыка пераломнага часу (1918-1922). Пераклады (з А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, М. Канапніцкай, Т. Шаўчэнкі, М. Някрасава і інш.), іх значэнне для разумення асобы паэта. Структура, праблематыка і мастацкія асаблівасці зборніка паэзіі "Спадчына" (1922).

Асэнсаванне Я. Купалам хрысціянскай культуры (трансфармацыя вобраза Лазара Беднага ў рамантычных героях Гусляра, Дудара, Лірніка і Прарока; эсхаталагічныя матывы і інш.). Я. Купала як паэт-прарок, нацыянальны Месія. Маштабнасць яго мыслення, роздум над глабальнымі праблемамі быцця.

Трагікамедыя "Тутэйшыя" (1922). Праблематыка і жанравая адметнасць. "Тутэйшасць" як вынік трагічнага гістарычнага лёсу Беларусі. Выкрыццё нацыянальнага нігілізму і рэнегацтва, польскага і рускага

шавінізму. Сутнасць прыстасавальніцтва Мікіты Зноска. Янка Здольнік як выразнік патрыятычнага ідэалу Я. Купалы. Адметнасць вобразаў Ганулі Зношчыхі, Лявона Гарошкі, Усходняга вучонага, Заходняга вучонага і інш. Трагізм купалаўскага смеху, выяўленага праз іронію, сарказм, шарж і гратэск. Майстэрства драматурга ў раскрыцці характараў. Гісторыя сцэнічнага ўвасаблення твора.

Вершы 20-х гг.: радасць і трывога. Паэма "Безназоўнае" (1924). Сімволіка і паэтыка паэмы. Увасабленне вобраза Беларусі ў творы.

Даніна часу ў творах паэта 30-х гг. Паэма-рэпартаж "Над ракой Арэсай" (1933). "Ляўкоўскі цыкл". Святочна-каляндарныя, рамантычна-ідэалізаваныя вершы. Грамадзянскае, асабістае ў гэтых творах, іх народная песеннасць.

Я. Купала як пясняр інтэрнацыянальных пачуццяў, дружбы народаў і як аўтар вершаў для дзяцей. Мастацкі пераклад. Нізка вершаў "На заходнебеларускія матывы". Паэма "Тарасова доля" (1939).

Творчасць Я.Купалы перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Вершы ("Беларускім партызанам", "Зноў будзем шчасце мець і волю...") і публіцыстыка ("Кліч да беларускага народа").

Уплыў Я. Купалы на беларускую літаратуру. Яго месца ў сусветным літаратурным кантэксце.

Шматграннасць і маштабнасць таленту Я. Купалы, яго наватарства як выдатнага майстра слова. Народнасць яго твораў. Стыль паэта.

Бібліяграфія асноўных выданняў Я. Купалы на беларускай мове. Пераклады яго твораў на іншыя мовы.

Набыткі і дасягненні купалазнаўства.

Я. Купала ў мастацтве і духоўным жыцці беларускага народа.

## 1.2. ЯКУБ КОЛАС
(1882—1956)

Веліч постаці Якуба Коласа (Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча), народнага паэта Беларусі (1926), класіка нацыянальнай літаратуры. Шматграннасць яго таленту. Нацыянальныя і сацыяльныя ўмовы ў фарміраванні яго творчай асобы. Біяграфія пісьменніка на фоне эпохі. Роля Я. Коласа ў грамадска-культурным і навукова-педагагічным жыцці.

Ранняя творчасць: грамадска-публіцыстычныя вершы, сатырычныя вершы. Міфапаэтычныя рысы ва ўспрыманні прыроды. Сістэма пейзажных вобразаў у паэзіі Я. Коласа як адлюстраванне нацыянальнага свету.

Эстэтычныя асаблівасці паэзіі: мастацкая прастата, гарманічнасць, багацце матываў, элегічная песеннасць, лірычная ўсхваляванасць, роздумнасць, эпічнасць, адухоўленасць, рэалістычная вобразнасць, класічныя вершаваныя формы, нюансавасць, малюнкавасць.

Проза. "Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле" (канец 90-х гг. XIX ст.) і празаічныя творы з "Другога чытання для дзяцей беларусаў" (1909) у творчай спадчыне пісьменніка. Эвалюцыя Я. Коласа ад фальклорных, этнаграфічна-побытавых замалёвак, маралізатарска-дыдактычнай імпрэсіі,

верша ў прозе да апавяданняў сацыяльна-бытавых, сацыяльна-аналітычных, да псіхалагічна заглыбленай, прытчавай і філасофскай прозы з яе шматграннасцю і класічнай завершанасцю (“Слабода”, “Думкі ў дарозе”, “Васіль Чурыла”, “Бунт”, “Нёманаў дар”, “Малады дубок”). Мастацкая змястоўнасць сатырычна-гумарыстычных апавяданняў (“Соцкі падвёў”, “Пісаравы імяніны”, “Недаступны”).

Філасофская праблематыка і алегарычнасць “Казак жыцця” (1906—1956). Міфалагічныя, фальклорныя і літаратурныя вытокі, раскрыццё душы народа і асобы аўтара. Іх адметнасць і арганічнасць у мастацкім самавыяўленні аўтара. Характарыстыка “Казак жыцця” як унікальнага жанру.

Паэма “Новая зямля” (1911—1923). Аўтабіяграфічнасць твора. Гісторыя яго напісання. Жанравыя асаблівасці і праблематыка. Ідэйны змест паэмы. Энцыклапедызм “Новай зямлі”. Выяўленне ў паэме духоўнага багацця народа, яго этычнага, эстэтычнага свету, яго філасофіі. Сувязь твора з мастацкім вопытам чалавецтва (Біблія, “Праца і дні” Гесіёда, “Песня пра зубра” М. Гусоўскага, “Чатыры пары года” К. Данелайціса, “Яўгеній Анегін” А. Пушкіна, “Пан Тадэвуш” А. Міцкевіча, творчасць К. Гамсуна, Р. Тагора, карэла-фінскі народны эпас “Калевала”). Глыбінная народнасць вобразаў Міхала, Антося, Ганны. Свет маленства. Яго хараство і непаўторнасць у “Новай зямлі”. Паэтызацыя сялянскага побыту, працы селяніна як сцвярджэнне народнай сілы, непераможнасці яго нацыянальнага духу. Роля пейзажу ў абмалёўцы чалавечых характараў, у паказе беларускага краю, у выяўленні патрыятычных пачуццяў аўтара, філасофскіх глыбінь твора. Прыёмы і сродкі мастацкай індывідуалізацыі вобразаў. Лірычныя адступленні і іх значэнне ў раскрыцці ідэйнага зместу паэмы, роздуму паэта пра лёс роднай зямлі і яе народа ў кантэксце гісторыі. Верш, рытміка, строфіка. Сюжэт і кампазіцыя. Адметнасць стылёва-выяўленчай сістэмы “Новай зямлі”, яе рэалістычны характар, выключная разнастайнасць і дасканаласць, сувязь з народнымі традыцыямі, фальклорам. Уменне аўтара паэтызаваць звычайнае, будзённае. Мова твора, яе шматслойнасць, багацце і хараство, роля ў станаўленні беларускай літаратурнай мовы, у развіцці стылёвай шматграннасці беларускай літаратуры. Рэалістычная дакладнасць паэмы. Яе гістарызм, поліфанічнасць, маштабнасць і народнасць твора. Наватарства “Новай зямлі” і яе значэнне ў беларускай літаратуры, у развіцці жанраў шматпланавай эпічнай паэмы і рамана.

Паэма “Сымон-музыка” (1911—1925). Творчая гісторыя першай, другой і трэцяй рэдакцый твора. Філасафічнасць і выяўленчыя сродкі. Жанр, ідэя, праблематыка. Гістарычны аспект у паэме. Народныя вытокі яе філасафічнасці. Аўтабіяграфічнасць у творы. Асэнсаванне ў паэме праблемы мастака і народа. Яе ўнікальнасць у еўрапейскім мастацтве як рамантычна-сімвалічнага лірычна-эпічнага твора. Шматграннасць і сэнсавая напоўненасць вобраза Сымона. Яго адметнасць у кантэксце вобразаў мастакоў айчыннай і сусветнай літаратуры (Арфей у антычнай, героі твораў “Янка-музыка” Г. Сянкевіча, “Сляпы музыка” У. Караленкі, “Музыка” М. Багдановіча, “Курган” і “Раскіданае гняздо” Я. Купалы, “Казка пра Музыку”

М. Танка і інш.). Сымон як пясняр, у якім “дух сусвету з духам лучыцца зямлі”. Адраджэнскае гучанне твора і сувязь яго з фальклорам. Вобраз народа (дзед Курыла, парабак Яхім, дзед Даніла). Каханне ў творы. Сімвалічнасць вобразаў Ганны і Сымона як ўвасабленне Беларусі і народнай інтэлігенцыі. Вобразы жабрака, карчмара, князя-магната. Лірычныя адступленні, філасафічнасць і патрыятычнае гучанне твора. Яго сімволіка (адметны лісток, адзінокі колас, чуллівы звон, блукаючы прамень, дубок і інш.), паэтыка, ідэя. Ацэнка паэмы крытыкай і літаратуразнаўствам.

Зборнік вершаў “Водгулле” (1922). Роздум над лёсам Беларусі ў вершах 1917—1921 гг.

Адлюстраванне Я. Коласам у апавяданнях 20-х гадоў падзей рэвалюцыі, грамадзянскай вайны і савецкай рэчаіснасц (“Сяргей Карага”, “Крывавы вір”, “У двары пана Тарбецкага”, “Адукацыя”, “Хатка над балотцам”).

Трылогія “На ростанях” (1921—1954). Творчая гісторыя, кампазіцыя, жанравыя асаблівасці. Аўтабіяграфічнасць і прататыпы герояў. Праблематыка твора. Андрэй Лабановіч як прадстаўнік перадавой часткі беларускай дэмакратычнай інтэлігенцыі, як асветнік і шукальнік сэнсу жыцця. Яго дачыненні з іншымі персанажамі. Эвалюцыя вобраза. Роздум героя над сутнасцю быцця, над прызначэннем інтэлігенцыі і гістарычным лёсам Беларусі, над неабходнасцю абуджэння і адраджэння свайго народа. Уплыў жыцця на фарміраванне светапогляду Лабановіча. Мастацкія сродкі ў абмалёўцы вобраза. Праблема народа і інтэлігенцыі ў трылогіі. Умовы жыцця беларускага сялянства на пачатку XX ст. Дэмакратычная інтэлігенцыя ў трылогіі — Садовіч, Тукала, Турсевіч. Сістэма жаночых вобразаў. Сюжэт і стыль трылогіі. Вобразна-выяўленчыя сродкі і мова. Псіхалагічнае майстэрства ў адлюстраванні персанажаў і жыццёвых сітуацый. Роля партрэта ў характарыстыцы вобраза. Гумар у трылогіі. Дасканаласць мастацкай дэталі. Пейзажныя апісанні. Лірычнае, публіцыстычнае і філасофскае ў трылогіі. Народнасць трылогіі, яе значэнне для станаўлення і развіцця беларускай прозы.

“Юнацкая” аповесць “На прасторах жыцця” (1925—1926): героі, стыль аповесці. Яе паэтычнасць і лірызм. Сюжэт і мова твора.

Матывы лірыкі Я. Коласа 30-х гадоў. Аповесць “Адшчапенец” (1930—1931).

Аповесць “Дрыгва” (1933). Гісторыя напісання і фактычная аснова твора. Змест і праблематыка. Вобразы дзеда Талаша і яго баявых паплечнікаў. Алегарычны сэнс некаторых малюнкаў. Сюжэт і кампазіцыя. Паэтычная стыхія моўна-выяўленчых сродкаў. Рамантызацыя ў творы і яе выдаткі. Традыцыі “Дрыгвы” ў творах беларускай літаратуры, прысвечаных тэме грамадзянскай і Айчыннай войнаў.

Драматургія Я. Коласа. П’есы “Вайна вайне” (1926—1938), “У пушчах Палесся” (1937). Іх праблематыка, героі. Сцэнічнае жыццё твораў Я. Коласа і нацыянальны тэатр.

Творчасць пісьменніка для дзяцей.

Творчасць Я. Коласа перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Публіцыстыка і паэзія. Пранікнёнасць патрыятычнага пачуцця ў вершах (“Голас зямлі”, “Чымган”). Выкрыццё фашызму.

Асаблівасці коласаўскай сатыры ваеннага часу.

Паэмы “Суд у лесе” (1943), “Адплата” (1945). Паэма “Рыбакова хата” (1939—1946).

Раскрыццё паэтычнага таленту Я. Коласа ў інтымнай і філасофскай лірыцы пасляваеннага часу.

Навуковая і грамадская дзейнасць. Падручнік “Методыка роднае мовы” (1926). Асветніцкія ідэі і погляды Я. Коласа. Публіцыстычная спадчына. Эпісталярый пісьменніка.

Я. Колас — перакладчык (“Палтава” А. Пушкіна, творы М. Лермантава, А. Міцкевіча, Т. Шаўчэнкі і інш.).

Я. Колас у кантэксце сусветнай літаратуры (А. Пушкін, М. Гогаль, М. Някрасаў, І. Бунін, А. Міцкевіч, У. Фолкнер, інш.).

Бібліяграфія асноўных выданняў Я. Коласа на беларускай мове. Крытычныя і літаратуразнаўчыя працы аб жыцці і творчасці пісьменніка.

Коласаўскія творы ў перакладах на іншыя мовы.

Вобраз Я. Коласа ў мастацтве. Яго творчая спадчына ў духоўным жыцці беларускага народа.

## 1.3. МАКСІМ БАГДАНОВІЧ
(1891—1917)

Феномен М. Багдановіча як творцы і дзеяча нацыянальнага Адраджэння. Біяграфія паэта. Асаблівасці сямейнага выхавання, далучэнне да сусветнай культуры і беларушчыны. Роля антычнай (Гарацый, Авідзій), рускай (А. Пушкін, Ф. Цютчаў, А. Фет, А. Блок, В. Брусаў), французскай (П. Верлен, Э. Верхарн, Ш. Бадлер) і іншых еўрапейскіх літаратур (А. Дантэ, Г. Гейнэ, А. Міцкевіч, Т. Шаўчэнка), фальклору і міфалогіі ў фарміраванні светапогляду М. Багдановіча.

Энцыклапедызм, артыстызм, паэтычная культура М. Багдановіча. Патрыятычны і гуманістычны змест яго творчасці. Наватарства паэта. Паглыбленне эстэтычных асноў, зварот да новых тэм і форм у беларускай літаратуры, яе жанрава-стылёвае ўзбагачэнне. Распрацоўка М. Багдановічам праблем класічнай мастацкай спадчыны.

Творчасць М. Багдановіча як арыгінальная і сінтэтычная мастацкая сістэма. Далучанасць да сусветнага культурна-гістарычнага вопыту. Імпрэсіянізм, сімвалізм і неакласіцызм у яго паэзіі. Арфічны пачатак у яго паэзіі. Паэтычныя санаты, гімны, сімфоніі. Вар’іраванне мелодый і матываў. Паэтыка колеру і гуку.

Мастацкая канцэпцыя кнігі паэзіі “Вянок” (1913). Задума, гісторыя выдання, структура. М. Багдановіч як “пясняр чыстай красы” (А. Луцкевіч) і адраджэнскае гучанне яго паэзіі. Шматграннасць таленту М. Багдановіча. Фальклорныя матывы, найбольш значныя топасы, міфалагемы і сімвалы. “Зачараванае царства” і прырода. Гістарызм мастацкага мыслення паэта

(нізкі "Старая Беларусь", "Старая спадчына"). Нізка "Места" як выток мастацкага урбанізму. Паэтызацыя горада. Філасафічнасць, роздум над лёсам чалавека, Бацькаўшчыны і вечнымі праблемамі быцця. Класічныя анталагічныя традыцыі і набыткі фальклору. Свет кахання, матывы жыцця і смерці (нізкі "Мадонны", "Каханне і смерць", інш.). Асаблівасці паэтыкі і майстэрства. Мастацкі свет нізак "Эрас", "Лясун"; вершаў "Прыйдзе вясна", "Дзед", "Народ, Беларускі Народ!", створаных у 1908—1913 гг. Рацыянальнае і эмацыянальнае ў эстэтычнай сістэме паэта ("Ліст да п. В. Ластоўскага").

М. Багдановіч як літаратуразнаўца і крытык. Асэнсаванне ім літаратурнага працэсу. Досвед рускай культурна-гістарычнай школы і эстэтычныя погляды М. Багдановіча. Артыкулы "Глыбы і слаі" (1911), "За тры гады" (1913), "Забыты шлях" (1915). Асэнсаванне мастацкіх набыткаў і праблем развіцця беларускай літаратуры, роздум пра яе народнасць, сусветную каштоўнасць, пра выяўленне ў ёй рэалізму, рамантызму, сімвалізму і іншых мастацкіх кірункаў.

М. Багдановіч і ўкраінская літаратура. Артыкулы "Краса і сіла" (1914), "Памяці Т. Р. Шаўчэнкі" (1914).

Проза М. Багдановіча. Праблематыка і мастацкія асаблівасці апавяданняў "Музыка" (1907), "Апокрыф" (1913), "Апавяданне аб іконніку і залатару..." (1914). Біблейскія архетыпы і матывы. Роздум аб прызначэнні і эстэтычнай сутнасці мастацтва. Публіцыстыка М. Багдановіча.

М. Багдановіч — перакладчык. Выпрацоўка прынцыпаў нацыянальнай перакладчыцкай школы.

Паэзія 1913—1916 гг. Ліра-эпас паэта (паэмы "Максім і Магдалена", "Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык", апакрыфічная легенда "Страцім-лебедзь"). Светлы сум, трагедыйнае і жыццесцвярджальнае гучанне яго паэзіі.

Лірыка апошняга перыяду, канца 1916 — пачатку 1917 гг. Ацэнка асобы і творчасці М. Багдановіча ў беларускім літаратуразнаўстве. Вобраз паэта ў беларускім мастацтве. Музычныя творы на словы паэта.

Бібліяграфія асноўных выданняў М. Багдановіча на беларускай мове.

Пераклады твораў М. Багдановіча на іншыя мовы.

Літаратурныя творы аб жыцці і творчасці паэта.

## 1.4. ЦЁТКА
(1876—1916)

Асоба Цёткі (Алаізы Пашкевіч) у кантэксце пачынальнікаў беларускай класічнай літаратуры.

Біяграфія. Творчая і грамадская дзейнасць. Традыцыі паэзіі Ф. Багушэвіча і наватарства лірыкі Цёткі. Зборнікі паэзіі "Скрыпка беларуская", "Хрэст на свабоду" (1906). Адраджэнскі і рэвалюцыйны пафас лірыкі, ахвярнасць у імя Бацькаўшчыны, вера ў лепшую будучыню роднага краю, паэтызацыя змагання, выкрыццё несправядлівасці грамадскага ладу, выкарыстанне рамантычнай сімволікі, алегорыі, маштабных вобразаў,

прамоўніцкіх інтанацый (“Вера беларуса”, “Суседзям у няволі”, “Хрэст на свабоду”, “Мора”, “Добрыя весці”). Верш-гімн і верш-заклік. Рытміка твораў, іх лексіка і стылістыка. Цётка як пранікнёны лірык і палымяны агітатар.

Матывы грамадзянскага суму, выкліканыя расстаннем з радзімай і хваробай (“На магіле”, “З чужыны”), і ўзнёслыя парыванні (“Арлы-брацці, дайце скрыдлы...”) у вершах Цёткі. Выяўленне ў яе творах літаратурна-творчай пазіцыі, эстэтычных прынцыпаў. Эвалюцыя, разнастайнасць, багацце, мастацкая дасканаласць і адраджэнскае гучанне яе лірыкі. Роздум у вершах аб прызначэнні мастацтва, погляды на ўзаемадачыненні творцы і грамадства. Сувязь паэзіі Цёткі з фальклорам. Пейзажная лірыка. Асаблівасці індывідуальнай паэтыкі Цёткі.

Праблематыка, вобразы, стылёвая адметнасць алегарычнага апавядання “Прысяга над крывавымі разорамі” (1906). Апавяданні для дзяцей (“Сварба”, “З прыску ды ў агонь”, “Сірата”) з “Першага чытання для дзетак беларусаў” (1906). Псіхалагізм, экспрэсіўнасць, драматызм і гуманістычны змест апавяданняў 1910—1914 гг. (“Зялёнка”, “Міхаська”, “Асеннія лісты”, “Лішняя”). Гумар, іронія ў апавяданнях “Навагодні ліст”, “Зваротлівы”. Прыкметы рамантызму і рэалізму, асваенне новых жанравых формаў апавядання, паглыбленне псіхалагізму.

Асветніцкая дзейнасць Цёткі. Кнігі для дзяцей “Беларускі лемантар, або Першая навука чытання”, “Першае чытанне для дзетак беларусаў”, “Гасцінец для малых дзяцей (усе — 1906). Выхаваўчы пафас і мастацкія асаблівасці твораў для дзяцей.

Публіцыстыка Цёткі. Патрыятычны змест, навукова-пазнавальная і мастацкая каштоўнасць яе артыкулаў.

## 1.5. ЯДВІГІН Ш.

(1869—1922)

Ядвігін Ш. (Антон Іванавіч Лявіцкі) як адзін з пачынальнікаў беларускай мастацкай прозы. Біяграфія. Роля пісьменніка ў літаратурным і грамадска-культурным жыцці.

Ідэйна-мастацкі змест зборнікаў прозы “Бярозка” (1912) і “Васількі” (1914). Алегарычныя апавяданні з іх пранікнёным лірызмам, лагодным гумарам, з’едлівай сатырай. Перапрацоўка народных анекдотаў і сюжэтаў. Апавяданні рэалістычна-побытавыя, сацыяльна-псіхалагічныя (“Гаротная”, “З бальнічнага жыцця”, “Зарабляюць”, “Жывы нябожчык”), лірычна-філасофскія (“Васількі”, “Раны”), прытчава-дыдактычныя (“Баба”, “Чалавек”). Майстэрства пісьменніка-навеліста, мова твораў.

“Золата” (1920) як адзін з першых буйных твораў беларускай прозы, спроба стварэння псіхалагічнага рамана з напружаным драматычным сюжэтам, прыгодніцка-дэтэктыўнымі элементамі, псіхалагічна змястоўнымі характарамі.

Паэма “Дзед Завала”, нарысы “Лісты з дарогі”, “Думкі з падарожы”, успаміны, артыкулы.

Асоба і творчасць пісьменніка ў ацэнках Я. Купалы, М. Багдановіча, М. Гарэцкага, інш.

## 1.6. ЗМІТРОК БЯДУЛЯ
(1886—1941)

Феномен творчай асобы Змітрака Бядулі (Самуіла Яфімавіча Плаўніка).

Біяграфія. Умовы фарміравання і асаблівасці таленту. Уплыў Бібліі, Талмуду, Кабалы, хасідызму, беларускага фальклору і міфалогіі на яго творчасць.

Лірычнае і рамантычнае ў паэзіі З. Бядулі нашаніўскага перыяду (“На горне душы”, “Пяюць начлежнікі”, “Мары паэта” і інш.). Сувязь з паэтыкай сімвалізму, імпрэсіянізму і акмеізму. Захапленне прыгажосцю жыцця, сацыяльная і гістарычная тэматыка. Антываенны цыкл вершаў (“Ад крыві чырвона”, “Юда жэніцца”, “Кат” і інш.).

Зборнік “Абразкі” (1913), яго месца ў гісторыі беларускай прозы. Рамантычны характар і матывы лірычных імпрэсій і мініяцюр З. Бядулі (“Плач пралескаў”, “Прытуліся ка мне”, “Кветка”). Выяўленне ў іх фальклорных, біблейскіх, кніжных традыцый, раскрыццё ідэальнага, прыгожага. Імпрэсіянізм і алегарызм абразкоў.

Асаблівасці творчых пошукаў 20-х гг.

Аповесць “Салавей” (1927). Тры рэдакцыі. Фальклорна-рамантычны характар у асэнсаванні падзей далёкай мінуўшчыны. Праблемы мастака і мастацтва. Сюжэт, кампазіцыя і мова твора.

“Язэп Крушынскі” (1928—1932) як сацыяльна-псіхалагічны раман пра складаныя працэсы грамадскага жыцця 1920-х гадоў у Беларусі. Праўдзівы паказ рэчаіснасці ў першай кнізе рамана. Стварэнне яскравага вобраза прадстаўніка заможнай часткі сялянства Язэпа Крушынскага. Праблематыка, сістэма вобразаў. Мастацкія асаблівасці твора.

З. Бядуля — дзіцячы пісьменнік. Паэма-казка “Мурашка-Палашка” (1940), паэма “Хлопчык з-пад Гродна” (1940), вершы для дзяцей.

Аповесць-казка “Сярэбраная табакерка” (1940), глыбіня яе філасофскага зместу. Праблематыка і алегарычнасць твора. Фальклорныя і міфалагічныя сродкі ў выяўленчым ладзе і стылі аповесці.

## 1.7. МАКСІМ ГАРЭЦКІ
(1893—1938)

Максім Гарэцкі як класік беларускай літаратуры. Значнасць і маштаб яго творчай асобы. Біяграфія.

Зборнік апавяданняў “Рунь” (1914). Патрыятычны, лірычна-аналітычны лад мыслення і высокая культура творчасці. Вобраз інтэлігента, выхадца з сялянскага асяроддзя, асветніка і філасафа. Скіраванасць пісьменніцкай думкі да “патаёмнага”, імкненне зразумець душу свайго народа. Пошукі героямі адказаў на пытанні быцця. Праблема інтэлігенцыі і народа. Асэнсаванне мінуўшчыны.

Гуманістычная скіраванасць у паказе чалавека на вайне і праблематыка апавяданняў 1915—1917 гг. Майстэрства псіхалагічнага аналізу, эстэтычная дасканаласць твораў.

Дакументальна-мастацкія запіскі "На імперыялістычнай вайне" (1915—1919). Гісторыя напісання і аўтабіяграфізм твора. Праўда пра вайну і людзей на вайне. Аналітызм і псіхалагізм, рэалізм і гуманістычны, антываенны пафас. Мастацкія асаблівасці, традыцыі і літаратурны кантэкст (Л. Талстой, А. Барбюс, Л. Франк, Э. М. Рэмарк, Э. Хемінгуэй і інш.). Уплыў аповесці на развіццё дакументальнага жанру ў беларускай літаратуры.

Аповесць "Дзве душы" (1919). Сістэма вобразаў, жанр і стыль твора. Праблема духоўнай раздвоенасці і вырашэнне ў аповесці такіх пытанняў, як бацькаўшчына і рэвалюцыя, адносіны рэвалюцыі да нацыянальных праблем, стаўленне нацыянальнай інтэлігенцыі да рэвалюцыі.

Характарыстыка апавяданняў 1921—1922 гг. пра падзеі рэвалюцыі і станаўленне беларускай дзяржаўнасці ("У 1920 годзе", "Фантазія", "Апостал", "Усебеларускі з'езд 1917-га года").

Гістарычная тэматыка ў апавяданнях 20-х гг. Пашырэнне тэматычных гарызонтаў беларускай літаратуры ў апавяданнях з кніг "Сібірскія абразкі" (1926—1928), "Люстрадзён" (1929—1930). Гісторыя напісання, праблематыка, выяўленчыя сродкі. Месца твораў у гісторыі беларускай літаратуры.

Непаўторнасць і шматграннасць таленту М. Гарэцкага-драматурга. Жанравая адметнасць яго п'ес. Драма "Антон" (1914). Шматпланавасць і філасафічнасць твора, яго жанравыя асаблівасці. Характар беларуса, яго "дваістасць". Канцэптуальнасць сцэны ў "Славянскай кафейні". "Драма чалавецкага духу" ў асэнсаванні М. Гарэцкага і адначасова жыццесцвярджальны і шматгранны фінал твора. Праблема інтэлігенцыі ў п'есах "Гапон і Любачка" (1914), "Мутэрка" (1920). Драматычны абразок "Жартаўлівы Пісарэвіч" (1922). Стварэнне яркага нацыянальнага тыпа пакутніка-беларуса. Паказ яго чалавечай годнасці і жыццялюбства.

Раскрыццё істотных граняў беларускага нацыянальнага жыцця ў аповесці "Меланхолія" (1916—1921). Аўтабіяграфізм і псіхалагічны аналітызм твора. Погляд у аповесці "Ціхая плынь" (1917—1930) на родны край як на "забыты" і адначасова як на блізкі і дарагі. Глыбіня псіхалагічнага аналізу пры паказе вясковай рэчаіснасці і раскрыцці сацыяльна-грамадскіх праблем пачатку XX ст.

Творчая гісторыя рамана "Віленскія камунары" (1931—1933). Яго жанрава-стылёвыя асаблівасці. Эпічная шырыня і гістарызм мыслення пісьменніка. Вобраз Мацея Мышкі, яго роля ў сюжэтна-кампазіцыйнай структуры твора. Героі як носьбіты вопыту папярэдніх пакаленняў і мінулых эпох. Праўдзівае ўзнаўленне каларыту і духу часу ад прыгону да першай трэці XX ст. Аналітызм мастацкага мыслення аўтара. Асаблівасці гумару ў творы.

"Камароўская хроніка" (1930—1932, 1937) як эпапея, як унікальная з'ява ў творчасці пісьменніка і гісторыі беларускай літаратуры. Хранікальна-

летапісны і дзённікавы характар твора. Спалучэнне аб'ектыўнага і суб'ектыўнага пачаткаў. Аўтабіяграфічнасць "Камароўскай хронікі". Сувязь твора з "Баркулабаўскім летапісам". Маштабнае і глыбока асабістае асэнсаванне М. Гарэцкім глабальных праблем быцця і лёсу свайго народа ў кантэксце часу і гісторыі. Праблематыка і асноўнае кола вобразаў у творы.

Падарожныя нататкі-дзённікі "Кіпарысы" (1928) і алегарычная аповесць "Лявоніус Задумекус" (1931—1932).

"Скарбы жыцця" (1935—1936, 1937(?)) як "лебядзіная песня", споведзь душы і запавет М. Гарэцкага. Філасафічнасць, прыпавесцевасць, алегарычнасць і сімволіка твора, яго трагедыйнае гучанне і агульначалавечы змест.

Асаблівасці мовы ў творах М. Гарэцкага.

Публіцыстычная, крытычная і літаратуразнаўчая спадчына М. Гарэцкага. Праблемнасць і эстэтычная каштоўнасць артыкулаў "Наш тэатр" (1913), "Развагі і думкі" (1914). Роля "Гісторыі беларускае літаратуры" (1920) у развіцці айчыннай літаратуразнаўчай думкі.

М. Гарэцкі — перакладчык.

## 1.8 ЦІШКА ГАРТНЫ
(1887—1937)

Асоба пісьменніка і грамадскага дзеяча Цішкі Гартнага (Зміцера Хведаравіча Жылуновіча).

Празаічныя творы. Мазаічнасць рэчаіснасці. "Трэскі на хвалях" (1924), "Прысады" (апавяданні і п'есы, 1927), "Гаспадар" (1930), "Гоман зарніц" (1932), "Наступ на горны" (апавяданні, нарысы, вершы, 1932), аповесці "На новым месцы" (1930), "Зялёны шум" (1931). Пошукі творчага самавыяўлення. Спроба стварэння буйнамаштабнага эпічнага палатна ў ранняй беларускай літаратуры.

Раман "Сокі цаліны" ў чатырох квадрах (1922—1930). Асаблівасці хранатопа вёскі і вобраз зямлі як Маці-карміцелькі, выяўленне яе жыватворнай сілы, шматгалосся жыцця. Адметнасці кампазіцыйнай пабудовы рамана, стылёвая інварыянтнасць, арнаменталізм прозы, роля дыялектнай мовы. Рэалістычныя тэндэнцыі ў паказе нацыянальнай псіхалогіі селяніна-беларуса. Значэнне кнігі ў чатырох частках у беларускай раманістыцы.

Выступленне з літаратурна-крытычнымі артыкуламі — "Узгоркі і нізіны" (1928), інш. Палемічны характар і тэндэнцыйнасць ацэнак літаратурнага працэсу 20—30-х гадоў XX ст.

Роля і месца Ц. Гартнага ў літаратурным працэсе, станаўленні і развіцці ранняй беларускай прозы XX стагоддзя.

Кніга Э. Ялугіна пра Ц. Гартнага "Без эпітафіі" (1989).

## 1.9. АЛЕСЬ ГАРУН
(1887—1920)

Алесь Гарун (Аляксандр Уладзіміравіч Прушынскі) як адзін з пачынальнікаў навейшай беларускай літаратуры. Біяграфія паэта.

А. Гарун і беларускае Адраджэнне. Газеты "Наша ніва" і "Biełarus" ("Беларус") у творчым лёсе паэта.

Зборнік "Матчын дар" (1918). Творчая гісторыя, структура, канцэптасфера. Асноўныя матывы і вобразы. Тварэнне паэтам нацыянальнага міфа. Канцэпцыя Беларусі, народа і яго лёсу. Думкі пра волю, народнае шчасце, сэнс быцця, будучыню. Асэнсаванне паэтам праблемы роднай мовы. Пранікнёны лірызм, глыбокая рэфлексія, публіцыстычнасць, трагізм паэзіі А. Гаруна, яе сувязь з фальклорам. Жанравая і рытміка-інтанацыйная разнастайнасць яго лірыкі: верш-роздум, верш-зварот, гімн, элегія, малітва, песня, інш.

Вершы А. Гаруна 1917—1920 гг. Разнастайнасць вобразна-выяўленчых сродкаў і формаў у яго паэзіі. Біблейска-хрысціянскія вобразы і матывы. Гумар, іронія, сатыра ў вершах і байках паэта.

П'есы для дзяцей А. Гаруна з яго зборніка "Жывыя казкі" (1920).

## 1.10. ВАЦЛАЎ ЛАСТОЎСКІ
(1883—1938)

Вацлаў Ластоўскі — адзін з пачынальнікаў і лідэраў беларускага нацыянальнага Адраджэння пачатку XX ст. Біяграфія пісьменніка. Яго грамадска-палітычная, літаратурная, навуковая і выдавецкая дзейнасць.

Эстэтычныя пошукі В. Ластоўскага, наватарскі характар яго творчасці. Зварот да мінуўшчыны, распрацоўка гістарычных сюжэтаў. Стварэнне пісьменнікам літаратурна-гістарычнага міфа. Вобразы і падзеі мінулага, іх асэнсаванне. Выкарыстанне фальклорна-міфалагічнага і летапіснага матэрыялу. Праблематыка, жанрава-стылёвая разнастайнасць, сімвалізм у апавяданнях, абразках, легендах, казках і прыпавесцях. Мастацкая адметнасць аповесці "Прыгоды Тараса і Панаса" (1912).

Аповесць "Лабірынты" (1923). Элементы дэтэктыва, фантастычнай і прыгодніцкай літаратуры, прыкметы містэрыі і утопіі ў творы. Спецыфіка мастацка-філасофскага ўвасаблення ідэі беларускага нацыянальнага быцця ў "Лабірынтах". Вобраз Крывіі ў светапогляднай і эстэтычнай сістэме пісьменніка і ў кантэксце беларускай літаратуры XX ст.

Паэзія В. Ластоўскага. Патрыятычная тэматыка, філасофска-інтэлектуальны змест, разнастайнасць формаў.

Роля В. Ластоўскага ў станаўленні нацыянальнай крытыкі і публіцыстыкі, сцвярджэнні думкі пра эстэтычнае развіццё і ўзвышэнне беларускай літаратуры. Навуковая дзейнасць. Значэнне "Кароткай гісторыі Беларусі" (1910), "Падручнага расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка" (1924), "Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі" (1926) у абгрунтаванні беларускай нацыянальнай ідэі.

Пераклады пісьменнікам твораў іншамоўных аўтараў — Э. Ажэшкі, Р. Кіплінга, А. К. Талстога, інш.

В. Ластоўскі як мемуарыст. Каштоўнасць яго ўспамінаў пра М. Багдановіча і Я. Купалу.

## *РАЗДЗЕЛ 2.* БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА 30-Х — ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 50-Х ГАДОЎ

### а) Даваенная літаратура ў Савецкай Беларусі

Беларуская літаратура 30-х гг. як каштоўны матэрыял для разумення і асэнсавання гісторыі. Адлюстраванне ў ёй стану грамадства, атмасферы часу. Багацце фактаграфізму. Арыентацыя на станоўчы ідэал жыцця. Рамантычныя памкненні маладога пакалення, аптымізм, пафас пераўтварэнняў.

Літаратурныя спрэчкі і дыскусіі. Дзейнасць на пачатку 30-х гг. БелАПП (Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў). Вульгарна-сацыялагічная крытыка (Л. Бэндэ, А. Кучар, інш.). Дзяржаўна-партыйнае кіраўніцтва літаратурай і культурай. Рэарганізацыя літаратурна-творчага жыцця ў святле пастановы ЦК ВКП(б) “Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый” (1932). Першы Усебеларускі з’езд пісьменнікаў (1934). Стварэнне Саюза пісьменнікаў БССР (1934), яго роля і значэнне для літаратуры.

Лёс беларускага пісьменніцтва ў 30-я гг. Спадчына рэпрэсіраваных пісьменнікаў.

Ідэйна-светапоглядныя змены ў беларускай літаратуры 30-х гг. Савецкая ідэалогія і яе адбітак на мастацкай свядомасці. Сацыялістычны рэалізм у беларускай і літаратурах савецкіх рэспублік, краін Еўропы, яго нарматывы. Праблема станаўлення пісьменніцкай індывідуальнасці ва ўмовах даваеннага часу. Духоўнае супраціўленне літаратуры ўціску і гвалту над ёй.

*Паэзія 30-х гг.*: пафас, вобразы, рытмы і настроі. Ідэйна-эстэтычныя пошукі, выпрацоўка формаў мастацкага мыслення. Паэтычная ідылія жыцця ў “Ляўкоўскім цыкле” (1935) Я. Купалы. Усталяванне канона паэзіі аптымістычнай, услаўляльнай, святочнай. Асаблівасці версіфікацыі і паэтыкі П. Броўкі, М. Лужаніна, А. Александровіча, П. Глебкі, У. Хадыкі, З. Астапенкі і інш. Палымяная публіцыстыка, яе скіраванасць на надзённыя патрэбы дня. Паэтычны рэпартаж, верш-прамова, верш-заклік і верш-лозунг. Статус паэта як грамадзяніна, змагара, трыбуна. Суадносіны грамадскага і асабістага.

Якасныя эстэтычныя зрухі ў развіцці беларускай паэзіі другой паловы 30-х гг. Вяртанне да класічных нацыянальных традыцый. Сувязь паэзіі з народна-песеннай творчасцю. Станаўленне індывідуальных стыляў пад уплывам традыцый рускай класікі XIX ст. Ідэйна-эстэтычныя пошукі тагачасных маладых паэтаў у святле творчых узораў і вопыту Я. Купалы, Я.Коласа, М. Багдановіча, С. Ясеніна, А. Твардоўскага, М. Ісакоўскага і інш. Паглыбленне суб’ектыўна-выяўленчага пачатку, псіхалагічных асноў паэзіі, абнаўленне мастацкай тропікі, вершаванай тэхнікі. Гарманічнасць светаадчування ў лірыцы прыроды і кахання П. Броўкі, П. Панчанкі, інш.

Узмацненне ўвагі да адзінкавага, непаўторнага, мастацкай дэталі. Эстэтычны феномен вершаванага цыкла А. Куляшова "Юнацкі свет" (1938—1940). Узбагачэнне сістэмы паэтычнага мыслення, рост культуры творчасці Ю. Таўбіна, Ю. Лявоннага, А. Коршака, інш.

*Проза 30-х гг.* Ідэйна-тэматычны змест. Паказ вясковай рэчаіснасці, калектывізацыі, класавай барацьбы, сацыяльных змен у жыцці. Чалавек на фоне грандыёзных пераўтварэнняў, у кантэксце руху гісторыі. Падзеі, сітуацыі, канфлікты: рэальнае і ідылічнае, класавае і гуманістычнае. Грамадства і чалавек як аб'ект адлюстравання ў аповесцях Э. Самуйлёнка "Тэорыя Каленбурн" (1933), Б. Мікуліча "Дужасць" (1932—1934), П. Галавача "Носьбіты нянавісці" (1935—1936), "Яны не пройдуць" (1936—1937), інш. Герой як носьбіт грамадскіх ідэй. Асноўныя тыпы герояў у прозе Я. Коласа, К. Чорнага, М. Гарэцкага, М. Лынькова, М. Зарэцкага, Р. Мурашкі. Статыка і дынаміка ў паказе характараў. Гуманістычная канцэптуальнасць думкі ў аповесці К. Чорнага "Люба Лук'янская" (1936). Чалавек, час і абставіны ў рамане Л. Калюгі "Пустадомкі" (1933—1935). Спавядальны пафас аповесці М. Гарэцкага "Лявонікус Задумекус" (1931—1932), яе наватарскі характар.

Канцэпцыя беларускага селяніна і сялянства. Выяўленне пісьменнікамі сутнасных асноў нацыянальнага менталітэту. Сутыкненне старога і новага, драматызацыя эпасу. Стылёва-эстэтычная адметнасць аповесці К. Чорнага "Вясна" (1930). Эпічнае адлюстраванне жыцця беларускай вёскі ў рамане К. Крапівы "Мядзведзічы" (1932). Чалавек на зямлі і ўлада зямлі над чалавекам у "Бацькаўшчыне" (1931) К. Чорнага. Аўтарская трактоўка падзей калектывізацыі ў рамане М. Зарэцкага "Вязьмо" (1932). Змястоўна-сэнсавыя сюжэтныя лініі рамана М. Лынькова "На чырвоных лядах" (1933). Ідэйная скіраванасць і сюжэтна-падзейная аснова аповесцей Я. Коласа "Адшчапенец" (1930—1931), П. Галавача "Спалох на загонах" (1930, 1931), С. Баранавых "Межы" (1929—1930), Б. Мікуліча "Чорная вірня" (1931), інш. Суадносіны аб'ектывізаванага і суб'ектызаванага пачаткаў пісьма ў гэтых творах.

Устаноўка на адлюстраванне ў літаратуры індустрыяльнай і працоўнай тэматыкі, рабочага асяродку. Чалавек і калектыў у аповесцях З. Бядулі "Таварыш Мінкін" (1930), П. Броўкі "Каландры" (1931), Х. Шынклера "Запіскі інструктара Томана" (1934), Б. Мікуліча "Ускраіна" (1932), інш. Абмалёўка вобразаў рабочых, паказ гарадской рэчаіснасці.

Раманны эпас, яго ідэйна-мастацкія асаблівасці. Чалавеказнаўчая культура думкі на старонках буйных эпічных твораў. Цыкл раманаў К. Чорнага "Бацькаўшчына" (1931), "Трыццаць год" (1934), "Трэцяе пакаленне" (1935): маштабнасць творчай задумы, праблемна-тэматычны змест, элементы тэндэнцыйнасці і схематызму. Сацыяльна-гістарычнае асэнсаванне народнага жыцця ў раманах М. Гарэцкага "Віленскія камунары" (1931—1933) і "Камароўская хроніка" (1930—1932, 1937), іх хранатыпічныя мадэлі.

Працяг і развіццё традыцый у беларускай літаратуры для дзяцей. Жанры апавядання, літаратурнай казкі, прыгодніцкай аповесці. Выхаваўчая

накіраванасць твораў Я. Маўра, М. Лынькова, В. Вольскага, П. Левановіча і інш. Анімалістычныя вобразы ў дзіцячай паэзіі і прозе. Гераізацыя як аснова адлюстравання падзей і жыцця. Зададзенасць сітуацый і спрошчанасць характараў у асобных творах.

*Драматургія 30-х гг.* Стан беларускай драматургіі і тэатральны рэпертуар у 30-я гг. Аб'ектыўныя цяжкасці ў эстэтычным асваенні сучаснасці і мінулага. Найбольш значныя п'есы таго часу: "Сымон Карызна" (1933) М. Зарэцкага, "Сімфонія гневу" (1935) В. Шашалевіча, "Канец дружбы" (1934), "Партызаны" (1937) і "Хто смяецца апошнім" (1939) К. Крапівы, "Цудоўная дудка" (1939) і "Несцерка" (1940) В. Вольскага, інш. Значэнне твораў К. Крапівы ва ўзбагачэнні традыцый сатырычнай камедыі і псіхалагічнай драмы. Сапраўднае і штучнае, класавае і агульначалавечае ў тагачасных п'есах. Ідэалагічная нарматыўнасць, схематызм вобразаў, ідылічныя карціны рэчаіснасці. Звужэнне гуманістычнай ролі драматургічнага мастацтва, яго функцый. Заканамернасці і тэндэнцыі развіцця беларускай п'есы ў кантэксце тагачаснай савецкай літаратуры.

**б) Літаратура Заходняй Беларусі**

Гістарычныя абставіны фарміравання заходнебеларускай літаратуры, храналагічныя межы яе існавання. Заходняя і Савецкая Беларусь: узровень узаемаўплыву і ўзаемапрыцягнення.

Дамінаванне публіцыстыкі на першым этапе існавання заходнебеларускай літаратуры. Літаратурна-філасофскае эсэ І. Абдзіраловіча (І. Канчэўскага) "Адвечным шляхам" (1921) і яго ўплыў на фарміраванне ідэйна-эстэтычных арыенціраў заходнебеларускай літаратуры.

Беларускі перыядычны друк таго часу як асноўная сфера функцыянавання мастацкага слова, багацце выданняў першай паловы 20-х. Прыход новай генерацыі літаратараў у сярэдзіне 20-х гг. (А. Салагуб, М. Машара, М. Васілёк, П. Пестрак, В. Таўлай, Н. Арсеннева, Х. Ілляшэвіч, інш.). Актывізацыя і палітызацыя грамадскага жыцця. Дзейнасць Беларускай сялянска-работніцкай грамады, Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) і партыі хрысціянскіх дэмакратаў (БХД).

Дамінаванне паэзіі ў перыяд з сярэдзіны 20-х да 1939 г. Багацце кірункаў, формаў, ідэй, эстэтычных канцэпцый (паэзія М. Танка, У. Жылкі, Н. Арсенневай, М. Краўцова, П. Пестрака, Х. Ілляшэвіча, А. Салагуба, В. Таўлая, М. Машары, К. Сваяка, А. Зязюлі, А. Іверса, М. Засіма, А. Мілюця, Н. Тарас, інш.). Жанрава-эстэтычная разнастайнасць паэтычнага эпасу М. Танка 30-х гг.

Заходнебеларуская драматургія як працяг традыцый драматургіі нашаніўскай. Л. Родзевіч і яго аднаактовыя п'есы, драматычныя абразкі ("На каляды", "Досвіткі", "Кавалі"). Ф. Аляхновіч як вядучы драматург заходнебеларускай літаратуры ("Няскончаная драма", "Заручыны Паўлінкі", "Пан міністр" і інш.). Жанравая разнастайнасць яго п'ес. Ф. Аляхновіч і "новая драма" (Г. Ібсен, С. Пшыбышэўскі, А. Чэхаў і інш.). Значэнне кнігі Ф. Аляхновіча "Беларускі тэатр" (1924) для беларускага тэатразнаўства. Сцэнічны лёс твораў заходнебеларускіх драматургаў.

Крытычныя і літаратуразнаўчыя працы ў заходнебеларускай літаратуры. Наватарства і адметнасць "Гісторыі беларускае літаратуры" (1920) М. Гарэцкага, сістэматызацыя ім мастацкіх тэкстаў у "Хрэстаматыі беларускае літаратуры: XI век — 1905 год" (1922). І. Дварчанін і яго "Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры" (1927). Артыкулы А. Навіны (А. Луцкевіча), У. Самойлы, інш.

**в) Літаратура часу Вялікай Айчыннай вайны**

Вайна і літаратура. Пісьменнікі-франтавікі: А. Куляшоў, П. Панчанка, М. Танк, М. Лынькоў, Я. Брыль, К. Кірэенка, А. Вялюгін, М. Аўрамчык, А. Бачыла, М. Лужанін, М. Калачынскі, М. Лобан, інш. Удзел беларускіх пісьменнікаў у падпольным і партызанскім руху: А. Астрэйка, А. Бялевіч, У. Карпаў, Р. Мурашка, В. Таўлай, Н. Тарас, А. Іверс, інш. Пісьменнікі, што загінулі падчас вайны. Складанасць ваенных падзей і калізій. Праблема выбару ва ўмовах акупацыі. Ілюзіі наконт новай улады часткі беларускай творчай інтэлігенцыі. Калабаранты і іх лёс.

Франтавы і партызанскі друк. Публіцыстыка, яе патрыятычны, антываенны і антыфашысцкі пафас (Я. Купала, К. Чорны, інш.). Агітацыйна-прамоўніцкія інтанацыі. Палымяныя звароты, заклікі, пасланні. Трывога пісьменнікаў за будучыню народа, лёс духоўных каштоўнасцей. Франтавыя рэпартажы, карэспандэнцыі. Эпісталярый пісьменнікаў, якія загінулі ў гады вайны.

Вострая сатыра, скіраваная супраць Гітлера і фашысцкіх захопнікаў (К. Крапіва, П. Глебка, П. Панчанка, інш.). Сатырычны верш, фельетон, памфлет і іншыя жанры. Зборнік фельетонаў К. Чорнага "Кат у белай манішцы" (1942).

Патрыятычная лірыка, яе сувязь з фальклорнай традыцыяй і з традыцыяй старабеларускай літаратуры.

Унікальнасць паэтычнай кнігі А. Астрэйкі "Слуцкі пояс" (1943). Гісторыя яе стварэння, пафас, асноўныя матывы. Сістэма сродкаў паэтычнага выяўлення і ўздзеяння на ўнутраны свет чалавека.

Гераічнае і трагічнае ў баладах ваеннага часу А. Куляшова, П. Панчанкі, М. Танка, М. Сурначова, А. Вялюгіна, інш. Зварот да рамантычна-легендарнага і гераічнага матэрыялу, вобразаў Кастуся Каліноўскага, Усяслава Чарадзея, Рагнеды і інш. Ідэйна-тэматычная навізна цыкла вершаў П. Панчанкі "Іранскі дзённік" (1944). Спалучэнне інтымна-псіхалагічнага і публіцыстычнага пачаткаў у паэзіі. Выяўленне ўнутранага стану чалавека ў лірычных вершах Я. Коласа, А. Куляшова, В. Віткі, П. Глебкі, А. Коршака, М. Аўрамчыка, А. Бачылы, А. Моркаўкі і інш. Канкрэтна-асабовы характар пачуццяў і перажыванняў, выкліканы душэўным болем і пакутамі. Элегічна-драматычны і спавядальны пафас вершаў лірычнага складу. Матывы кахання, любові і вернасці ў творах ваеннага часу. Мастацка-вобразныя сродкі ў выяўленні чалавечай і народнай трагедыі. Узбагачэнне культуры верша.

Беларускі паэтычны эпас ваеннага часу. Дакументальная аснова многіх твораў. Разгорнутае, шматпланавае адлюстраванне вайны, паказ суровай

рэчаіснасці, складаных калізій, народнай бяды і гора. Раскрыццё маральна-псіхалагічнага свету чалавека. Роздум пра лёс народа і яго будучыню. Абагульнена-філасофскі характар думкі ў паэтычным эпасе. Жанравая сінтэтычнасць беларускай паэмы часу вайны: спалучэнне эпасу, лірыкі і драмы. Жанравыя асаблівасці і архітэктоніка паэм А. Куляшова "Сцяг брыгады" (1942), "Прыгоды цымбал" (1944), "Дом № 24" (1944), П. Броўкі "Паэма пра Смалячкова" (1942), "Беларусь" (1943), "Ясны кут" (1944), М. Танка "Янук Сяліба" (1943), Я. Коласа "Суд у лесе" (1942), "Адплата" (1944), З. Астапенкі "Эдэм" (1944), П. Панчанкі "Маладосць у паходзе" (1945) і інш. Узбагачэнне паэмнага мыслення, навізна стылёва-выяўленчых сродкаў пісьма.

Проза часу Вялікай Айчыннай вайны, яе ідэйна-мастацкае абнаўленне. Запачаткаванне ваеннай тэмы ў "малых" жанравых формах (апавяданне, нарыс, навела). Зборнікі апавяданняў М. Лынькова "Астап" (1944), К. Чорнага "Вялікае сэрца" (1945), іх стылёва-выяўленчая адметнасць. Адбітак уласна ўбачанага і перажытага ў творах "Дзіцячы башмачок" М. Лынькова і "Маленькая жанчына" К. Чорнага. Драматычна-трагічны паказ вобразаў дзяцей. Майстэрства тыпізацыі, псіхалагізм лепшых апавяданняў гэтых празаікаў. Раманы "Пошукі будучыні" (1943) і "Млечны шлях" (1944) К. Чорнага як вяршыннае дасягненне беларускай мастацкай прозы часу вайны. Проза часу вайны Р. Мурашкі ("Таварышы", "Смерць маткі", інш.), Х. Шынклера ("Пульс жыцця", інш.). Пачатак творчасці І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Брыля і інш. Мемуарная проза ("Першая кніга" І. Мележа, дзённік К. Чорнага і інш.).

**г) Літаратура пасляваеннага дзесяцігоддзя (1945—1955)**

Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне і паэтычныя водгукі на гэтую падзею П. Панчанкі, М. Танка, А. Вялюгіна, К. Кірэенкі, М. Лужаніна, інш. Веліч, драматызм і цяжкасці часу. Аднаўленне народнай гаспадаркі, разбураных гарадоў і вёсак. Уключэнне пісьменнікаў у працэс мірнага жыцця. Плённасць творчай дзейнасці М. Лынькова, А. Куляшова, М. Танка, П. Панчанкі, П. Броўкі і іншых вядомых яшчэ з даваеннага часу пісьменнікаў. Станаўленне ў пасляваенны час творчых індывідуальнасцей І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Брыля, А. Кулакоўскага, А. Чарнышэвіча, А. Макаёнка, М. Лупсякова, А. Вялюгіна, М. Аўрамчыка, А. Пысіна, С. Гаўрусёва, А. Русецкага, інш. Патрыятычны і жыццялюбны пафас творчасці, абумоўлены заканчэннем вайны, мірным будаўніцтвам. Уплыў вайны на развіццё літаратуры першых пасляваенных гадоў.

Грамадзянскае гучанне тагачаснай паэзіі. Матывы радасці і ўслаўлення стваральнай працы. Сцвярджэнне ідэі міру і антываенны пафас. Высокая ўзнёсласць і ўрачыстасць прамаўлення як выяўленне агульнага грамадскага настрою. Паэтызацыя гераічнага подзвігу народа ў гады вайны. Раскрыццё ўражанняў той пары, зведанага і перажытага, паглыблены роздум пра страты, суровыя выпрабаванні. Суадносіны ў творчасці грамадскага і асабістага. Ідэйна-эстэтычны змест зборнікаў М. Танка "Каб ведалі" (1948), "На камні, жалезе і золаце" (1951), "У дарозе" (1954), А. Куляшова "Камуністы" (1949),

П. Панчанкі “Прысяга” (1949), “За шчасце, за мір!” (1950), “Шырокі свет” (1955), П. Броўкі “У роднай хаце” (1946), “Сонечнымі днямі” (1950), “Цвёрдымі крокамі” (1954), А. Вялюгіна “Салют у Мінску” (1947), “Негарэльская арка” (1949), “На подступах” (1952), К. Кірэенкі “Пасля навальніцы” (1947), “Мая рэспубліка” (1949), “Маякі” (1952), інш. Чалавек, час, эпоха ў гэтых кнігах. Паэтычныя прамова, верш-зварот, верш-заклік. Імкненне да прыгожага ўладкавання жыцця. Выдаткі паэтычнай публіцыстыкі: агульшчына, рыторыка, дэкларатыўнасць, стэрэатыпнасць вобразаў. Каштоўнасць лірызму ў паглыбленні асабовага пачатку і эстэтыкі ўсёй паэзіі. Праявы неарамантызму і імажынізму (М. Танк, А. Вялюгін, інш.). Выяўленне ўласнага жыццёвага вопыту. Лірычнае самараскрыццё, адухаўленне свету прыроды і яркая метафарычнасць у пейзажнай лірыцы. Паэтызацыя зямных каштоўнасцей (хлеб, колас, зерне, інш.), сялянскай працы. Паэтыка песеннай лірыкі А. Русака (“Лясная песня”, “Ціхі вечар”, “Толькі з табою”, інш.). Узбагачэнне вобразнага складу мыслення, мастацка-выяўленчай сістэмы ў лепшых вершах пасляваеннага часу.

Паэмны эпас, яго мастацкія вартасці і складанасці развіцця. Вайна і пасляваенная рэчаіснасць у тагачаснай вершаванай эпіцы. Адлюстраванне народнага лёсу, жыццяпіс свайго часу, зварот да мінулага. Праўда жыцця і свет ідэальнага, віртуальнага. Сюжэтны лад і стылёвыя асаблівасці паэм М. Танка “Люцыян Таполя” (1946), П. Броўкі “Хлеб” (1946), А. Бялевіча “Сям’я” (1946), Я. Коласа “Рыбакова хата” (1947), А. Куляшова “Новае рэчышча” (1948), “Толькі ўперад” (1950), “Грозная пушча” (1952—1956), А. Зарыцкага “Аповесць пра залатое дно” (1953), інш. Жанравая разнастайнасць паэм таго часу: лірычныя, ліра-эпічныя, эпічныя. Тагачасныя творы ў кантэксце нацыянальнай мастацкай традыцыі. Эвалюцыя эпічнага тыпу мыслення, яго абнаўленне (кінематаграфічны прынцып мантажу, лірызм, заглыбленне сюжэтна-мастацкага драматызму, філасафізм думкі).

Вайна як галоўная ідэйна-тэматычная дамінанта беларускай прозы 1945—1955 гг. Батальны план, трагічныя абставіны і канфлікты ў творах пра франтавыя падзеі. Аўтабіяграфічны пачатак і яго роля ў мастацкім асэнсаванні ваеннай рэчаіснасці. Наватарскі характар аповесці І. Шамякіна “Помста” (1945). Псіхалагізм ваенных апавяданняў І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Брыля, інш. Спроба стварэння эпапеі пра Вялікую Айчынную вайну. Панарамны, маштабны паказ ваенных падзей у раманах М. Лынькова “Векапомныя дні” (кн. 1, 1948—1951), І. Мележа “Мінскі напрамак” (1952). Канцэпцыя партызанскага руху як усенароднай барацьбы з фашызмам у рамане “Глыбокая плынь” (1949). Значэнне гэтага твора для далейшай распрацоўкі партызанскай тэмы ў ваеннай літаратуры. Асэнсаванне духоўнага подзвігу і трагедыі беларускага народа ў раманах М. Ткачова “Згуртаванасць” (1951), А. Кулакоўскага “Расстаёмся ненадоўга” (1952—1954), І. Гурскага “У агні” (1952) і інш. Раскрыццё псіхалогіі чалавека на вайне, яго духоўна-маральнай сутнасці.

Развіццё мастацкай дакументалістыкі і мемуарыстыкі. Кнігі В. Лівенцава “Партызанскі край” (1950), Г. Шчарбатава “Партызанскія агні”

(1950), В. Казлова “Людзі асобага складу” (1952), інш. Падключэнне беларускіх пісьменнікаў да працы над мемуарамі ўдзельнікаў вайны. Час, падзеі і факты ў дакументальнай прозе. Пасляваенны нарыс, яго ідэйна-стылёвыя асаблівасці (“Нёманскія казакі”, “Дзеля сапраўднай радасці” Я. Брыля, інш.). Унікальнасць кнігі “Ніколі не забудзем” (1948). Дакументальная аснова аповесцей У. Шахаўца “Дняпроўскія хвалі” (1946), У. Карпава “Без нейтральнай паласы” (1950), інш. Жыццёва-аўтабіяграфічны матэрыял, яго роля і функцыі.

Беларуская вёска ў тагачаснай прозе. Калгасная рэчаіснасць, пасляваеннае жыццё вачыма А. Кулакоўскага (апавяданне “Сад”, 1945), М. Паслядовіча (раман “Святло над Ліпскам”, 1950), І. Шамякіна “У добры час” (1952), Я. Брыля (аповесці “У Забалоцці днее”, 1950, “На Быстранцы”, 1955) і іншых пісьменнікаў. Паказ сялянскай працы, паэтызацыя роднай прыроды. Выяўленне чалавечых эмоцый і настрояў. Станоўчы герой як эталон жыцця і паводзін. Раманы А. Стаховіча “Пад мірным небам” (1948), “Шырокія гарызонты” (1954), аповесці У. Краўчанкі “Станаўленне” (1947), М. Паслядовіча “Цёплае дыханне” (1948), “Т. Хадкевіча “Вяснянка” (1949) у кантэксце свайго часу і з пазіцый сучаснасці.

Паступовае пашырэнне тэматычных аспектаў і стылёва-выяўленчых магчымасцей беларускай прозы. Мастацкае ўзнаўленне жыцця і падзей у Заходняй Беларусі. Паказ народнага змагання ў рамане-хроніцы П. Пестрака “Сустрэнемся на барыкадах” (1952). Заходнебеларуская рэчаіснасць ва ўспрыманні і асэнсаванні Я. Брыля. Маральна-духоўныя пошукі яго герояў (“Сірочы хлеб”, “Галя”, “У сям’і”, інш.). Экспрэсія тропаў у творах Я. Брыля. Сінтэз лірызму і філасафізму, інтэлектуальная напоўненасць трэцяй часткі Я. Коласа “На ростанях” (1949—1954). Горад у творах І. Мележа, А. Кулакоўскага, інш.

Жанравая разнапланавасць драматургіі пасляваеннага часу: гераічная драма, трагедыя, псіхалагічная і гістарычная драма, лірычная і сатырычная камедыі. Найбольш значныя п’есы пра вайну А. Маўзона (“Канстанцін Заслонаў”, 1947), К. Крапівы (“З народам”, 1948), К. Губарэвіча (“Брэсцкая крэпасць”, першапачатковая назва — “Цытадэль славы”, 1952), суадносіны ў іх гераічнага і трагічнага. Сатырычны пафас і праблемная скіраванасць п’есы К. Крапівы “Мілы чалавек” (1945). Лёс п’есы. Лірычная камедыя К. Крапівы “Пяюць жаваранкі” (1950), яе сцэнічны поспех. Гумар, фальклорная стыхія ў гэтым творы. Прычыны творчых няўдач аўтараў вытворчых п’ес, драматычных твораў пра калгасную рэчаіснасць, пасляваеннае жыццё. Бесканфліктнасць, ілюстрацыйнасць, зададзенасць у тагачасных п’есах Ю. Рудзько, В. Палескага, К. Губарэвіча, В. Віткі, інш.

Узнаўленне падзей і вобразаў гістарычнага мінулага ў драматычнай трылогіі М. Клімковіча “Георгій Скарына” (1946—1955), п’есе В. Вольскага “Машэка” (1946).

Уваходзіны ў драматургічнае мастацтва А. Макаёнка, яго творчы плён у другой палове 40-х — першай палове 50-х гг. (“Добра, калі добра

канчаецца", "Перад сустрэчай", інш.), роля ў развіцці беларускай сатыры і нацыянальнага тэатра.

Грамадства і літаратура напярэдадні перамен пасля смерці Сталіна (1953).

## 2.1. КУЗЬМА ЧОРНЫ
(1900—1944)

Кузьма Чорны (Мікалай Карлавіч Раманоўскі) як класік беларускай мастацкай прозы. Постаць пісьменніка, яго біяграфія. Вытокі творчасці. Эвалюцыя таленту мастака. Творчае асэнсаванне ім вопыту нацыянальнай (Я. Колас, З. Бядуля, М. Гарэцкі) і сусветнай прозы (Л. Талстой, Ф. Дастаеўскі, А. дэ Бальзак, Э. Заля і інш.).

Праблематыка і мастацкія асаблівасці ранніх апавяданняў са зборнікаў "Апавяданні", "Срэбра жыцця" (усе — 1925). Выяўленне ў іх стылістыкі маладнякоўскай прозы. Паэтызацыя новай рэчаіснасці і побыту селяніна ў першай палове 20-х гг. Музычнасць і экспрэсіўнасць ранняй прозы.

Змены ў стылі К. Чорнага ў сярэдзіне 20-х гг. Спецыфіка ўвасаблення жыцця і ўнутранага свету чалавека ў зборніках "Па дарозе", "Хвоі гавораць", "Пачуцці" (усе — 1926), "Вераснёвыя ночы" (1929). Узмацненне псіхалагічнага аналізу ў апавяданнях другой паловы 20-х гг. ("На пыльнай дарозе", "Хвоі гавораць", "Пачуцці", "Начлег у вёсцы Сінегах", "Вераснёвыя ночы").

Пошукі пісьменнікам адказаў на вечныя і надзённыя пытанні быцця, багацце, разнастайнасць і глыбіня духоўнага свету герояў у першых раманах "Сястра" (1927—1928) і "Зямля" (1928). Праблема інтэлігенцыі і народа ў рамане "Сястра". Гуманістычны пафас твора.

Беларуская вёска сярэдзіны 20-х гг. у рамане "Зямля". Традыцыі і наватарства ў творы.

Канцэпцыя чалавечай асобы ў аповесці "Лявон Бушмар" (1929). Значнасць мастацкага адкрыцця (вобраз Бушмара).

Набыткі ў творчасці К. Чорнага канца 20—30-х гг. Раман "Бацькаўшчына" (1931): асаблівасці хранатопнай мадэлі і сюжэтна-кампазіцыйнай структуры. Рэтраспекцыі ў ранейшыя часы. Майстэрства ў абмалёўцы персанажаў на фоне падзей першай трэці XX ст. Раман "Трэцяе пакаленне" (1935) у гісторыка-літаратурным кантэксце. Прачытанне рамана з сучасных пазіцый беларускай крытыкай (М. Мушынскі, І. Жук, М. Тычына, інш.). Праблематыка і сацыяльна-філасофская змястоўнасць твора. Вобраз Міхала Тварыцкага. Псіхалагічная глыбіня, эстэтычная напоўненасць і пэўная тэндэнцыйнасць, зададзенасць у раскрыцці гэтага вобраза. Іншыя вобразы. Стыль рамана. Філасафічнасць маналогаў. Сюжэтна-кампазіцыйная адметнасць. Прыгодніцкія элементы. Мастацкая дэталь і пейзаж. Асаблівасці дапрацовак рамана аўтарам.

Аповесць "Люба Лук'янская" (1936). Праблематыка. Мастацкія асаблівасці.

Аповесць пісьменніка для дзяцей "Насцечка" (1940).

Драматургія (“Бацькаўшчына”, 1932—1939; “Ірынка”, 1941). Праблематыка і жанравая адметнасць гэтых п’ес.

Творчасць пісьменніка перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Публіцыстычныя артыкулы, нарысы і фельетоны ваеннага часу.

Гуманістычны пафас, псіхалагізм і філасафічнасць апавяданняў, напісаных у гады вайны (“Маленькая жанчына”, “Бацька”, “Вялікае сэрца”). Эпічная маштабнасць раманаў пісьменніка, створаных у ваенны час (“Пошукі будучыні”, 1943; “Вялікі дзень”, 1941—1944; “Млечны шлях”, 1944). Філасофскае асэнсаванне лёсу беларусаў у эпоху вялікіх выпрабаванняў, адносіны герояў да зямлі, уласнасці, бацькаўшчыны, маралі. Праблемы гуманізму і гераізму, вытокі эгаізму, лютасці і жорсткасці, паводзіны чалавека ў выключных абставінах. Раманы К. Чорнага ў еўрапейскім літаратурным кантэксце (А. Камю, Т. Ман, інш.).

Гуманістычны змест, патрыятычнае гучанне, філасофска-псіхалагічная глыбіня і маштабнасць прозы К. Чорнага. Яе традыцыі ў беларускай літаратуры. Месца пісьменніка і яго прозы ў сусветным літаратурным кантэксце. Дзённік К. Чорнага. Яго пераклады.

Літаратурна-крытычныя артыкулы К. Чорнага. Іх значэнне для станаўлення эстэтычнай думкі ў Беларусі.

Бібліяграфія асноўных выданняў К. Чорнага.

Крытычныя і літаратуразнаўчыя працы, прысвечаныя творчасці пісьменніка.

## 2.2. КАНДРАТ КРАПІВА (1896—1991)

Кандрат Крапіва (Кандрат Кандратавіч Атраховіч) — адзін са стваральнікаў беларускай сатырычнай прозы, паэзіі і драматургіі, родапачынальнік беларускай байкі, арыгінальны раманіст. Біяграфія. Дзейнасць К. Крапівы як вучонага-мовазнаўцы.

Удзел пісьменніка ў “Маладняку”. К. Крапіва як адзін са стваральнікаў і кіраўнікоў “Узвышша”.

Зборнікі сатыры і гумару “Асцё” (1925), “Крапіва” (1925), “Біблія” (1926), “Байкі” (1927), “Ухабы на дарозе” (1930) і інш. Раннія (1922—1926) творы К. Крапівы як тыповы узор эстэтыкі “Маладняка”. Стыхія народнага гумару і смеху ў крапівінскіх байках. Эвалюцыя байкі К. Крапівы як адлюстраванне эвалюцыі светапогляду пісьменніка.

Сатырычныя паэмы К. Крапівы, працяг і развіццё ў іх ідэйна-эстэтычных прынцыпаў малой сатырычнай паэзіі. Паэмы “Біблія” (1926) і “Хвядос Чырвоны Нос”. Адлюстраванне і ацэнка побыту, маралі, падзей 20—30-х гадоў у сатырычных апавяданнях К. Крапівы.

Раман “Мядзведзічы” (1932). Асаблівасці мастацкай манеры, жанру, кампазіцыі. Багацце вобразаў і тыпаў, каларытнасць і падтэкставасць персанажаў. Традыцыі “Мядзведзічаў” у пасляваеннай беларускай прозе (“Палеская хроніка” І. Мележа). Раман “Мядзведзічы” як завяршэнне шляху К. Крапівы-празаіка.

Прычыны звароту пісьменніка да драматургіі. Суровыя рэаліі эпохі калектывізацыі ў п'есе "Канец дружбы" (1934). Драма "Партызаны" (1937) і яе важнасць для станаўлення К. Крапівы-драматурга.

Сатырычная камедыя "Хто смяецца апошнім" (1939) як выяўленне мужнай грамадзянскай пазіцыі аўтара. Яркасць і злабадзённасць персанажаў, элементы карыкатурнасці ў іх, паказ атмасферы страху, падазронасці ў п'есе.

Сатырычная паэзія К. Крапівы перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Драматычныя творы К. Крапівы "Проба агнём", "Валодзеў гальштук" (абедзве — 1943).

Камедыя "Мілы чалавек" (1945) Выкрыццё "жлуктаўшчыны". Філасофскі падтэкст вобраза Язвы. Няўдалы тэатральны лёс п'есы.

Драматургія К. Крапівы 40—50-х гадоў ("З народам", "Зацікаўленая асоба", "Людзі і д'яблы"). Уплыў "тэорыі бесканфліктнасці" на мастацкую канцэпцыю гэтых твораў. Майстэрства аўтара ў стварэнні яркіх характараў, багацце сродкаў і прыёмаў драматурга.

Фантастычная камедыя "Брама неўміручасці" (1972). Галоўныя праблемы грамадства таго часу ў асэнсаванні драматурга. Філасофскі падтэкст твора, аналіз грамадскіх нораваў і маралі, праблема героя — носьбіта спрадвечных чалавечых якасцяў.

П'еса "На вастрыі" (1982) — спроба стварэння шматпланавай і шматпраблемнай карціны сучаснасці.

К. Крапіва — перакладчык твораў А. Чэхава, М. Гогаля, І. Крылова, Я. Гашака, У. Шэкспіра і інш.

Традыцыі К. Крапівы ў сучаснай паэзіі, прозе, драматургіі.

## 2.3. МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ
(1899—1975)

Біяграфія пісьменніка.

Праблематыка і мастацкія асаблівасці зборнікаў "Апавяданні" (1927), "Гой" (1929). Асаблівасці мастацкага стылю твораў 20-х гадоў. Інверсійная пабудова сюжэта, каментарыі лірычнага героя, рамантычная падсветка гераічнага, асаблівасці арнаментальнай прозы.

Творчасць 30-х гадоў. Усталяванне ў грамадстве новай эканамічнай палітыкі, падзеі калектывізацыі сельскай гаспадаркі, вынікі і страты ("Саўка-агіцірнік", "На вялікай хвалі", "Світка"). Грамадская дзейнасць пісьменніка. Аўтарская пазіцыя ў выкрыцці бюракратызму, лакіроўкі рэчаіснасці, парушэння законнасці і праяў таталітарызму ў грамадстве ("Світка", "Саўка-агіцірнік", "Салавей-разбойнік", "Баян", "На вялікай хвалі").

Раман "На чырвоных лядах" (1934). Беларуская вёска дакастрычніцкага часу, падзеі Першай сусветнай вайны, пярэдадзень Кастрычніка ў адлюстраванні пісьменніка.

Апавяданне "Андрэй Лятун" (1930) — сведчанне мастацкага ўвасаблення новага часу. Вобраз Андрэя. Сродкі тыпізацыі ў творы. Рознабаковае выкарыстанне гумару для вызначэння індывідуальных асаблівасцей характараў, лірычнай афарбоўкі твора, вобраза лірычнага героя.

Аповесць “Міколка-паравоз” (1937). Гістарычныя падзеі ў творы. Паказ вызваленчай барацьбы народа. Вобраз Міколкі. Уплыў падзей на станаўленне яго светапогляду. Адлюстраванне побыту і працы чыгуначнікаў. Аўтабіяграфічныя элементы твора. Аповесць — класічны твор беларускай літаратуры. Дзіцячыя творы “Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў” (1937), “Янка-парашутыст” (1947). Сродкі псіхалагічнага аналізу ў раскрыцці вобраза падлетка.

Удзел М. Лынькова ў 1939 годзе ў паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Публіцыстычныя допісы і апавяданні пра жыццё беларусаў у буржуазнай Польшчы (“Тры злоты”, “Капля малака”, “Ядвісін дуб”, “Тонкая сітуацыя”). Аповесць “Сустрэчы” (1939). Гістарычныя калізіі ў пабудове сюжэта. Вобразы твора.

Удзел у Вялікай Айчыннай вайне. Праца ў франтавым друку. Зборнік апавяданняў “Астап” (1944). Вобраз савецкага грамадзяніна-ваяра (“Астап”, “Недапетыя песні”, “Пацалунак”, інш.). Беларусь у час фашысцкай акупацыі, палітычная і маральная аснова партызанскага руху, барацьба падпольшчыкаў (“Салют”, “Ірына”, “Пацалунак”, “Кавалак хлеба”, “Васількі”, інш.).

Раман “Векапомныя дні” (1958). Творчая гісторыя. Мастацкая трансфармацыя гістарычных фактаў у рамане. Вобразы савецкіх патрыётаў, партызанаў і падпольшчыкаў. Прататыпы герояў твора. Лірызм і адкрытая паэтызацыя ў мастацкім стылі рамана.

Творчая і грамадская дзейнасць у пасляваенныя гады. Паездкі ў ЗША ў якасці члена ўрадавай дэлегацыі БССР на Генеральную Асамблею ААН. Зварот да распрацоўкі дыпламатычнай тэматыкі ў беларускай прозе, публіцыстычныя замежныя нататкі. Праблематыка апавяданняў зборніка “За акіянам” (1962). Пісьменнік і яго час.

Крытычныя і літаратуразнаўчыя працы пісьменніка, іх роля ў развіцці эстэтычнай думкі ў Беларусі. Лынькоўскія традыцыі ў сучаснай беларускай прозе. Пераклады твораў пісьменніка на замежныя мовы. М. Лынькоў у ацэнцы крытыкі і літаратуразнаўства.

## 2.4. УЛАДЗІМІР ДУБОЎКА
(1900—1976)

У. Дубоўка як выдатны паэт XX стагоддзя.

Жыццёвы і творчы шлях. Традыцыі Я. Купалы, М. Багдановіча, Т. Шаўчэнкі, С. Ясеніна, А. Блока, В. Брусава і беларускага фальклору ў яго паэзіі. У. Дубоўка — адзін з лідэраў згуртавання “Узвышша”. Эстэтычныя погляды пісьменніка.

“Маладнякоўскія” паэмы, лірыка 20-х гадоў (кнігі “Строма”, 1923; “Там, дзе кіпарысы”, 1925; “Трысцё”, 1925; “Credo”, 1926; “Наля”, 1927). Тонкі лірык і паэт-рамантык. Пранікнёны адраджэнскі пафас, сімволіка, прыватнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў вершах паэта. Праблема красы. Адметнасць мастацкіх пошукаў і адкрыццяў. Прыкметы імажынізму, канструктывізму, эстэтыкі “Узвышша” ў лірыцы. Высокая культура творчасці, інтэлектуальнасць, вытанчанасць стылю і надзвычайная

меладычнасць. Самакаштоўнасць і разнастайнасць асацыятыўнай вобразнасці, метафары і рытмікі. Інтымная і пейзажная лірыка. Пошукі і адкрыцці ў другой палове 20-х гг.

Наватарства ў распрацоўцы паэтычнага эпасу (паэмы "Кругі", 1927; "І пурпуровых ветразей узвівы", 1929; "Штурмуйце будучыні аванпосты!", 1929). Творчая гісторыя. Арганічная цэласнасць паэтычнай трылогіі. Маштабнасць паэтычнага мыслення аўтара. Алегарычная вобразнасць і сімволіка ў творах. Лірычна-эпічны лад і драматызм зместу ў паэмах пра мінуўшчыну "Крычаўская спакуса" (1925) і "Браніслава" (1929).

Уплыў творчасці У. Дубоўкі на тагачасных беларускіх пісьменнікаў.

Лёс паэта і яго твораў у перыяд зняволення і высылкі. Творчасць пасля рэабілітацыі. Трагізм Вялікай Айчыннай вайны, духоўная веліч і мужнасць жанчыны ў паэмах "Перад іменем Любові" (1958) і "Беларуская Арыядна" (1960). Мастацкая дасканаласць у апрацоўцы фальклору, творы для дзяцей (кнігі казак "Цудоўная знаходка", 1960; "Кветкі — сонцавы дзеткі", 1963; "Залатыя зярняты", 1975 і інш.). Пераклады.

Значэнне творчасці У. Дубоўкі ў гісторыі беларускай літаратуры і культуры. Выданні твораў паэта на беларускай мове. Асэнсаванне яго постаці ў крытыцы і літаратуразнаўстве.

## 2.5. МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ
(1901—1937)

Міхась Зарэцкі (Міхаіл Яўхімавіч Касянкоў) як адзін з найбольш яркіх прадстаўнікоў рамантычнага кірунку ў беларускай прозе 20-х гг. Біяграфія пісьменніка. Яго актыўны ўдзел у літаратурна-грамадскім жыцці.

Праблематыка, вобразы і мастацкія асаблівасці апавяданняў "У віры жыцця", "Адкупіўся", "Ворагі", "Адна партыя ў шашкі", "Бель", "Дзіўная", "Кветка пажоўклая", "Ракавыя жаронцы".

Аповесць "Голы звер" (1926). Неадназначнасць, жывучасць і тыповасць вобраза Яроцкага. Прыёмы эмацыянальна-лірычнага і сатырычна-іранічнага пісьма ў творы.

Раман "Сцежкі-дарожкі" (1927). Лёс і пакутлівыя духоўныя пошукі інтэлігенцыі ў перыяд Першай сусветнай вайны і замежнай інтэрвенцыі. Вобразы-персанажы твора. Майстэрства ў раскрыцці характараў і адносін паміж людзьмі, у выкарыстанні выяўленчых сродкаў.

Раман "Вязьмо" (1932). Глыбіня ў паказе трагізму масавай калектывізацыі і гуманістычнае гучанне твора. Псіхалагічная змястоўнасць вобраза Карызны. Вобраз Пацяроба як "страшнага калектывізатара", прыхільніка гвалтоўных, камандна-адміністрацыйных метадаў кіравання. Сэнсавая напоўненасць вобраза Галілея (Ахрэма Пунціка). Праўдзівае ўзнаўленне часу і падзей. Праблема асабістага і грамадскага ў рамане. Філасафічнасць твора. Вобраз вязьма, думка пра сілу грамадскіх абставін, фатальную наканаванасць, лёс чалавека. Складаны свет інтымных пачуццяў. Адметнасць лірычна-рамантычнага стылю. Канцэпцыя "пазітыўнага"

рамантызму. Тыпалогія рамана з творамі пра падзеі “вялікага пералому” (П. Галавач, Я. Колас, С. Баранавых, Б. Мікуліч, інш.).

Бібліяграфія арыгінальных выданняў М. Зарэцкага. Крытычныя і літаратуразнаўчыя працы пра яго творчасць.

## 2.6. ЯЗЭП ПУШЧА
(1902—1964)

Язэп Пушча (Іосіф Паўлавіч Плашчынскі) і яго значэнне ў гісторыі беларускай літаратуры. Творчы шлях і лёс паэта.

Я. Пушча як адзін з арганізатараў літаратурных аб’яднанняў “Маладняк” і “Узвышша”. Паэт у тагачасным літаратурным асяродку. Раннія вершы. Зборнік “Раніца рыкае” (1925), яго наватарская адметнасць. Маладнякоўскі аптымізм, асаблівасці стылю: рамантызацыя, арнаментальнасць і квяцістасць, элементы парадыйнасці. Зборнік “Vita” (1926) як працяг авангардна-эксперыментальных пошукаў. Суб’ектыўна-выяўленчы характар творчасці. Спалучэнне ў светаадчуванні паэта рамантычнага і рэалістычнага, высокага і нізкага, светлага і змрочнага. Філасофскі самааналіз і драматызацыя лірычнага пачуцця Хрысціянскія матывы і біблейская сімволіка (церні, крыж, укрыжаванне і інш.). Паглыбленне вобразна-выяўленчых магчымасцей у паэзіі Я. Пушчы “ўзвышэнскага” перыяду: арфейны пачатак (музыка-напеўны гукапіс), эмацыянальная сугестыўнасць, пачуццёвы дынамізм, кантрастнасць вобразаў, сімвалічнасць і інш.

Узрастанне элегізму і трагічнага пафасу ў зборніках “Дні вясны” (1927) і “Песні на руінах” (1929). Экзістэнцыяльныя матывы разгубленасці, зняверанасці, адзіноты, суму, тугі, змрочныя вобразы і мінорныя інтанацыі. Паэт у духоўным супрацьстаянні творчай несвабодзе, канфармізму, неспрыяльным грамадскім абставінам. Жанравая і кампазіцыйная адметнасць паэм Я. Пушчы.

Творчасць пасля рэабілітацыі (1956). Паэмы пра ваеннае мінулае “Бор шуміць” (1957) і “Людвіся” (1959), іх мастацка-стылёвыя асаблівасці. Эстэтычная сувязь паэта з традыцыямі нацыянальнай класікі.

Роля Я. Пушчы ў развіцці беларускай паэзіі. Творчая рэалізацыя паэта, няспраўджанасць яго значных патэнцыяльных магчымасцей. Язэп Пушча ва ўспамінах беларускіх пісьменнікаў і жонкі Станіславы Плашчынскай (“З дзён далёкіх і блізкіх”).

## 2.7. АНДРЭЙ МРЫЙ
(1893—1943)

Андрэй Мрый (Андрэй Антонавіч Шашалевіч) — выдатны беларускі празаік, аўтар адзінага ў айчыннай літаратуры сатырычнага рамана. Трагічны жыццёвы лёс пісьменніка.

Апавядальная творчасць 20-х гг.

Сатырычнае выкрыццё абывацельшчыны і правінцыялізму ў рамане «Запіскі Самсона Самасуя» (1929). Сувязь аўтарскай канцэпцыі з традыцыямі

М. Гогаля, сатырычнымі апавяданнямі Я. Коласа ("Пісаравы імяніны", "Хаім Рыбс", К. Чорнага ("Мяшчане ў густой пары", "Не пі густога чаю"), К. Крапівы. Новая савецкая бюракратыя, яе ўзровень, мараль, побыт, норавы, жыццёвыя памкненні. Адсутнасць у яе асяроддзі альтэрнатывы гратэскнаму і пачварнаму вобразу Самсона Самасуя. Высмейванне прынцыпу "бядняцка-пралетарскага паходжання" як галоўнай умовы трывалага сацыяльнага становішча і службовага росту. "Самасуеўшчына" — з'ява, з'яўленне і рост якой у якасці дэнацыяналізаваных, бяздумных, паслухмяных "калёсікаў і вінцікаў" рэвалюцыі стымулюецца ідэалагічнай машынай. Універсальнасць смеху, разнастайнасць мастацкіх прыёмаў і сродкаў аўтарскага пісьма: гратэск, карыкатура, парадзіраванне, іронія, парадокс і інш. Негатыўныя ацэнкі рамана тагачаснай крытыкай і паплечнікамі па "пісьменніцкаму цэху" і яе прычыны.

Творчасць А. Мрыя ў нацыянальным і сусветным літаратурным кантэксце ("Прамова Мялешкі", К. Крапіва, Ф. Рабле, М. Салтыкоў-Шчадрын, М. Булгакаў, І. Ільф і Я. Пятроў, М. Зошчанка, А. Платонаў і інш.).

Традыцыі А. Мрыя ў пазнейшай беларускай прозе.

## 2.8. УЛАДЗІМІР ЖЫЛКА
(1900—1933)

Яркасць і непаўторнасць творчай індывідуальнасці У. Жылкі. Асоба паэта і яго лёс. Біяграфія.

Адметнасць паэтычнай манеры пісьма. Выданне паэмы "Уяўленне" (1923), зборніка вершаў "На ростані" (1924) у Вільні. Сімвалізм, гукапіс, рытмічныя кантрасты ў паэзіі, эмацыянальнасць і настраёвасць у творах. Своеасаблівасць эсхаталогіі, містыкі, "недагаворанасць" у паэтычнай споведзі. Спалучэнне мадэрнісцкіх, постмадэрнісцкіх і рэалістычных тэндэнцый у творчасці.

Зборнік "З палёў Заходняй Беларусі" (1927). Наватарства паэзіі У. Жылкі.

Стылёвая адметнасць твораў. Ускладненасць, філасафізм паэтычнага мыслення. Маляўнічасць, мілагучнасць, багацце інструментоўкі ў вершах паэта. Хараство і непаўторнасць паэзіі У. Жылкі.

"Тастамент" — своеасаблівы творчы запавет паэта. Выяўленне асабістых пачуццяў, ідэйна-мастацкая характарыстыка твора.

Паэзія У. Жылкі ў нацыянальным і еўрапейскім літаратурным кантэксце (М. Багдановіч, У. Дубоўка, П. Верлен, І. Волькер, О. Уайльд, Ш. Бадлер, А. Блок, інш.).

Выступленні паэта ў публіцыстыцы, крытыцы, прозе. Эпісталярый.

Роля У. Жылкі ў жанрава-стылёвым узбагачэнні беларускай паэзіі і ўзмацненні яе сувязей з еўрапейскай сусветнай паэтычнай традыцыяй.

Ацэнка паэзіі У. Жылкі ў беларускай крытыцы і літаратуразнаўстве. Месца паэта ў гісторыі беларускай літаратуры.

## 2.9. ЛУКАШ КАЛЮГА

(1909—1937)

Лукаш Калюга (Канстанцін Пятровіч Вашына) — адзін з найбольш таленавітых беларускіх празаікаў 20—30-х гг. Біяграфія пісьменніка, яго надзвычай кароткі і трагічны творчы лес.

Навелістыка Л. Калюгі як узор так званай нораваапісальнай прозы. Паэтызацыя "нефункцыянальнага чалавека" ў эпоху паэтызацыі функцыянальнасці ("Лук'ян — каперацiўскi сабака", 1928). Узвышэнскія эстэтычныя прынцыпы, іх рэалізацыя ў творах пісьменніка. Арыентацыя на народнае жыццё і народную мараль, іх паэтызацыя і свядомае адстойванне самакаштоўнасці вясковага жыцця.

Глыбокі аналіз сацыяльных і псіхалагічных працэсаў грамадства ў аповесці "Ні госць, ні гаспадар" (1928). Асаблівасці мовы і стылю (лексічныя наватворы, аўтарскія фразеалагізмы, майстэрства дэталі, інш.).

Мастацкія прынцыпы паказу народнага жыцця ў аповесці "Нядоля Заблоцкіх" (1931). Зварот аўтара да свету народных паданняў, забабонаў звычаяў, прыкмет, мастацкая мэтазгоднасць такога звароту. Праекцыя жыцця дарэвалюцыйнага сялянства на сучасную пісьменніку рэчаіснасць. Падтэкставасць твора, элементы філасофскай прыпавесці ў "Нядолі Заблоцкіх". Багацце чалавечых тыпаў і характараў, адлюстраваных у аповесці. Гумар у творы, моўныя сродкі камізму (іронія, каламбур, параўнанні, інш.).

Незавершаныя творы Лукаша Калюгі, напісаныя ім у турме і ссылцы (раман "Пустадомкі", аповесці "Дзе косці мелюць", "Зэнка малы ніколі не быў", "Зоры вам вядомага горада").

Проза Л. Калюгі ў кантэксце нацыянальнай і сусветнай літаратуры (Я. Колас, К. Чорны, М. Зарэцкі, А. Мрый, М. Гогаль, Я. Гашак, Р. Ралан, інш.). Ацэнка яго асобы і творчасці К. Чорным, М. Гарэцкім, Я. Скрыганам, М. Лужаніным, іншымі пісьменнікамі і літаратуразнаўцамі.

## 2.10. ЯНКА МАЎР

(1883—1971)

Жыццё і творчы шлях Янкі Маўра (Івана Міхайлавіча Фёдарава).

Янка Маўр — адзін з пачынальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры. Стварэнне ім новых жанраў — прыгодніцкага рамана, прыгодніцкай аповесці, навукова-фантастычнай аповесці.

Экзатычны матэрыял аповесцей "Чалавек ідзе", "У краіне райскай птушкі", "Сын вады" (1928). Тэматыка твораў. Удалы сінтэз традыцый сусветнай прыгодніцкай класікі: таямнічасць, загадкавасць як спружына канфлікту, дынамізм дзеяння, выкарыстанне рэтраспекцыі. Шырокае прыцягненне пазнавальнага матэрыялу: апісанне флоры і фауны экзатычных краін, абрадаў і звычаяў туземных народаў. Арганічнае спалучэнне прыгодніцтва і пазнавальнасці.

Рэальная аснова сюжэта рамана "Амок" (1930), насычанасць твора жыццёва-канкрэтным матэрыялам (барацьба інданезійскага народа) і ў той

жа час шматлікімі прыгодніцкімі элементамі: трансфармацыямі раманнага часу, пераўвасабленнямі, паядынкамі, пагонямі, цудамі. Імкненне да псіхалагічнай нюансіроўкі персанажаў у рамане. Яркая публіцыстычнасць твора. Складаная структура рамана.

"Палескія рабінзоны" (1930) —надзённасць аповесці ў плане праблематыкі "чалавек — прырода". Жыццё прыроды як мера гармоніі, жыццё людзей — увасабленне хаосу. Магчымасць выхавання на матэрыяле твора патрыятычных пачуццяў і экалагічнай свядомасці чытачоў.

Педагагічнае і мастацкае наватарства аповесці "ТВТ" (1934): ліквідацыя хаосу, неўпарадкаванасці і ўстанаўленне гармоніі праз гульню, праз ініцыятыву саміх дзяцей. Рысы часу ў аповесці. Камічнае ў творы. Праца Я. Маўра над кнігай успамінаў дзяцей аб Вялікай Айчыннай вайне "Ніколі не забудзем" (1948).

Навукова-фантастычны твор "Фантамабіль прафесара Цылякоўскага" (1954). Арыгінальнасць творчай ідэі — магчымасць выкарыстання энергіі чалавечай думкі. Традыцыі сусветнай фантастычнай літаратуры ў творы.

Аўтабіяграфічная трылогія Я. Маўра "Шлях з цемры" (1971) — працяг традыцый аўтабіяграфічнай прозы ў сусветнай і беларускай літаратуры. Чалавек і гісторыя ў творы. Лірызм, іронія і самаіронія, гумар, дакладнае апісанне рэалій жыцця канца XIX — пачатку XX ст.

## *РАЗДЗЕЛ 3.* БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ 50-Х — 60-Х ГАДОЎ

Сярэдзіна 50-х гг. у гісторыі літаратуры і культуры як пачатак якасна новага перыяду развіцця. Уплыў грамадскай "адлігі" на абнаўленне мастацтва слова. Адыход літаратуры ад ілюстрацыйнасці, догмаў і схематызму.

Аднаўленне гістарычнай панарамы беларускай літаратуры. Рэабілітацыя рэпрэсаваных пісьменнікаў (Ц. Гартны, М. Гарэцкі, М. Чарот, Т. Кляшторны, У. Хадыка, М. Зарэцкі і інш.). Вяртанне да творчай дзейнасці У. Дубоўкі, Я. Скрыгана, А. Звонака, Я. Пушчы, С. Грахоўскага, М. Хведаровіча і інш. Спавядальныя матывы ў творах гэтых пісьменнікаў.

Ваенны вопыт і яго роля ў фарміраванні светапогляду, ідэйна-эстэтычных падыходаў І. Шамякіна, А. Кулакоўскага, А. Адамовіча, В. Быкава, І. Навуменкі, інш. Вайна ў жыцці і лёсах пісьменнікаў, на дзяцінства якіх прыпала вайна: В. Казько, Р. Барадулін, Б. Сачанка, В. Адамчык, А. Вярцінскі, Е. Лось, У. Лісіцын, інш.

Разгортванне літаратурнага працэсу ў 60-я гг., яго шматвектарнасць. Прыход у літаратуру новага пісьменніцкага пакалення — "філалагічнага" (І. Навуменка, У. Караткевіч, І. Чыгрынаў, Р. Барадулін, В. Адамчык, С. Гаўрусёў, У. Дамашэвіч, І. Пташнікаў, Е. Лось, М. Стральцоў, Я. Сіпакоў, А. Вярцінскі, П. Макаль, Н. Гілевіч, В. Зуёнак і інш.). "Шасцідзесятніцтва" як літаратурна-грамадскі рух і яго ўплыў на А. Адамовіча, В. Быкава і інш.

Светапогляднае абнаўленне беларускай літаратуры другой паловы 50-х — 60-х гг. Пераасэнсаванне жыцця, выяўленне сацыяльнага крытыцызму,

арыентацыя на гуманізм як асноватворны прынцып грамадскага ўладкавання. Узвышэнне ў літаратуры народных ідэалаў праўды, сумленнасці і справядлівасці. Матывы адказнасці перад гісторыяй і будучыняй, пафас сцвярджэння высокіх маральна-духоўных каштоўнасцей.

Эстэтычнае абнаўленне беларускай паэзіі. Крытычны і сатырычны пафас, публіцыстычная завостранасць слова ў грамадзянскай паэзіі. Маральныя імператывы часу, спалучэнне асабістага і грамадскага, сацыяльнага і гуманістычнага, надзённага і вечнага. Асабовасць і філасофская значнасць паэтычнай думкі ў творах П. Панчанкі, М. Танка, А. Куляшова, П. Макаля, А. Вярцінскага, А. Наўроцкага і інш. Арыгінальнасць светаўспрымання, псіхалагізм аўтарскага пачуцця, раскаванасць рытмікі ў тагачаснай лірычнай паэзіі. Асэнсаванне ў паэзіі анталагічных філасофскіх праблем, важных пытанняў духоўнага існавання народа. Раскаванасць асацыятыўнага і метафарычнага мыслення. Драматычнае гучанне ў паэзіі ваенных матываў (П. Панчанка, Н. Гілевіч, А. Пысін, С. Гаўрусёў, А. Вярцінскі, Р. Барадулін, інш.). Адраджэнне цікавасці да мінуўшчыны, актуалізацыя праблемы гістарычнай памяці. Рамантызацыя беларускай даўніны ў кнігах У. Караткевіча “Матчына душа” (1958), “Вячэрнія ветразі” (1960), “Мая Іліяда” (1969).

Шматграннае жанрава-тэматычнае і стылёвае развіццё прозы. Узмацненне аналітыка-даследчыцкіх магчымасцей беларускай прозы. Паглыбленне мастацка-псіхалагічнага аналізу ў творах Я. Брыля, І. Мележа, І. Шамякіна, В. Быкава, А. Кулакоўскага, В. Адамчыка, М. Стральцова і інш.

Росквіт беларускага рамана (І. Мележ, І. Шамякін, Я. Брыль, У. Караткевіч, М. Лобан, І. Пташнікаў і інш.). Раманны эпас як сведчанне маштабнасці мастацкай думкі, яе здольнасці спасцігаць глыбінныя пласты жыцця, маральна-духоўны і гістарычны вопыт народа. Хранікальна-эпічныя карціны рэчаіснасці. Шматграннасць адлюстравання жыцця ў творах І. Шамякіна (“Крыніцы”, “Трывожнае шчасце”, “Сэрца на далоні”, “Снежныя зімы”. Палессе, беларускі менталітэт і нацыянальны характар у раманах І. Мележа (“Людзі на балоце”, “Подых навальніцы”). Эпічнае адлюстраванне падзей, чалавек і гісторыя ў творах. Аналітычная глыбіня ў выяўленні псіхалогіі герояў. Адметнасць моўнага майстэрства І. Мележа. Філасофія гісторыі ў прозе У. Караткевіча (“Каласы пад сярпом тваім”, “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”).

Мастацкія набыткі ў жанры аповесці (І. Шамякін, В. Быкаў, А. Кулакоўскі, Я. Брыль, І. Пташнікаў, А. Карпюк, У. Дамашэвіч, І. Навуменка, А. Асіпенка, Б. Сачанка, інш.). Аналітызм прозы. Рост сюжэтнага майстэрства. Рамантызаваная версія мінулага ў творах У. Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха”, “Сівая легенда”. Беларуская аповесць: дынаміка мастацкіх структур, іх ускладненасць.

Багацце мастацкай навелістыкі. Эстэтычная арыгінальнасць апавяданняў (І. Шамякін, Я. Брыль, Б. Сачанка, І. Навуменка, М. Стральцоў, В. Адамчык, І. Чыгрынаў, інш.). Лірызацыя прозы, суб’ектывізаваны стыль

пісьма (рэфлексіі, плынь свядомасці, рэтраспекцыі і інш.). Пашырэнне моўна-выяўленчых магчымасцей беларускай прозы.

Жанр мініяцюры ў творчасці Я. Брыля (зборнікі "Жменя сонечных промняў", "Свае старонкі"). Эмацыянальна-філасофская глыбіня светабачання. Тыпалогія брылёўскай лірычнай прозы (З. Бядуля, А. Чэхаў, І. Тургенеў, А. Купрын, У. Салаухін і інш.).

Вайна і вёска як дзве вядучыя ідэйна-тэматычныя лініі ў беларускай прозе. Сюжэтныя сітуацыі, характары, маральная завостранасць канфліктаў у прозе пра вайну. Узмацненне рэалістычна-псіхалагічных асноў ваеннай прозы. Якасна новая ступень гістарызму.

Актуалізацыя надзённых праблем развіцця драматургіі (артыкулы К. Крапівы "Аб сатырычнай камедыі", "Канфлікт — аснова п'есы"). Востраправблемны характар п'есы А. Макаёнка "Выбачайце, калі ласка!" (1953). Узмацненне дзейснасці сатыры. Паглыбленне канфліктнага дзеяння.

Праблемна-тэматычныя і жанравыя абсягі драматургіі другой паловы 50-х — 60-х гг. Драматызм падзей, праўда пра лёс чалавека на вайне ў п'есах К. Крапівы, К. Губарэвіча, інш. Гісторыка-рэвалюцыйная і грамадска-палітычная тэматыка ў драматургічнай творчасці: феномен часу, тыпалогія, асаблівасці (К. Губарэвіч, А. Маўзон, П. Васілеўскі, Я. Рамановіч, інш.). Сямейна-бытавая драма і бытавая камедыя. Маральна-этычная праблема чалавечых узаемаадносінаў у п'есах І. Мележа "Пакуль вы маладыя" (1957), А. Дзяленздіка "Выклік багам" (1965), "Грэшная любоў" (1967), А. Макаёнка "Зацюканы апостал" (1969) і інш. Развіццё беларускай камедыяграфіі (А. Макаёнак, І. Шамякін, І. Козел, А. Дзялендзік, інш.).

## 3.1. МАКСІМ ТАНК
(1912—1995)

Максім Танк (Яўген Іванавіч Скурко) як постаць эпахальная, выключная і непаўторная. Біяграфія паэта. Удзел у нацыянальна-вызваленчай барацьбе заходнебеларускага народа і ў літаратурным руху 30-х гг. Значнасць яго асобы ў грамадска-культурным жыцці Беларусі другой паловы XX ст.

Ранняя ідэйна-палітычная сталасць і хуткае творчае станаўленне. Традыцыі фальклору, беларускай, рускай, польскай, украінскай, увогуле еўрапейскай культуры ў яго паэзіі. Эвалюцыя ў зборніках паэзіі "На этапах" (1936), "Журавінавы цвет" (1937), "Пад мачтай" (1938). Адметнасць мастацкага свету і наватарства паэта.

Шматграннасць унутранага свету лірычнага героя ў заходнебеларускай лірыцы. Арганічнае паяднанне ў ёй лірычнага, публіцыстычнага і філасофскага пачаткаў. Асаблівасці паэтыкі.

Пошукі і эстэтычныя адкрыцці ў ліра-эпасе. Героіка-рамантычны характар паэмы "Нарач" (1937). Праблематыка і вобразы. Мастацкая дасканаласць лірычных адступленняў і пейзажных малюнкаў. Асаблівасці формы. Літаратурны кантэкст (III частка "Дзядоў" А. Міцкевіча, "Адвечная

песня" Я. Купалы, "Дванаццаць" А. Блока, "Босыя на вогнішчы" М. Чарота, "Слова пра Якуба Шэлю" Б. Ясенскага).

Загадкавасць кахання і дакладнасць характараў у паэме "Журавінавы цвет" (1937). Жанрава-стылёвыя асаблівасці.

Жыватворнасць гераічных легендаў пра асілкаў, волатаў, павучальнасць вопыту народнага змагання і традыцыі былінна-казачнага эпасу ў паэме "Сказ пра Вяля" (1937).

Праблема ролі мастака ў грамадстве, роздум пра неўміручасць і сілу сапраўднага мастацтва ў "Казцы пра Музыку" (1938). Фальклорныя традыцыі і беларускі літаратурны кантэкст ("Музыка" М. Багдановіча, "Курган" Я. Купалы, "Сымон-музыка" Я. Коласа). Канкрэтна-гістарычны і фальклорна-легендарны падыходы ў паэме "Кастусь Каліноўскі" (1938).

"Лісткі календара" (1935—1939) як унікальная кніга дзённікава-дакументальнай прозы М. Танка.

Паэзія М. Танка перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Патрыятычны пафас лірыкі. Паэма "Янук Сяліба" (1943). Галоўныя героі. Праблема грамадзянскага і асабістага. Наяўнасць героіка-рамантычных прыкмет, фальклорных рыс і выдаткі апавядальнасці.

Выпрабаванне і сіла таленту М. Танка ў паэзіі першага пасляваеннага дзесяцігоддзя: зборнікі "Каб ведалі" (1948), "На камні, жалезе і золаце" (1951), "У дарозе" (1954). Мастацкая дасканаласць лепшых вершаў і балад пасляваеннага часу. Зварот паэта да гісторыі роднага краю, фальклорных вобразаў і сюжэтаў. Услаўленне чалавека-працаўніка. Выяўленне інтымных пачуццяў.

Прыгажосць, сіла і неўміручасць народнага мастацтва ў паэме "Люцыян Таполя" (1946).

Паглыбленне гуманістычнага пафасу ў лірыцы М. Танка другой паловы 50-х-80-х гг., узмацненне яе філасафічнасці, пашырэнне тэматыкі і сродкаў мастацкага выяўлення ў кнігах "След бліскавіцы" (1957), "Мой хлеб надзённы" (1962), "Глыток вады" (1964), "Перапіска з зямлёй" (1967), "Хай будзе святло" (1972). Духоўна-творчае разгарненне таленту паэта. Асноўныя канцэпты і матывы ў кнігах "Нарачанскія сосны" (1972), "Дарога, закалыханая жытам" (1976), "Прайсці праз вернасць" (1979), "За маім сталом" (1984).

Міфалогія ў мастацкім свеце М. Танка. Сімволіка колеру, эстэтыка слова ў вершах паэта. Шматграннасць лірычнага выяўлення. Інтэлектуалізацыя і высокая культура творчасці. Музычна-гукавыя сродкі ў яго паэзіі. Погляд на свет і творы мастацтва вачыма селяніна і высокадасведчанага інтэлігента ў лірыцы М. Танка. Глыбока народны, нацыянальны і універсальны характар паэзіі М. Танка. Паэма "Мікалай Дворнікаў" (1978). Дакументалізм і мастацкая фантазія аўтара ў абмалёўцы вобраза Дворнікава. Адметнасць сюжэту і кампазіцыі твора.

Разнастайнасць жанраў і формаў, спалучэнне нацыянальных традыцый верша і наватарскіх рашэнняў (вершы сілаба-танічныя, танічныя, дольнік, санет, катрэн і інш.). Эстэтычная спецыфіка танкаўскага верлібра.

Максім Танк як паэт-філосаф. Унутраная засяроджанасць, інтэлектуальнасць і медытатыўнасць яго творчасці другой паловы 80—90-х гг. (зборнікі “Збор калосся”, 1989; “Мой каўчэг”, 1994; “Errata”, 1996). Шматграннасць творчай індывідуальнасці М. Танка.

Сатырычныя творы паэта (зборнік “Селядцы з вершамі”, 1966).

Паэзія М. Танка для дзяцей.

Пераклады. Дзённікі, публіцыстыка і літаратурная крытыка паэта як мастацкі дакумент часу.

Творчасць М. Танка ў нацыянальным і сусветным літаратурным кантэксце (Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, У. Маякоўскі, Б. Ясенскі, У. Бранеўскі, Ч. Мілаш, У. Сасюра, Ю. Марцінкявічус, інш.).

Пераклады твораў М. Танка на іншыя мовы.

Бібліяграфія арыгінальных выданняў. М. Танк у крытыцы і літаратуразнаўстве.

## 3.2. ПЯТРУСЬ БРОЎКА
(1905—1980)

П. Броўка як прызнаны і вядомы пісьменнік. Біяграфія. Лірычныя творы канца 20-х гг. Станаўленне творчай індывідуальнасці паэта ў 30-я гг. Ідэйна-эстэтычныя пошукі ў зборніках “Гады, як шторм” і “Прамова фактамі” (абодва — 1930), “Цэхавыя будні” (1931). Маладнякоўскі стыль паэтычнага пісьма. Даваенныя паэмы П. Броўкі “Прамовы фактамі” (1930), “Праз горы і стэп” (1932), “1914” (1933), “Кацярына” (1938), іх тэматыка, рытміка-стылёвыя асаблівасці. Эстэтычныя вартасці і недахопы твораў.

Паглыбленне эстэтыка-выяўленчага пачатку, лірычнага “я” ў кнізе “Шляхамі баравымі” (1940). Узмужненне таленту П. Броўкі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Патрыятычны, вызваленчы пафас яго лірычных і публіцыстычных твораў. Пераасэнсаванне традыцыйнага нацыянальна-паэтычнага матыву сяўбы ў вершы “Будзем сеяць, беларусы!”. Гераічнае мінулае як крыніца мацавання народнага духу. Легендарны пачатак у вершы-баладзе “Кастусь Каліноўскі”. Гераічнае і трагічнае ў аўтарскай трактоўцы вайны, услаўленне народнага подзвігу. Дакументальна-біяграфічная аснова “Паэмы пра Смалячкова” (1942). Паэма-кантата “Беларусь” (1943), яе героіка-змагарніцкі і патрыятычны пафас. Лірычныя паэмы “Ясны кут” (1944) і “Паланянка” (1943), іх настраёвасць і мастацкія асаблівасці. Канцэпцыя герояў, рэалістычнае адлюстраванне карцін і дэталяў ваеннага часу. Пейзаж і вобразы-сімвалы ў творах. Рытмічны малюнак і адметнасць рыфмоўкі. Народна-песенныя інтанацыі.

Паэзія П. Броўкі першага пасляваеннага дзесяцігоддзя: тыповыя настроі і матывы. Разгарненне паэтычнага таленту П. Броўкі ў другой палове 50-х — 60-я гг. Выхад кніг паэзіі “Пахне чабор” (1959), “Далёка ад дому” (1960), “Між чырвоных рабін” (1969), “Калі ласка” (1972) і інш. Ідэйна-тэматычнае і жанравае ўзбагачэнне творчасці П. Броўкі. Узмацненне сацыяльна-маральнай крытычнасці думкі, паглыбленне гуманістычнага пафасу яго паэзіі. Прачуласць, мяккасць і цеплыня голасу паэта. Тонкі

лірызм у выяўленні настрояў і перажыванняў у вершах “Пахне чабор...”, “Як ліст дубовы...”, “Ты, мая пчолка”, “Калі надыдзе час спачыну...” і інш. Майстэрства вобразнасці і паэтычнага гукапісу. Эмацыянальная кранальнасць, мілагучнасць верша “Александрына”. Лірычна-камерны характар іншых твораў пра каханне (“Ты мне здавалася адзінай...”, Пераклічка маральна-этычных разважанняў паэта з біблейскімі запаветамі, традыцыямі гуманістычнай літаратуры. Матывы філасафічнасці.

Паэма-рэквіем “Голас сэрца” (1960) як адзін з лепшых эпічных твораў 60-х гг. Гісторыя напісання. Вобраз маці, сімвалічная яго абагуленасць. Антываенная накіраванасць твора.

Творы паэта як яскравыя дакументы сваёй эпохі.

## 3.3. АРКАДЗЬ КУЛЯШОЎ
(1914—1978)

Жыццёвы і творчы шлях. Умовы фарміравання таленту.

Ранняя лірыка А. Куляшова. Касмічныя матывы ў творах канца 20-х гг. (“Як дзень адыходзіць...”, інш.).

Пошук сродкаў эпічнасці ў паэмах 30-х гг.: “Антон Шандабыла” (1933), “Баранаў Васіль” (1937), “Песня аб разведчыках” (1938). Уплыў паэмы А. Твардоўскага “Краіна Муравія” на творы А. Куляшова 30-х гг. Мажорны лад ліра-эпічнай паэмы “У зялёнай дуброве” (1938—1939). Драматызм паэмы “Хлопцы апошняй вайны” (1940).

Поспех нізкі вершаў “Юнацкі свет” (1938—1940). Радасны, абжыты, створаны для шчасця юнацкі свет, адначасова і рэальны, і рамантызаваны. Лепшыя вершы даваеннага часу: “Бюро даведак”, “Мая Бесядзь”, “Плыла, цалавалася хмара з зямлёй...” як падвядзенне вынікаў і адначасова вызначэнне праграмы на будучае.

Ваенная лірыка А. Куляшова — песні подзвігу і гераізму, любові і нянавісці. Трагічнае і лірычнае ў баладзе “Над брацкай магілай”. Праблема выбару ў “Баладзе пра чатырох заложнікаў”. Асацыятыўнасць узнаўлення свету Айчыны ў “Лісце з палону”. Высокая ідэйнасць верша “Камсамольскі білет”. Праблема абавязку ў ваеннай лірыцы. Наватарства ў распрацоўцы жанру балады. Разнастайнасць інтанацый у баладах: апісальнасць і лаканізм, “рубленыя” фразы і элементы дыялога.

Шэдэўр паэтычнага эпасу аб Вялікай Айчыннай вайне — паэма “Сцяг брыгады” (1942). Моманты аўтабіяграфізму ў творы. Асаблівасці эпічнай формы. Нацыянальныя архетыпы, сімвалічнасць вобразаў паэмы. Падзейна-сюжэтны бок твора. Псіхалагічныя характарыстыкі асноўных герояў: Рыбкі, Заруднага, Ворчыка. Наватарства ў сюжэце і кампазіцыі: злучэнне рыс паэмы-дзённіка з апісаннем падарожжа. Роля паўтораў (пра дубовы лісток і інш.). Поліфанізм твора. Асаблівасці рытмікі, прасодыі. Наватарскія мастацкія сродкі (выкарыстанне замоў, сродкаў драмы і інш.)

Умоўна-казачны свет паэмы “Прыгоды цымбал” (1944). Развіццё тэмы роднага мастацтва, што ідзе ад М. Багдановіча, ад “Сымона-музыкі” Я. Коласа. Займальна-прыгодніцкія элементы твора. Праўдзівасць малюнкаў

жыцця ў паэме “Дом № 24” (1944). “Перамога” (1944) — паэма аб жыцці і смерці. Рэальнае і ўмоўнае ў творы.

Тэмы і вобразы паэзіі 50-пачатку 60-х гг.

Перакладчыцкая дзейнасць А. Куляшова на мяжы 50—60-х гг.; выдатныя пераклады М. Лермантава.

Канцэптуальная навізна “Новай кнігі” (1964). Маштабнасць і філасафізм думкі. Вечныя каштоўнасці ў творах паэта (“Стаю і з пачуццём неўтаймаваным....”, “Ты згасіш сонца, час, але не згіне....”, інш.). Разгорнутая метафарычнасць з’яў. “Свабода лірычнага самавыяўлення, нязмушанасць тону, смеласць нечаканага збліжэння строгай думкі і простай сардэчнасці” (А. Твардоўскі) у “Новай кнізе”. Шматмернасць бачання. Навізна прыёмаў.

Непаўторнасць куляшоўскага стылю, яго інтэлектуальная насычанасць і рытміка-інтанацыйныя асаблівасці.

Лёс Зямлі, адказнасць за яе ў паэме “Цунамі” (1968). Уласная міфатворчасць паэта — акіянскае падарожжа Яго і Яе ў пошуках сховаў ад цывілізацыі.

Ліра-эпічная паэма “Далёка да акіяна” (1972) — аповед пра лёс пакалення, веку, вяртанне да вытокаў. Коласаўскія традыцыі ў творы. Тры кругі ў жыццяпісе эпохі: бацькі, сябры, каханая. Паэтызацыя бацькоўскай працы, рэквіем па сябрах, трагізм кахання. Вобраз Алесі — скразны ў паэзіі А. Куляшова. Аб’ёмнасць, маштабнасць падзей, адлюстраваных у паэме. Асаблівасці кампазіцыі: мантаж, застаўкі, адступленні, філасофскія развагі. Філасофская напоўненасць твора.

Ліра-філасофская паэма “Варшаўскі шлях” (1973). Тыпалагічныя паралелі з паэмай А. Твардоўскага “За даллю — даль”.

Драматычная паэма “Хамуціус” (1975), увасабленне ў ёй вобраза К. Каліноўскага. Сацыяльныя матывы ў творы. Майстэрства стварэння дыялогаў. Асаблівасці вершаванай стылістыкі.

Канкрэтыка жыцця і філасафічнасць, інтэлектуальны пошук у кнігах паэзіі “Сасна і бяроза” (1970), “Хуткасць” (1976). Матывы смутку і тугі ў нізцы вершаў “Маналог”, асэнсаванне паэтам лёсу сяброў З. Астапенкі і Ю. Таўбіна.

Пераклад А. Куляшовым класічных твораў сусветнай літаратуры — “Энеіды” І. Катлярэўскага, “Спеў аб Гаяваце” Г. Лангфэла.

Праца А. Куляшова над сцэнарыямі мастацкіх кінафільмаў.

Значэнне творчасці А. Куляшова.

## 3.4. ЯНКА БРЫЛЬ
( 1917 - 2006)

Жыццё і творчасць. Адлюстраванне заходнебеларускай рэчаіснасці ў ранніх творах. Складанасць становішча беларусаў пад уладай буржуазнай Польшчы (аповесці “Сірочы хлеб”, “У сям’і”). Аўтабіяграфічныя элементы твораў.

Партызанская барацьба супраць фашызму ў кнізе “Нёманскія казакі” (1947). Тэма народнага подзвігу ў гады Вялікай Айчыннай вайны

у апавяданнях Я. Брыля (“Мой зямляк”, “Казачок”, “Адзін дзень”, “Сцежка-дарожка”, “Глядзіце на траву”, “Апоўначы” і інш.). Выкрыццё ў творах антычалавечай філасофіі фашызму (“Memento mori”, “Ты мой найлепшы друг”, “Дваццаць”, “Маці” і інш.).

Майстэрства Янкі Брыля-апавядальніка. Ёмістасць мастацкай дэталі, значэнне эмацыянальна-ацэначнага слова, багацце яго адценняў. Спалучэнне лірызму і псіхалагізму, пластычнасць малюнкаў (“Гуртавое”, “Глядзіце на траву”, “Яшчэ раз першы снег” і інш.). Гумар і іронія ў стылёвай сістэме. Самабытнасць фарбаў, народнасць погляду на свет.

Аповесць “У Забалоцці днее” (1950). Ідэйная накіраванасць твора, праблематыка. Элементы святочна-захопленага, ідылічнага ўспрымання рэчаіснасці. Вобраз Васіля Сурмака. Эпічнае і лірычнае ў раскрыцці падзей, прыёмы тыпізацыі і індывідуалізацыі герояў.

Аповесць “На Быстранцы” (1955). Грамадзянская пазіцыя аўтара ў аналізе негатыўных з’яў жыцця. Канцэпцыя прызначэння літаратуры, ролі пісьменніка ў грамадстве, ролі навукі ў яго развіцці. Паэтызацыя кахання.

Раман “Птушкі і гнёзды” (1963). Творчая гісторыя. Аўтабіяграфічныя элементы. Тэма Радзімы і яе мастацкае асвятленне ў рамане. Вобраз Алеся Руневіча. Загартоўка героя ва ўмовах цяжкіх выпрабаванняў вайны, палону. Выкрыццё ў рамане фашызму, чалавеканенавісніцкай ідэалогіі. Гістарызм твора, аналітычнасць эстэтычнага даследавання, глыбіня філасофскай думкі, эпічнасць і лірызм. Прыёмы і сродкі тыпізацыі нацыянальных характараў у творы. Асаблівасці стылю.

Стыхія народнага жыцця ў аповесці “Ніжнія Байдуны” (1975). Яскравыя мастацкія вобразы-тыпы. Роля лірычных адступленняў і аўтарскага каментарыя. Прыём карнавалізацыі, сродкі стварэння камізму ў творы.

Лірыка-філасофская аповесць “Золак, убачаны здалёк” (1978). Вобразы, мастацкая структура і стылістыка аповесці.

Я. Брыль як майстар лірычнай мініяцюры. Шматтэмнасць лірычных запісаў і мініяцюр з кніг “Жменя сонечных промняў” (1965), “Вітраж” (1972), “Свае старонкі” (1951—1979), “Сёння і памяць” (1985), “На сцежцы — дзеці” (1988), “Пішу як жыву” (1994), “Вячэрняе” (1994), “Дзе скарб ваш” (1997), “Сцежкі, дарогі, прастор” (2001), “З людзьмі і сам-насам” (2003), “Блакітны зніч” (2004) і інш. Асоба аўтара ў мініяцюрах, яго гумар, лаканізм, дасціпнасць, афарыстычнасць мовы. Эстэтычныя погляды, грамадзянскае аблічча, асаблівасці мастацкага мыслення Я. Брыля ў яго дзённікавых запісах, іх месца ў творчай біяграфіі аўтара і ў гісторыі беларускай літаратуры.

Стварэнне разам з А. Адамовічам і У. Калеснікам кнігі “Я — з вогненнай вёскі” (1975). Гістарызм твора.

Аўтабіяграфізм аповесці “Муштук і папка” (1990). Матыў балючай памяці. Гісторыя адной сям’і як адбітак агульнанароднай трагедыі.

Я.Брыль – перакладчык.

Значэнне творчай дзейнасці Брыля для гісторыі беларускай літаратуры, для развіцця лірычнай плыні ў шматнацыянальнай савецкай прозе. Уплыў творчасці пісьменніка і яго асобы на сучасны літаратурны працэс.

## 3.5. ПІМЕН ПАНЧАНКА
(1917—1995)

Асоба П. Панчанкі як паэта-грамадзяніна. Жыццёвая і творчая біяграфія.

Зборнікі "Упэўненасць" (1938) і "Вераснёвыя сцягі" (1940), увасабленне ў іх тыповага настрою і пачуццяў пакалення 30-х гг. Каханне, радзіма, прырода, праца — асноўныя тэмы даваеннай творчасці паэта. Адметнасць самавыяўлення ў лепшых вершах: пранікнёная мелодыка радка, вобразная яркасць слова ("Журавы", "Восень", "У навальніцу" і інш.). Філасофскі алегарызм і падтэкставасць верша "Зубр".

Удзел П. Панчанкі ў Вялікай Айчыннай вайне. Агітацыйна-заклікальны пафас прамаўлення. Вершаваная сатыра паэта. Зборнікі "Дарога вайны" (1943) і "Далёкія станцыі" (1945) — услаўленне велічы і няскоранасці народнага духу, сцвярджэнне ідэі свабоды і адраджэння Беларусі. Глыбіня выяўлення чалавечых пачуццяў у вершах "Кожны з нас прыпасае Радзімы куток...", "Сінія касачы", "Будуць вечна сады расцвітаць...", "Лес асенні глуха гудзе..." і інш. Героіка-драматычны пафас балады "Герой". Вобразная і ідэйная пераклічка верша "Курганы" са славутым "Словам аб палку Ігаравым".

Адметнасць вершаванага цыкла "Іранскі дзённік" (1944—1945). Раскрыццё народнага побыту, экзотыкі і хараства краявідаў паўднёвай краіны "Караван" і інш.).

Творчая дзейнасць П. Панчанкі пасля дэмабілізацыі. Выхад паэтычных зборнікаў "Гарачыя вятры" (1947), "Вершы" (1948), "Прысяга" (1949), "За шчасце, за мір!" (1950). Адбітак часу ў творах паэта. Матывы перамогі, мірнага жыцця, стваральнай працы савецкіх людзей.

Другая палова 50-х — 60-я гг. — уздым у творчасці П. Панчанкі. Ідэйна-светапоглядныя змены і іх адлюстраванне ў творах паэта. Крытычная пераацэнка зробленага ("Анкета"). Творчая актыўнасць і грамадзянская мужнасць П. Панчанкі. Выхад зборнікаў "Шырокі свет" (1955), "Кніга вандраванняў і любові" (1959), "Нью-Йоркскія малюнкі" (1960), "Тысячы небасхілаў" (1962), "Пры святле маланак" (1966) і інш. XX стагоддзе ў адлюстраванні паэта: грамадскія падзеі, сацыяльныя праблемы, пошукі маральнага ідэалу, публіцыстычная завостранасць твораў. Сацыяльна-маральны імператыў часу ў вершы "Сумленне". Сатырычная скіраванасць творчасці ("Прыстасаванцы", "Трэснула, грукнула..." і інш.). Выяўленне пачуцця любасці да роднай мовы, сыноўняя трывога за яе лёс ("Родная мова").

Спавядальны лірызм, тонкасць эстэтычных уражанняў у пейзажнай і інтымнай лірыцы. Выяўленне хараства роднага ўлоння, агульнасці, злітнасці лёсу чалавека і прыроды ("Рабінавы гай", "На Палессі восень...", "Асеннімі

дажджамі заліло…”, “Паэма майго лесу” і інш.). Настраёвасць паэтычных пейзажаў, музыка слова ў вершах паэта. П. Панчанка як майстар маляўнічага эпітэта, метафарычнага жывапісу. Зрокавыя і гукавыя вобразы ў вершы “Белыя яблыні”, яго рытміка-інтанацыйны лад. Міфасемантыка колеру, багацце паралелізмаў у прыродаапісаннях паэта, лірыка-філасофская заглыбленасць аўтарскай думкі.

Асноўныя вобразы і матывы, жанравая разнастайнасць зборнікаў “Снежань” (1972), “Крык сойкі” (1976), “Вячэрні цягнік” (1977), “Лясныя воблакі” (1985). Заключны этап творчасці (з сярэдзіны 80-х гг.). Тэматычна-праблемная навізна кніг “І вера, і вернасць, і вечнасць” (1986), “Горкі жолуд” (1988), “Высокі бераг” (1993). Кампазіцыйныя і мастацкія асаблівасці

Матывы віны, дакору і пакаяння ў паэзіі другой паловы 80-х — 90-х гг. Прароцтвы і папярэджванні пра небяспеку маральнай дэградацыі, паглынання змрочнымі сіламі ўсяго светлага, чалавечага (“Чорныя дзіркі”, “Не раз мы пад крывавымі сцягамі...” і інш.). Развагі пра адраджэнне чалавечага ў чалавеку, пра жыццё, вартае памяці тых, хто загінуў на вайне. Думкі пра родную мову, бацькоўскую зямлю, працу, захаванне традыцый народнай этыкі і маралі (“Беларуская мова”, “Не адцураюся, не адракуся”, “Зямля ў мяне адна”, “Развітанне” і інш.).

П. Панчанка як паэт-філосаф. Экзістэнцыяльныя матывы ў яго паэзіі. Непрыманне абсурду рэчаіснасці, бездухоўнасці, разуменне трагічнасці чалавечага быцця.

Экалагізм мыслення П. Панчанкі. Эвалюцыя поглядаў паэта на прыроду: ад эстэтызацыі пейзажу да натурфіласофскага светапазнання. Лірычная паэзія прыроды П. Панчанкі: аўтарскія рэфлексіі і медытацыі. Лейтматывы жыта, зор, сонца, жаўранка і інш. Маральна-гуманістычны характар аўтарскай думкі. Асуджэнне варварскіх, бяздумна-спажывецкіх адносінаў да “зялёнага свету”. Узмацненне трагедыйнасці гучання вершаў на экалагічную тэматыку пасля чарнобыльскай катастрофы. Міфавобразы пячоры і ракі нябыту ў вершы “Аб самым смачным…”. Абвостранае разуменне страты гармоніі і суладнасці ў сучасным свеце, пазмрачнеласць фарбаў, мінорнасць інтанацый у творах паслячарнобыльскага і постсавецкага часу.

Мастацкая сістэма П. Панчанкі ў кантэксце традыцый нацыянальнай і славянскіх літаратур (Я. Купала, Я. Колас, Ф. Дастаеўскі, У. Маякоўскі і інш.). Уплыў П. Панчанкі на творчасць сучасных паэтаў (Г. Бураўкін, С. Законнікаў, С. Панізнік і інш.).

### 3.6. ІВАН МЕЛЕЖ
(1921—1976)

Біяграфія. Жыццёвыя ўмовы, літаратурныя традыцыі і ўласны досвед у фарміраванні асобы І. Мележа.

Пачатак творчай працы. Ваенныя дзённікі і запісныя кніжкі. Майстэрства псіхалагічнага аналізу ў ранніх апавяданнях (“Сустрэча”, “У завіруху”, “Такі кароткі водпуск”). Мастацкія набыткі, складанасці

творчага росту (аповесць "Гарачы жнівень", 1946; апавяданні "Перад навальніцай", "Павел прыехаў", інш.). Асаблівасці паказу жыцця вёскі ў першыя пасляваенныя гады.

Раман "Мінскі напрамак" (1947—1953, 1967—1973). Творчая гісторыя. Сюжэтна-кампазіцыйная структура твора. Панарамнасць і шматпланавасць пры апісанні вызвалення Беларусі ў красавіку—ліпені 1944 г. Узнаўленне духу часу і канкрэтных гістарычных асоб (вобраз І. Д. Чарняхоўскага). Уплыў на асаблівасці рамана грамадскіх і эстэтычных абставін другой паловы 40-х — пачатку 50-х гадоў.

Пошукі і творчыя набыткі І. Мележа-празаіка ў сярэдзіне 50-х гадоў (апавяданні "У гарах дажджы", 1954; "Спатканне за горадам", 1955; аповесці "Блізкае і няблізкае", "Дом пад сонцам", абедзве — 1954). Мастацкая дасканаласць, заглыблены псіхалагізм, эпічная танальнасць і лірызм гэтых твораў. Іх значэнне для будучых адкрыццяў празаіка. Нарысы пісьменніка "Паездка ў Прагу" (1955) і "Ліпень у дарозе" (1956).

Драматургія І. Мележа, яе праблематыка, жанравыя асаблівасці і месца ў творчасці пісьменніка. П'есы "Пакуль маладыя" (1955), "Дні нараджэння" (1957), "У новым доме" (1957, 1960) у кантэксце тагачаснай літаратуры.

"Палеская хроніка" як галоўная, дарагая і запаветная кніга І. Мележа, твор пра родны палескі край. Творчая гісторыя. Прататыпы, аўтабіяграфічнасць твора. Канцэпцыя жыцця і чалавека. Выяўленне маральна-этычнага вопыту народа. Натурфіласофія вяскова-сялянскага побыту. Глыбіня і непаўторнасць, шматграннасць і маштабнасць вобразаў Васіля і Ганны. Духоўная веліч, прыгажосць і шматграннасць чалавека ў яго паўсядзённых клопатах, каханні, любові да зямлі, імкненні зразумець сутнасць жыцця і свайго месца ў ім. Канцэптуальнасць, жыццёвая праўдзівасць і мастацкая змястоўнасць вобраза Апейкі. Гуманістычная сутнасць і трагедыйнасць яго асобы.

Грунтоўнасць аналітычнага, эпічнага пісьма, лірычнасць, паэтычнасць аўтарскага стылю. Псіхалагічная індывідуалізаванасць у паказе характараў. Глыбіня раскрыцця чалавечых узаемаадносін. Адметнасць мовы персанажаў, іх паўнакроўнасць і праўдзівасць. Дасканаласць сюжэта і кампазіцыі. Дакументальнасць і мастацкая інтуіцыя ў творы. Змястоўнасць мастацкай дэталі, партрэта, дыялогаў і маналогаў, лірычных адступленняў і пейзажаў, апісання масавых сцэн.

Думка народная ў трылогіі. Усведамленне пісьменнікам складанасці народнага лёсу. Сцвярджэнне духоўнай, маральнай трываласці і несмяротнасці народа ў матэрыялах да раманаў "За асакою бераг" і "Праўда вясны". "Палеская хроніка" як беларуская эпапея.

"Палеская хроніка" ў кантэксце мастацкага вопыту беларускай і сусветнай літаратур (Я. Колас, К. Чорны, Л. Талстой, А. дэ Бальзак, У. Рэймант, М. Шолахаў, А. Фадзееў, інш.).

Літаратурна-крытычныя выступленні. Кніга "Жыццёвыя клопаты" (1975), адзначаная Дзяржаўнай прэміяй БССР (1976).

Пераклады твораў І. Мележа на іншыя мовы.

Бібліяграфія арыгінальных выданняў. І. Мележ у крытыцы і літаратуразнаўстве.

## 3.7. АНДРЭЙ МАКАЁНАК
(1920—1982)

Андрэй Макаёнак як класік беларускай драматургіі, народны пісьменнік Беларусі (1977). Поспех яго п'ес на сцэнах СССР і замежжа.

Біяграфія пісьменніка. Умовы фарміравання таленту. Ваенныя выпрабаванні. А. Макаёнак як чалавек, яго markdown рознабаковыя здольнасці.

Першыя спробы ў драматургічным жанры, вострая надзённасць, камедыйна-сатырычная характарыстыка персанажаў у п'есах "Перад сустрэчай" (1950), "Жыццё патрабуе" (1950), "Крымінальная справа" (1951), "Першае пытанне" (1952).

Выдатнае дасягненне А. Макаёнка ў жанры сатырычнай камедыі — "Выбачайце, калі ласка!" (1954). Канфлікт твора, абумоўлены жыццёвымі калізіямі. Вобраз Каліберава — прынцыповая ўдача аўтара. Каліберaўшчына як сацыяльная з'ява, Каліберaў — тып кіраўніка, які ў рэшце рэшт праз некалькі дзесяцігоддзяў разбурыў вялікую дзяржаву. Моцкін — тып, што адрадзіўся ў асобах "перабудоўшчыкаў" канца 80 — пачатку 90-х гг. Мяккацеласць, слабавольнасць станоўчага героя Ягора Гарошкі. Гіпертрафіраванае развіццё рыс характару ўсіх персанажаў у далейшай савецкай гісторыі. У сувязі з гэтым выключная злабадзённасць камедыі.

"Каб людзі не журыліся" (1957): сцэнічны лёс камедыі. Канфлікт твора, абумоўлены праблемамі ў сельскай гаспадарцы. Вялікі грамадзянскі накал твора.

"Лявоніха на арбіце" (1961): асэнсаванне праблем савецкай рэчаіснасці пачатку 60-х гг. — так званай хрушчоўскай "адлігі". Неадназначнасць стаўлення аўтара да свайго героя — Лявона Чмыха. Сучаснае разуменне канфлікту твора. Камедыйнае майстэрства А. Макаёнка ў п'есе: формы камічнага, сюжэтныя перыпетыі, моўная характарыстыка персанажаў.

Творчыя пошукі А. Макаёнка ў канцы 60-х — 70-я гг. Эксперыменты драматурга.

"Зацюканы апостал" (1969) — "п'еса-загадка" (С. Лаўшук). Сінтэтычны жанр твора: трагікамедыя — сатыра — памфлет. Выкрыццё буржуазнасці, заходняга мяшчанства, пошласці ў творы. Характарыстыкі персанажаў: Таты, Мама, Дзеда. Амбівалентнасць вобраза Сына. Выключная сіла прадбачання ў п'есе.

Наватарства трагікамедыі "Трыбунал" (1971) у плане жанру, у вырашэнні праблем гераічнага, у паліфаніі эмацыянальных фарбаў. Традыцыі народнага трагіфарса ў п'есе. Прынцып узаемаадлюстравання ў характарах персанажаў. Псіхалагічнае майстэрства А. Макаёнка ў п'есе, у стварэнні вобраза Цярэшкі Калабка. Гумар у творы.

Сацыяльна-філасофскі і этычны пошук А. Макаёнка ў камедыях апошняга дзесяцігоддзя яго жыцця. Грамадзянская смеласць аўтара ў камедыі "Таблетку пад язык" (1972), пастаноўка шматлікіх праблем

тагачаснага вясковага жыцця. Глыбіня прадбачання Макаёнка-мастака ў камедыі “Кашмар” (1979), парадоксы ў творы. Футуралагічныя алюзіі ў трагікамедыі “Пагарэльцы” (1980) — п’есе, якая выкрывала чыноўніцтва, бюракратызм, кар’ерызм, прагу ўлады над людзьмі (Ухватаў, Кудасаў, Клёпкін, Бусько). Своеасаблівасць сюжэтна-кампазіцыйнай будовы п’есы.

Сентыментальны фельетон “Верачка” (1979) — зварот аўтара да галоўных маральных каштоўнасцей народа, сцвярджэнне чалавечнасці і дабрыні, асуджэнне бездухоўнасці.

Філасофскі роздум драматурга пра шляхі развіцця цывілізацыі і чалавека на Зямлі ў п’есе “Дыхайце эканомна” (1982).

А. Макаёнак і тэатр. Розныя рэжысёрскія трактоўкі п’ес драматурга. Развіццё А. Макаёнкам традыцый сусветнай драматургіі.

А. Макаёнак як аўтар кінасцэнарыяў.

Значэнне А. Макаёнка як аднаго з лепшых сусветных драматургаў ХХ ст. у развіцці камедыяграфіі.

## 3.8. МІХАСЬ СТРАЛЬЦОЎ

(1937—1987)

Міхась Стральцоў — яркі прадстаўнік пакалення “шасцідзесятнікаў” у беларускай літаратуры. Жыццё і творчасць. Высокая культура пісьма ў прозе. Багацце выяўленчай палітры мастака слова.

Першы зборнік апавяданняў “Блакітны вецер” (1962). Канцэптуальнасць зборніка апавяданняў “Сена на асфальце” (1966), пэўная зашыфраванасць зместу (“вёска ў горадзе”), разнастайнасць і заглыбленасць праблематыкі, актыўнае выкарыстанне багатага арсенала вобразна-выяўленчых мажлівасцей прозы. Наследаванне традыцый пісьменнікаў — “жывапісцаў словам” (У. Фолкнер, І. Тургенеў, К. Паўстоўскі, У. Гаршын, інш.)

Рамантызацыя падзей і вобразаў, увасабленне ідэала пісьменніка, узмацненне суб’ектыўнага пачатку ў прозе, імкненне гаварыць ад імя “я-героя”, раскрыццё індывідуалізаванага погляду на свет і чалавека.

“Спавядальныя” матывы ў прозе М. Стральцова.

Лірыка-рамантычнае напаўненне беларускай літаратуры ў сувязі з развіццём прозы М. Стральцова, У. Караткевіча. Адметнасць мастакоўскай палітры празаіка, акварэльнасць, настраёвасць, мілагучнасць і сакавітасць мовы.

Аповесць “Адзін лапаць, адзін чунь” (1970), кніга прозы “Падарожжа за горад” (апавяданні, аповесці, 1986), кніга выбранага “На ўспамін аб радасці” (1974).

М. Стральцоў — пісьменнік інтэлектуальнага складу. Філасофска-канцэптуальная аснова яго твораў.

Адметнасць паэтычнага бачання свету ў паэзіі М. Стральцова. Зборнікі “Ядлоўцавы куст” (1973), “Цень ад вясла” (1979), “Яшчэ і заўтра” (1983), “Мой свеце ясны” (1986). Экзістэнцыяльнае пранікненне ў сутнасць быцця, спавядальнасць і аўтабіяграфізм, класічная форма верша. Урбаністычныя матывы.

М. Стральцоў і беларуская класічная традыцыя (М. Багдановіч, М. Гарэцкі і інш.).

М. Стральцоў — крытык і літаратуразнаўца. Эсэ “Загадка Багдановіча” (1968), кніга артыкулаў “Жыццё ў слове” (1965), “У полі зроку” (1976), “Пячатка майстра” (1986).

Пераклады М. Стральцова.

## *РАЗДЗЕЛ 4.* БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА 70-Х — ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 80-Х ГАДОЎ

Змена парадыгмы ў грамадскім, культурным, нацыянальным жыцці на рубяжы 70-х гг. Эканамічнае развіццё, рост дабрабыту, наступленне эпохі НТР, далейшае станаўленне культуры, літаратуры і мастацтва.

Паступовая культурная стратыфікацыя, зараджэнне субкультуры і, як адпаведная рэакцыя на гэтыя з’явы, працэсы сублімацыі культуры, намаганні скіраваць літаратурную плынь у адпаведнае рэчышча.

Пашырэнне тэматыкі ў літаратуры (НТР, космас, экалогія і інш.). Яе жанрава-стылёвае развіццё і ўзбагачэнне (гістарычны раман, раманная хроніка, раман-эсэ, аповесць-эсэ і інш.). З’яўленне героя з тонкай, чулай душой, з абвостраным пачуццём прагі да справядлівасці.

Нарастанне экалагічных праблем у жыцці, адлюстраванне іх у літаратуры. НТР і асоба. “Экалогія” душы і “экалогія” культуры. Спроба адлюстравання ў літаратуры рэальных праблем часу — наступстваў меліярацыі, лёсу неперспектыўных вёсак, маральнай дэградацыі працаўніка ў горадзе і вёсцы, распаду сем’яў, п’янства, бескультур’я.

Зварот да беларускай гісторыі. Росквіт і фенаменальны поспех гістарычных раманаў і аповесцей У. Караткевіча.

Асэнсаванне гістарычнага шляху народа, лёс чалавека — лёс краіны (раманы І. Шамякіна, М. Лобана, В. Адамчыка, І. Чыгрынава, інш.).

Адлюстраванне жыцця выдатных асоб — узвышэнне мастацка-біяграфічнай прозы: “Пры апазнанні — затрымаць” (1983) В. Хомчанкі, “Як агонь, як вада” (1984) А. Лойкі і інш.

Мастацкія набыткі беларускай паэзіі. Верлібры М. Танка ў кантэксце сусветнай паэтычнай традыцыі. Філасофскія матывы ў яго творчасці. Класічнасць паэзіі А. Куляшова. Пафаснасць грамадзянскага голасу і публіцыстычнасць паэзіі П. Панчанкі. Фальклорная плынь у паэзіі Н. Гілевіча, А. Лойкі, узбагачэнне іх вершаванай палітры.

Акрэсленасць жыццёвай пазіцыі А. Грачанікава. Публіцыстычнасць лірыкі. Грамадскі боль і спавядальнасць яго паэзіі. “Магістраль” (1964). Выразная сацыяльная скіраванасць у змаганні за дабро, праўду, справядлівасць. Духоўныя памкненні героя лірычных вершаў у зборніках “Круглая плошча” (1971), “Грыбная пара” (1973), “Начная змена” (1975), “Дрэва на выспе” (1977), “Палессе” (1983), “Верасень” (1984), “Я вас люблю” (1986), інш.

Нацыянальны каларыт і стыхія народнага жыцця ў паэзіі В. Зуёнка. “Сяліба” (1973), “Нача” (1975), “Маўчанне травы” (1980). Адметнасць

нацыянальнага характару ў творах паэта: народнае (прыроднае, асноватворнае) і сацыяльна-гістарычнае (набытае, "прышчэпленае") у свядомасці лірычнага героя паэзіі. Дасканаласць і праніклівасць паэтычных радкоў.

Паэзія А. Пысіна, А. Вялюгіна, А. Вярцінскага, П. Макаля, Р. Барадуліна, Ю. Свіркі, М. Мятліцкага, інш. Наватарскі характар кнігі А. Разанава "Шлях — 360" (1981). Лірыка Е. Лось, В. Вярбы, Я. Янішчыц, Р. Баравіковай, Т. Бондар, Г. Каржанеўскай, В. Аколавай, інш. Драматызм пачуцця, псіхалагізм лірыкі Д. Бічэль-Загнётавай.

Арыгінальнасць, непаўторнасць паэтычных галасоў Р. Семашкевіча, К. Камейшы, Ю. Голуба, Г. Пашкова, М. Маляўкі, Л. Галубовіча, Л. Тарасюк, А. Пісьмянкова, В. Шніпа, Л. Дранько-Майсюка, Л. Паўлікавай-Хейдаравай, І. Багдановіч, А. Канапелькі, К. Жука, Л. Рублеўскай і інш. Біблейска-філасофскія і экзістэнцыяльныя матывы ў сучаснай паэзіі. Роля А. Разанава ў развіцці традыцый беларускай філасофскай паэзіі. Наватарскі характар яго творчасці. Непаўторнасць лірыка-раманнтычгага светаадчування ў паэзіі А. Пісьмянкова. Паэзія А. Сыса як сімвал пошукаў ў паэззіі канца XX стагоддзя.

Узмацненне аналітычных тэндэнцый у прозе. "Лірызацыя" прозы, "празаізацыя" паэзіі. Узмацненне суб'ектыўнага пачатку ў літаратуры. Эсэістыка. Развіццё нарысістыкі.

Чалавек і вайна — магістральная тэма беларускай літаратуры. Канцэпцыя ваеннай рэчаіснасці ў беларускай прозе, асноўныя этапы асвятлення народнага подзвігу. Маральны максімалізм прозы аб вайне В. Быкава. З'яўленне унікальных кніг "Я з вогненнай вёскі..." (1975, 2-е выд. — 1983) А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка, "Блакаднай кнігі" (1979; 2-е выд. — 1985) А. Адамовіча, Д. Граніна. Мастацкія творы аб вайне І. Пташнікава ("Найдорф", 1976), І. Навуменкі ("Смутак белых начэй", 1980), трылогіі Б. Сачанкі ("Вялікі Лес", 1980, 1982, 1984) і інш. Зварот В. Казько да дзіцячай памяці пры паказе падзей мінулай вайны (аповесць "Суд у Слабадзе", 1978). Жахі сіроцкага дзетдому ў гады вайны.

Наватарства В. Адамчыка ў раскрыцці тэмы Заходняй Беларусі (раманы "Чужая бацькаўшчына", 1978; "Год нулявы", 1983). Чалавек ва ўмовах выбару паміж дабром і злом.

"Усе мы з хат" — формула, лейтматыў беларускай прозы аб горадзе і вёсцы. Матывы бацькаўшчыны, "зямлі продкаў", "сена на асфальце", раскрыццё духоўнага свету селяніна, вяскоўца і яго ўрастанне, уваход у новую рэчаіснасць.

Выхад з крызісных, "застойных" з'яў у грамадстве, абвостраная ўвага да чалавека. Паглыбленне філасофска-канцэптуальнага зместу твораў, інтэлектуалізацыя прозы (І. Шамякін, Я. Сіпакоў, В. Гігевіч, інш.). Паказ адносінаў чалавека і прыроды, сям'і, маралі, грамадскага ладу жыцця, незадаволенасць "я-героя" самім сабой, паглыбленне псіхалагізму. Раман А. Асіпенкі "Непрыкаяны маладзік" (1982). Раман В. Казько аб меліярацыі Палесся "Неруш" (1983). Праблема ўзаемазалежнасці і ўзаемаўплыву

чалавека і прыроды, Асобы і Свету, немажлівасць разбурэння цэласнасці душы.

Маральна-этычная праблематыка, бескампраміснасць, палярнасць пачуццяў у аповесці А. Карпюка “Сучасны канфлікт” (1985). Раман “Карані” (1988) і яго народная аснова.

Мастацкае асэнсаванне жыцця ў кнігах прозы А. Кудраўца “Раданіца” (1971), “Дзень перад святам” (1975), “Зімы і вёсны” (1976), “На балоце скрыпелі драчы” (1979). Зварот да асноў народнага жыцця ў рамане “Сачыненне на вольную тэму” (1985), апеляцыя да народнай філасофіі, мудрасці.

Рэалістычная традыцыя ў беларускай літаратуры і проза А. Жука. Даследаванне нацыянальнага характару, развіццё пісьменнікам традыцый Я. Коласа, К. Чорнага, інш. Кнігі прозы “Асеннія халады” (1972), “Не забывай мяне” (1978), “Па саннай дарозе” (1979). Маральны пафас, псіхалагічная змястоўнасць аповесці “Халодная птушка” (1978). Праблемы беларускай вёскі ў прозе А. Жука. Матывы пераемнасці пакаленняў, пытанні станаўлення традыцыйнай маралі, самаўдасканалення асобы на вёсцы, яе духоўнага ўзвышэння. Праблематыка аповесці “Зоркі над палігонам” (1977) і суровыя будні вяскоўцаў мірнага часу. Гераічны пачатак у характары персанажа. Экалагічныя праблемы ў аповесці “Паляванне на Апошняга Жураўля” (1982). Умоўна-прыпавесцевы пачатак у творы, фальклорныя матывы. Вобраз Сцяпана Дзямідчыка. Герой пісьменніка як увасабленне сумлення народа. Настраёвасць аповесці.

Праблемна-тэматычная і эстэтычная адметнасць твораў Г. Далідовіча, А. Карпюка, У. Дамашэвіча, Г. Марчука, Л. Дайнекі, А. Масарэнкі, Л. Левановіча, Э. Ялугіна, Ф. Янкоўскага, Л. Арабей, С. Грахоўскага, А. Марціновіча, У. Рубанава, У. Саламахі, інш.

Жанрава-стылявая эвалюцыя сучаснай беларускай прозы. Пашырэнне мастацкага досведу ў літаратуры. Публіцыстычнасць як прыкмета новай змястоўнасці нацыянальнай прозы.

Формы і прыёмы мастацкай умоўнасці (В. Казько, У. Рубанаў, А. Казлоў, інш.). Фантасмагорыя і містыка як спосаб мастацкага светаасэнсавання. Антыутопія ў літаратуры. Выкарыстанне пісьменнікамі міфалагічных і казачных сюжэтаў і матываў. Узбагачэнне беларускай фантастыкі. Навукова-фантастычныя гіпотэзы і іх уплыў на мастацкую літаратуру. Жанр фэнтэзі ў сучасным мастацтве (Р. Баравікова). Адметнасць стылістыкі і кампазіцыі фантастычных твораў Л. Дайнекі "Чалавек з брыльянтавым сэрцам", Я. Сіпакова "Блуканні па іншасвеце". Фантастычныя карціны ў творах В. Гігевіча "Карабель" (1989), “Марсіянскае падарожжа” (1990). Героі пісьменніка, іх светаадчуваняе і жыццёвыя прынцыпы. Інтэлектуальная і маральна-этычная заглыбленасць прозы В. Гігевіча, яе гуманістычная скіраванасць.

Дэтэктыўны жанр у беларускай літаратуры. Працяг традыцый, закладзеных У. Караткевічам: займальны сюжэт, прынцып загадкавасці, вострая інтрыга, незвычайнасць вобразаў. Праблематыка і асаблівасці

аўтарскай канцэпцыі ў раманах Г. Марчука "Крык на хутары" (1983), "Кветкі правінцыі" (1986).

"Спавядальная" проза і жанр дзённіка ў беларускай прозе. Аўтабіяграфізм твораў і павышэнне эстэтычнага значэння дакументальнасці ў беларускай літаратуры : І. Пташнікаў – "Ірга каласістая", "Тры пуды жыта", В. Быкаў – "Доўгая дарога дадому", А. Адамовіч – "Vixi", І. Навуменка – "Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва", І. Шамякін – "Начныя ўспаміны", "Промні маленства" і інш. Інтэнсіўны зварот да асабістага мінулага як вынік паглыблення сучаснага светаадчування ў літаратуры.

Поспехі беларускай драматургіі. Тэатр А. Макаёнка. Надзённасць твораў мастака. Чалавечы характар пад "прэсам" сацыялагічных догмаў, ідэалогіі, зашоранасці погляду на індывідуальнасць ("Зацюканы апостал", 1969; "Трыбунал", 1970; "Таблетку пад язык", 1973; "Пагарэльцы", 1980). Сцэнічны лёс п'ес драматурга. Заслугі А. Макаёнка ў развіцці беларускай драматургіі. Пашырэнне жанрава-тэматычных абсягаў драматургіі. Драмы А. Дударава "Радавыя" (1984), "Парог" (1981), "Вечар" (1983), іх поспех на сцэнічных падмостках. Камедыі К. Крапівы, М. Матукоўскага, А. Дзялендзіка, інш. Драматургія А. Петрашкевіча: "Соль" (1981), "Трывога" (1974), "Напісанае застаецца" (1982), "Русь Кіеўская" ("Гора і слава") (1983) і інш.

Беларуская літаратура для дзяцей. Тэтралогія А. Васілевіч "Пачакай, затрымайся..." (1972), кнігі В. Віткі, І. Сяркова, У. Ліпскага, інш.

Перакладчыцкая дзейнасць В. Сёмухі, Р. Барадуліна, Я. Семяжона, А. Куляшова, К. Шэрмана, інш.

Беларуская літаратура на парозе істотных змен у грамадска-культурным жыцці.

## 4.1. ВАСІЛЬ БЫКАЎ
(1924—2003)

В. Быкаў як літаратурная славутасць Беларусі. Яго шырокая вядомасць у замежжы, высокае грамадскае прызнанне. Значэнне творчасці В. Быкава ў гісторыі беларускай і сусветнай літаратуры. Жыццяпіс празаіка. Аўтабіяграфізм яго творчасці.

Аповесць "Жураўліны крык" (1959) як першы поспех. Выяўленне маральна-духоўнай сутнасці чалавека ў экстрэмальнай сітуацыі ў аповесці "Здрада" (1960). Мастацкае наватарства аповесці "Трэцяя ракета" (1961). Сінтэз эпасу, лірыкі і драмы ў апавядальным маўленні аўтара. Галерэя людскіх характараў у аповесці: біяграфія герояў, адносіны да вайны і міру, месца ў калектыве, думкі пра будучыню. Апавяданні ("Сваякі", "Адна ноч") і "маленькія аповесці" ("Пастка", "Праклятая вышыня", "Абеліск") як своеасаблівыя інтэрмедыі ў сістэме твораў Быкава ў жанры аповесці. Наватарская інтэрпрэтацыя традыцыйных сюжэтаў у нацыянальнай і сусветнай літаратурах пра вайну (Я. Колас, М. Гарэцкі, К. Чорны; Э. М. Рэмарк, А. Камю, Ж. П. Сартр). Трагічнае паняцце абсурду вайны і збліжэнне з філасофіяй экзістэнцыялізму. Праблема рамантызацыі і ідэалізацыі ў сюжэце аповесці "Альпійская балада" (1963). Аўтабіяграфізм і

дакументалізм у аповесці “Мёртвым не баліць” (1965). Новы ўзровень мастацкай праўдзівасці ў творы і дыскусія пра “акопную праўду” (“рэмаркізм”) у савецкай прэсе. Праблема суб’ектыўнага і аб’ектыўнага ў паказе вайны. Быкаўскае разуменне прыроды трагічнага ў аповесці (паняцці памяці, ісціны, болю, чалавечнасці, выпадку і лёсу, абсурду, цаны перамогі). Аўтарскі вобраз вайны (“мая вайна”) у аповесці “Праклятая вышыня” (1968). Паняцце шматзначнасці, сімволікі і прытчавасці ў творы і яго паглыбленне ў наступных творах празаіка.

“Партызанскія аповесці”. Выхад за межы аўтабіяграфізму і пашырэнне фактычнай асновы ў аповесці “Круглянскі мост” (1968). Унікальнае месца праблемы выбару і “элементу трагічнага” ва ўмовах падпольнай і партызанскай вайны з акупантамі. Маральная сутнасць канфлікту Таўкача і Брытвіна.

Працяг і развіццё палемікі гуманіста і прагматыка ў аповесці “Сотнікаў” (1970). Паказ унутранага свету чалавека, магчымасцей яго духу “перад знішчальнаю сілай бесчалавечных абставін”. Вобразы Сотнікава і Рыбака, іх супастаўленне: біяграфія герояў, характар, светапогляд, сістэма паводзінаў, філасофія жыцця, маральны “катэгарычны імператыў”. Праблема духоўнай няўступлівасці, філасофія жыццёвага стаіцызму і праблема маральнай усяяднасці, недафармаванасці. Пісьменнік пра значэнне духоўнай культуры ў гісторыі чалавецтва. Пафас сцвярджэння каштоўнасці чалавечага жыцця ў філасофскіх дыялогах, маналогах герояў і ў аўтарскіх адступленнях. Праблема прытчападабенства ў аповесці і майстэрства паказу падзей вайны ў кантэксце сусветнай гісторыі, на фоне евангельскага сюжэта пра Ісуса Хрыста і Іуду Іскарыёта. Завостранасць маральных вывадаў, імкненне да абсалютных ацэнак, максімалізм духоўных патрабаванняў, шматзначнасць сітуацый і вобразаў. Адкрыты фінал твора і яго сэнс.

Публіцыстычная палемічнасць аповесці “Абеліск” (1971) і праблема гераізму, абавязку, сумлення, адказнасці перад будучыняй. Адмаўленне “арыфметычнага” падыходу да паводзін чалавека ў экстрэмальных сітуацыях. Вобраз Алеся Мароза. Паняцце меры чалавечай адказнасці ў аповесці “Дажыць да світання” (1972). Праблема будучыні ў аповесці “Воўчая зграя” (1974).

Паглыбленне роздуму празаіка пра цану Вялікай Перамогі і каштоўнасць асобнага чалавечага жыцця ў аповесці “Яго батальён” (1975).

Завяршэнне цыкла “франтавых аповесцей” і “партызанскага цыкла”. Аповесць “Пайсці і не вярнуцца” (1978) як новы этап у мастацкім развіцці пісьменніка. Чалавек і час у творы.

Аповесць “Знак бяды” (1982) як значная мастацкая з’ява ў творчасці празаіка. Паглыбленне погляду на праблему нацыянальнай літаратурнай традыцыі і прадчуванне подыху народнага эпасу. Філасофска-псіхалагічнае і сацыяльна-гістарычнае асэнсаванне сувязі часоў і эпох у творы. Вобраз “разбуранага гнязда” і “знакі бяды” ў сюжэце аповесці. Чалавечае вымярэнне вялікіх гістарычных падзей у жыцці народа. Вобразы Петрака і Сцепаніды

Багацькаў як своеасаблівыя варыянты нацыянальнага характару беларуса, дзве разнавіднасці яго менталітэту.

Актуалізацыя сюжэтнай сітуацыі аповесці "Круглянскі мост" і яе мастацка-вобразнае развіццё ў рамане "Кар'ер" (1985). Аповесці "У тумане" (1988), "Аблава" (1989), "Сцюжа" (1969, 1991) як мастацкае падвядзенне рахункаў і паглыбленне ў беларускую гісторыю. Быкаўскае асэнсаванне экзістэнцыялісцкага паняцця абсурду і яго вобразнае выяўленне ў вобразах і сюжэце.

Творчасць 90-х гг. Запаўненне нішаў беларускай гісторыі ў апавяданнях (зборнікі апавяданняў і прыпавесцей "Сцяна", "Пахаджане") і ў аповесцях ("Пакахай мяне, салдацік", "Балота"). Абнаўленне нацыянальнай традыцыі алегарычна-сімвалічнага паказу рэчаіснасці ў "Байках жыцця", аповесцях "Труба" і "Ваўчыная яма".

В. Быкаў — публіцыст, эсэіст, літаратурны крытык (зборнікі артыкулаў "Праўдай адзінай", "На крыжах", "Крыжавыя дарогі").

Творы В. Быкава ў перакладах на замежныя мовы.

## 4.2. ІВАН НАВУМЕНКА
(1925—2006)

І. Навуменка як вядомы літаратар і навуковец. Біяграфія пісьменніка. Навуковая, навукова-арганізацыйная і грамадская дзейнасць.

Юнацкі свет у ранніх творах. Пастаяннае вяртанне ў маладосць на працягу ўсёй творчасці. Выдатнае выяўленне ўзроставай псіхалогіі: дзіцячай, падлеткавай, юнацкай ("Вайна каля Цітавай копанкі" (1957), "Семнаццатай вясной" (1957), "Хлопцы-равеснікі" (1958), "Верасы на выжарынах" (1960), "Таполі юнацтва" (1966), "Вераніка" (1968), "Тая самая зямля" (1971). Юнацтва — своеасаблівы пункт адліку на працягу ўсёй творчасці пісьменніка. Культ кнігі, ведаў у апавяданні "Жуль Верн" (1959). "Вайна пад стрэхамі" юных герояў І. Навуменкі, рамантызацыя імі змагання. Рамантычныя юнакі на фронце ў навеле "Дом над морам" (1958); майстэрства будавання сюжэта ў творы ваеннай тэматыкі; трагізм навелы.

Эпічнасць мыслення І. Навуменкі ў раманнай трылогіі "Сасна пры дарозе" (1962), "Вецер у соснах" (1967), "Сорак трэці" (1970). Цэнтральны герой трылогіі Міця Птах — паўтарэнне тыпажу юнака папярэдніх твораў. Выдатнае псіхалагічнае майстэрства пісьменніка ў стварэнні вобразаў-персанажаў. Асаблівасці кампазіцыі раманаў. Мова твораў. Раман "Смутак белых начэй" (1979) як своеасаблівы працяг трылогіі. Аўтабіяграфізм твораў. Паглыбленне трагедыйнасці зместу. Асаблівасці хранатопу ў параўнанні з трылогіяй.

Аповесць пра студэнцтва "Бульба" (1964). Героі-інтэлігенты ў рамане "Летуценнік" (1983) і аповесці "Асеннія мелодыі" (1987). Неардынарнасць унутранага свету галоўных герояў твораў.

Тэма драматычнага кахання ў навелах і аповесцях "Трымценне дубовага лісця" (1964), "Сукенка Ларэлеі" (1969), "Развітанне ў Кавальцах" (1974), "Замяць жаўталісця" (1976). Паэтыка твораў. Адметнасць прозы

пісьменніка: лірычная пранікнёнасць, настраёвасць і задушэўнасць пісьма. Гумар у творах. Багацце пейзажаў, лірычных адступленняў, маналогаў, мастацкіх дэталяў (сімвалічнай, бытавой, пейзажнай, партрэтнай).

Традыцыі Я. Коласа ў паказе дзяцінства і прыроды ў творах І. Навуменкі канца XX — пачатку XXI ст. Узаемадачыненні дзіцяці і яго роду, дзіцяці і соцыуму, дзіцяці і прыроды ў аўтабіяграфічнай трылогіі “Дзяцінства; Падлетак; Юнацтва” (1997). Вяртанне на новым жыццёвым вітку да ранейшай тэматыкі.

Гістарычнае і сімвалічнае ў творах І. Навуменкі. Развіццё пісьменнікам узроўню сімвалізацыі твораў (у тым ліку ў загалоўках).

Літаратуразнаўчыя і крытычныя працы пісьменніка.

## 4.3. АЛЕСЬ АДАМОВІЧ
(1926 (27) — 1994)

Асоба Алеся Адамовіча — пісьменніка, даследчыка літаратуры, публіцыста. Біяграфія. Жыццяпіс пісьменніка ў мастацкай споведзі “Vixi” (1993).

Аўтабіяграфізм рамана-дылогіі “Вайна пад стрэхамі” (1960) і “Сыны ідуць у бой” (1962). Мастацкая канцэпцыя “вайны пад стрэхамі” як формы Беларускага Супраціўлення. Вобраз беларускай маці Ганны Корзун у творы. Псіхалагізм і лірызм твора. Маральная праблематыка і філасафічныя дыялогі герояў.

Дакументалізм “Хатынскай аповесці” (1972). Жанрава-стылёвыя пошукі празаіка. Вобразы твора.

Дакументальная кніга А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка “Я з вогненнай вёскі...” (1975) і яе унікальнасць. Вобраз вайны ў дакументальнай “Блакаднай кнізе” (1982) А. Адамовіча і Д. Граніна. Паняцце “магнітафоннай літаратуры” ў тлумачэнні яе родапачынальніка і стваральніка А. Адамовіча, працяг яго традыцыі (творчасць С.Алексіевіч).

Раман “Карнікі” (1980) і літаратура “плыні свядомасці”. Паглыбленне ў псіхалагічны свет, у нетры свядомасці і падсвядомасці розных тыпаў карнікаў. Псіхалагічнае майстэрства пісьменніка. Вобраз вайны і канцэпцыя чалавека ў рамане.

Жанр антыутопіі ў прозе А. Адамовіча (аповесць “Апошняя пастараль”, 1986).

Актуалізацыя рысаў народнай трагедыі ў аповесцях “Венера, або Як я быў прыгоннікам” (1982—1992) і “Нямко” (1993).

А. Адамовіч як публіцыст. Асэнсаванне пісьменнікам праблем часу з пазіцый гуманізму.

А. Адамовіч — даследчык літаратуры, літаратурны крытык.

## 4.4. УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ
(1930—1984)

У. Караткевіч як адметная, яркая постаць у беларускай літаратуры XX ст. Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Асоба і шматграннасць таленту.

Вялікая роля У. Караткевіча ў распрацоўцы гістарычнай тэматыкі, адраджэнні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Адметнасць паэтыкі рамантызму ў яго творчасці.

Тэматычная і жанрава-стылёвая разнастайнасць паэзіі У. Караткевіча. Мастацкая непаўторнасць зборнікаў паэзіі "Матчына душа" (1958), "Вячэрнія ветразі" (1960), "Мая Іліяда" (1969), "Быў. Ёсць. Буду." (1986). Самабытнасць і навізна паэтычнага слова. Патрыятычны змест, фальклорна-міфалагічная ўмоўнасць, кніжныя традыцыі, пранікнёны лірызм, эпічнасць, баладнасць, вобразнае багацце, філасафічнасць, інтэлектуальнасць,рытміка-інтанацыйная шматграннасць, драматызм і жыццесцвярджальнае гучанне паэзіі.

Рамантычнае, фальклорна-легендарнае і адначасова канкрэтна-гістарычнае, па-мастацку дакладнае і дасканалае асэнсаванне пісьменнікам мінуўшчыны ў прозе. Мастацкі свет казак У. Караткевіча ("Лебядзіны скіт", "Вужыная каралева", "Чортаў скарб", "Верабей, сава і птушыны суд", "Нямоглы бацька").

Вобразы, праблематыка і стылёвая адметнасць апавяданняў У. Караткевіча "Блакіт і золата дня", "Кніганошы", "Сіняя-сіняя", "Дрэва вечнасці".

Спецыфіка аповесці "Дзікае паляванне караля Стаха" (1950, 1958) як гістарычнага дэтэктыва. Патрыятычны змест, праблематыка, вобразы, мастацкія асаблівасці.

Асэнсаванне ў сатырычна-гумарыстычнай аповесці "Цыганскі кароль" (1958) (на прыкладзе цыганскага "каралеўства") важных сацыяльна-палітычных і нацыянальных праблем.

Патрыятычны змест і паэтыка рамантызму ў аповесці "Сівая легенда" (1960).

Раман "Леаніды не вернуцца да Зямлі" ("Нельга забыць") (1960—1962) — твор інтэлектуальна-псіхалагічны, шматпланавы, эксперыментальны. Гісторыя выдання. Адметнасць гістарызму. Сістэма вобразаў у творы. Духоўныя пошукі інтэлігенцыі. Прыгажосць, таямніца і сіла кахання ў рамане.

Раман "Каласы пад сярпом тваім" (1962—1964). Творчая гісторыя. Шматпланавасць і маштабнасць рамана. Час і прастора ў творы. Фальклорна-міфалагічныя і кніжныя традыцыі. Літаратурныя персанажы, народжаныя мастацкай фантазіяй пісьменніка, і рэальныя гістарычныя асобы. Вобразы Алеся Загорскага, Кастуся Каліноўскага, Данілы Загорскага-Вежы і інш.. Атмасфера і дух эпохі, глыбінная беларускасць твора. Сімволіка. Стылёвыя асаблівасці.

Аповесць "Зброя" (1964) як адгалінаванне рамана "Каласы пад сярпом тваім", як сатыра на самадзяржаўна-прыгонніцкую Расію 1860-х гадоў.

Выкарыстанне гратэску ў "Легендзе аб бедным д'ябле і аб адвакатах Сатаны" (1961). Адлюстраванне на матэрыяле беларускай сярэдневяковай рэчаіснасці барацьбы дабра са злом.

Аповесць "Ладдзя Роспачы" (1964). Фальклорныя і кніжныя традыцыі, філасафічнасць і сімволіка. Майстэрства пабудовы прыгодніцкага сюжэта і стварэння характараў. Жанрава-стылёвая адметнасць твора.

Раман "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" (1965—1966), яго месца ў кантэксце еўрапейскіх літаратур (Ф. Рабле, Ш. дэ Кастэр, Р. Ралан, М. Булгакаў, У. Эка). Традыцыі "карнавальнай літаратуры" і фальклорнай смехавой культуры ў творы. Гратэск у рамане. Авантурна-прыгодніцкі сюжэт і сацыяльна-філасофскі, псіхалагічны змест рамана. Юрась Братчык як прадстаўнік беларускага народа ў XVI ст. Сімволіка і алегарычнасць у рамане. Жанрава-стылёвыя асаблівасці і мова твора.

Веліч, краса кахання і прыроды ў аповесці "Чазенія" (1966). Вытанчанасць стылю, лірычная ўсхваляванасць, інтэлектуальнасць і глыбокая духоўнасць твора. Аповесць У. Караткевіча ў літаратурным кантэксце (М. Прышвін, К. Паўстоўскі, А. Грын, інш.).

Аўтабіяграфізм і антываенны пафас аповесці "Лісце каштанаў" (1972).

Гісторыка-дэтэктыўны раман "Чорны замак Альшанскі" (1979). Праблематыка твора. Духоўная моц і высокая нацыянальная свядомасць Антона Косміча. Повязь часоў у творы. Дынамічнасць сюжэта, глыбіня псіхалагізму, паказ жыцця ў яго складанасцях і супярэчнасцях, сцвярджэнне думкі пра непераможнасць і ўсёмагутнасць дабра і чалавечнасці. Мастацкія асаблівасці рамана.

Драматургія, яе вобразы, праблематыка, жанрава-стылёвыя асаблівасці, сцэнічнае ўвасабленне ("Кастусь Каліноўскі", 1963; "Званы Віцебска", 1973; "Маці ўрагану", 1982 і інш.).

Публіцыстыка і літаратурнага крытыка, эсэістыка ("Званы ў прадоннях азёр", 1969; "Зямля пад белымі крыламі", 1971, 1976; "Дыяментавы горад", 1982 і інш.). Пераклады.

Постаць і творчасць У. Караткевіча ў беларускім і сусветным культурным кантэксце (М. Багдановіч, В. Ластоўскі, М. Гарэцкі, Я. Дыла, А .К. Талстой, Г. Сянкевіч, В. Скот, інш.).

Бібліяграфія асноўных выданняў пісьменніка. Асэнсаванне жыцця і творчасці У. Караткевіча ў крытыцы і літаратуразнаўстве.

## 4.5. НІЛ ГІЛЕВІЧ

(нар. у 1931 г.)

Біяграфія, шматграннасць творчай дзейнасці. Першы зборнік "Песня ў дарогу" (1957): пафас рамантыкі, маладой акрыленасці і аптымізму. Творчая актыўнасць паэта ў другой палове 50-х — 60-я гг. Выхад кніг "Прадвесне ідзе па зямлі" (1959), "Неспакой" (1961), "Бальшак" (1965), "Перазовы" (1967), "Лісце трыпутніку" (1968). Асноўныя лірычныя сюжэты, матывы і вобразы ў гэтых зборніках: вобразы маці, Беларусі, матывы памяці пра вайну, народнай песні, любові да роднай мовы, закаханасці, чалавечага шчасця і інш. Жанрава-кампазіцыйная і стылёвая адметнасць вянка санетаў "Нарач".

Асаблівасці ідэйна-творчай эвалюцыі паэта ў 70—80-я гг. Класічныя традыцыі і наватарства ў зборніках “А дзе ж тая крынічанька” (1972), “Актавы” (1976), “У добрай згодзе” (1979), “Повязь” (1987). Жанрава-стылёвая разнастайнасць паэзіі Н. Гілевіча: ода, гімн, малітва, элегія, балада, санет, замова, эцюд, казка, байка, эпіграма і інш. Вершаваныя мініяцюры ў форме васьмірадкоўяў (зборнік “Святлынь”, 1984), сямірадкоўяў (Збор твораў, т. 3, 2003), жанры танка (зборнік “На флейце самоты”, 2004). Тэматычна-праблемная характарыстыка кніг “Жыта, сосны і валуны” (1992), “На высокім алтары” (1994), “Ёсць зямля...” (1997) і інш. Публіцыстычныя маналогі, лірычныя споведзі і маральна-філасофскія разважанні Н. Гілевіча. Клопат паэта і пісьменніка пра духоўныя асновы быцця, лёс беларускай культуры ў кнізе “Любоў прасветлая” (1996).

Меладычна-песенная аснова паэзіі Н. Гілевіча. Спалучанасць паэзіі Н. Гілевіча з традыцыямі вуснай народнай творчасці. Мастацкі феномен верша-песні “Вы шуміце, бярозы” (муз. Э. Ханка). Роля Н. Гілевіча ва ўзбагачэнні песеннага мастацтва.

Экалагічная скіраванасць пейзажнай лірыкі Н. Гілевіча. Пакланенне красе прыроды, адлюстраванне навакольнага свету ў яго цудоўных, непаўторных праявах, бачанне паэтам незвычайнага ў звычайным (“Цуд тварыўся — я праспаў...” і інш.). “Снежаньская імпрэсія”: пластычнасць гукапісу, мілагучнасць і чысціня гучання слова, паэтызацыя колеру снегу. Роля эпітэта і анафары ў гэтым творы. Узвышана-ўрачыстая танальнасць верша “Свята зямлі”.

Псіхалагічная глыбіня ў раскрыцці першага кахання і звязаных з гэтым пачуццём учынкаў героя-падлетка ў паэме “Лодачкі” (1998).

Сатырычны і гумарыстычны талент паэта. Зборнікі гумару і сатыры “Званковы валет” (1961), “Да новых венікаў” (1963), “Ці грэх, ці два” (1970), “Русалка на Нарачы” (1974), “Кантора” (1989), “Дыялог на хаду” (1990) і інш. Гісторыя стварэння “Сказа пра Лысую гару”, выданне гэтага твора ў апошняй аўтарскай рэдакцыі (2003).

Раман у вершах “Родныя дзеці” (1985): жанравая адметнасць, сюжэт і кампазіцыя, канфлікт, сістэма вобразаў, праблематыка твора. Публіцыстычнасць слова, ёмістасць аўтарскай думкі. Праблемы сям’і, чалавечых узаемаадносінаў. Драматургія (п’есы “Не кажы гоп”, “Формула іржавіны” і інш.).

Актыўная праца ў галіне мастацкага перакладу. Роля Н. Гілевіча ў папулярызацыі мастацкіх дасягненняў славянскіх літаратур.

## 4.6. АНАТОЛЬ ВЯРЦІНСКІ

(нар. у 1931 г.)

Анатоль Вярцінскі як прадстаўнік інтэлектуальнай плыні ў беларускай паэзіі. Станаўленне творчай індывідуальнасці А. Вярцінскага. Паэт і час, паэт і яго літаратурнае пакаленне. Ацэнка першага зборніка “Песня пра хлеб” (1962) у тагачаснай крытыцы. Пафас, матывы, сродкі мастацкага выяўлення. Эстэтычныя арыенціры аўтара, яго творчая актыўнасць. Зборнікі “Тры

цішыні” (1966). “Чалавечы знак” (1968) і іх месца ў паэзіі таго часу. Інтэлектуальна-філасофская насычанасць кніг “З’яўленне” (1975), “Час першых зорак” (1975), “Ветрана” (1979). Зборнік выбраных твораў “Хлопчык глядзіць...” (1992) як падсумаванне ідэйна-творчых набыткаў паэта, яго духоўных пошукаў.

Нестандартнасць паэтычнага мыслення. Рацыянальна-лагічны пачатак і яго ўплыў на стыль пісьма. Сінтэзуючы характар паэтычнай думкі, яе аналітызм, псіхалагічная заглыбленасць. Жанравая сістэма ў паэзіі А. Вярцінскага: ода, гімн, элегія, медытацыя, прытча, малітва, плач, песня і інш. Верш-разважанне і верш-роздум у лірыцы паэта. Строга лагізаваная форма выкладу думкі: тэзіс — аргументы — выснова. Канцэнтрацыя ў творах значнага ідэйна-філасофскага зместу. Глыбокае разуменне чалавека, складанасці жыцця, спасціжэнне сэнсу чалавечага існавання. Рэцэпцыя антычнага міфа і антычнай культуры (“Размова з Ду Фу”, “Варыяцыі на тэму “Гефест — друг Праметэя” і інш.). Мастацкая трактоўка вечных праблем. Яркасць вобразных асацыяцый. Публіцыстычнасць стылю, экспрэсія слова ў вершах паэта. Аўтарская аргументацыя і доказнасць, майстэрства палемікі, афарыстычнасць, ёмістасць высноў і абагульненняў.

Прырода і чалавек (“Начны бераг”, “Паэма мора”, “Колькі лет, колькі зім!” і інш.). Глыбіня натурфіласофскага светаразумення, экалагічная скіраванасць аўтарскага мыслення.

Лірычныя матывы кахання. Раскрыццё душэўнага стану, інтымных пачуццяў у вершах “Мужчына. Жанчына. Чаканне...”, “Я жыў высока на гары...”, “Пакуль не было цябе...” і інш. Пранікнёнасць аўтарскіх інтанацый, эмацыянальнасць, выяўленчае майстэрства паэта.

Крытыка, публіцыстыка, перакладчыцкая дзейнасць А. Вярцінскага. Кніга “Нью-Йоркская сірэна” (1987).

## 4.7. ІВАН ПТАШНІКАЎ

(нар. у 1932 г.)

Іван Пташнікаў як выдатны майстар слова, глыбокі знаўца народнай душы. Біяграфія. Эпічны характар яго таленту.

Сацыяльны характар канфліктаў у ранніх творах І. Пташнікава: аповесцях “Іллюк Чачык” (1957), “Не па дарозе” (1960), рамане “Чакай у далёкіх Грынях” (1962). Маляўнічасць апісанняў у творах.

Свет падлетка ў апавяданнях “Алені”, “Алёшка”, “Бежанка” (1962). Атмасфера паэтычнасці ў творах. Праблема ўзаемаадносін чалавека і прыроды.

Аповесць “Лонва” (1964). Выкарыстанне рэтраспекцыі ў выглядзе успаміну герояў. Супрацьпастаўленне трагізму вайны і радасці мірнага існавання. “Шматгалоссе жыцця” ў творы. Адметнасць жанравай будовы аповесці.

Успамін аўтара пра ваеннае дзяцінства — аснова аповесці “Тартак” (1967). Драматызм, напружаны эмацыянальны бок твора. Роля карцін прыроды. Малюнкава-аналітычны стыль І. Пташнікава.

Раман "Мсціжы" (1970). Знешняя малападзейнасць і ўнутраная канфліктнасць твора. Характар галоўнага героя Андрэя Вялічкі. Парушанасць сувязей чалавека і зямлі як важнейшая сацыяльная праблема, пастаўленая ў творы.

Рэальная аснова аповесці "Найдорф" (1976). Гераічны пафас твора. Праўдзівасць характараў і абставін. Даследаванне вытокаў народнай сілы, перадумоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Паказ варожасці вайны ўсяму ладу сялянскага жыцця. Псіхалагізм у абмалёўцы галоўных герояў — Алёшы і Яхрэма Жаваранка. Роля рэтраспекцыі (успамінаў герояў) у ідэйна-мастацкай структуры твора. Увасабленне народнага погляду на вайну ў творы.

Значэнне тапонімаў у творчасці І. Пташнікава.

Супярэчнасці часу ў рамане "Алімпіяда" (1984). Прыродны і сацыяльны дэтэрмінізм характараў у творы. Архетып маці ў творы. Багацце ў ім жыццёвых сувязей, цэласнасць мастацкага свету. Моўна-стылёвыя асаблівасці твора.

Апавяданне "Львы" (1987) — яркае ўвасабленне наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

Творы 90-х гг., іх жанравая разнастайнасць ("Ірга каласістая", "Француржанкі", "Тры пуды жыта", "Пагоня"). Значны элемент аўтабіяграфізму ў творах. Трагізм сюжэтаў, узнаўленне драматычных старонак гісторыі, звязаных з рэпрэсіямі. Узмацненне момантаў дынамізму ў творах. Багацце мовы аўтара.

Значэнне творчасці І. Пташнікава ў гісторыі беларускай літаратуры.

## 4.8. ВЯЧАСЛАЎ АДАМЧЫК
(1933—2001)

Вячаслаў Адамчык як адзін з выдатных майстроў беларускай прозы. Біяграфія пісьменніка.

Жыццяпіс празаіка ў яго "Дзённіку". Сацыякультурная і духоўна-маральная атмасфера жыцця ў Заходняй Беларусі ў апавяданнях пісьменніка. Раскрыццё трагізму вайны ў апавяданні "Пагарэльцы" (1967). Майстэрства мастацкай дэталі.

Тэтралогія "Чужая бацькаўшчына" (1977), "Год нулявы" (1982), "І скажа той, хто народзіцца" (1985), "Голас крыві брата твайго" (1990). Сімволіка назваў раманаў. Адметнасць мастацкай канцэпцыі беларускай гісторыі. Праблема "беларускага шляху" ў творы. Калектыўны партрэт народа і працэс духоўнай дэградацыі ва ўмовах жыцця ў "чужой бацькаўшчыне". Вясковыя тыпы (Улас Корсак, Імполь Верамей, Жэнік Рэпка, Бронік Літавар). Вобразы жанчын (Хрысця, Чэся Доўнар). Біблейскія матывы ў заключным рамане тэтралогіі. Характарыстыка аўтарскага маўлення і стылю.

Фантастычнае і рэальнае, сучаснае і мінулае ў аповесці "Падарожжа на Буцафале" (1991).

Думкі і роздум пісьменніка ў "Развітальнай аповесці" (1999). Настальгічныя матывы, песня развітання з "сялянскай Атлантыдай".

Эсэістыка ў апошняй кнізе празаіка "Нязрушаны камень" (2002).

Проза В. Адамчыка і класічная эпічная традыцыя (Я. Колас, М. Гарэцкі, К. Чорны, І. Мележ).

## *РАЗДЗЕЛ 5.* СУЧАСНАЯ ЛІТАРАТУРА БЕЛАРУСІ (З СЯРЭДЗІНЫ 80-Х ГАДОЎ)

Сучасны этап літаратурнага развіцця. Так званая "перабудова" як пачатак працэсу энтрапіі і літаратура. Агульныя звесткі пра развіццё беларускай літаратуры ў другой палове 80-х — 90-я гг. Трывога літаратуры пра вечныя духоўныя каштоўнасці, захаванне гуманізму.

Традыцыі і наватарства ў сучаснай літаратуры. Эстэтыка-выяўленчыя кірункі, плыні, тэндэнцыі: рэалізм, неарамантызм, авангардызм, імпрэсіянізм, постмадэрнізм і інш.

Літаратурна-выдавецкі працэс у сучаснай Беларусі. СМІ ў беларускай культурнай прасторы. Авангардныя пошукі творчай моладзі. Складанасці і праблемы сучаснага літаратурнага працэсу.

Традыцыя філасафізму і яе ўплыў на сучасную паэзію. Інтэлектуалізацыя мастацкага мыслення. Біблейска-філасофскія і рэлігійна-хрысціянскія матывы (М. Танк, В. Зуёнак, М.Шамякіна, інш.).

Мадэрнізацыя паэтычнай свядомасці. Жанравая разнастайнасць беларускай паэзіі. Паяднанне публіцыстычнага, філасофскага і інтымна-псіхалагічнага пачаткаў у сучаснай лірыцы (П. Панчанка, В.Зуёнак, Н. Гілевіч, С. Грахоўскі, інш.).

Сучасная паэтычная міфатворчасць. Вобразы беларускай міфалогіі (М. Танк, Р. Барадулін, А. Мінкін, А. Сыс, інш.).

Прыродацэнтрызм як аснова мыслення сучасных паэтаў. Драматызм вершаў на экалагічную тэматыку.

М. Мятліцкі як летапісец чарнобыльскай трагедыі. Пафас і вобразны свет кніг "Горкі вырай" (1989), "Палескі смутак" (1991), "Бабчын" (1996), "Хойніцкі сшытак" (1999), "Замкнёны дом" (2005). Паэтычныя маналогі, элегіі, балады, пасланні і інш. Партрэты землякоў-бабчынцаў. Матывы і міфалагемы нядолі, гора, бяды, ліха, смерці. Паэтыка чарнобыльскага пейзажу.

Багацце духоўнага зместу ў лірыцы кахання Я. Янішчыц, Р. Баравіковай, Г. Бураўкіна, інш. Наватарства ў галіне вершаванай формы і іншыя мастацкія пошукі сучаснай паэзіі.

Лірыка Л. Дранько-Майсюка ў кантэксце эстэтыкі імпрэсіянізму. Адкрыццё паэзіі ў прозе жыцця (зборнік "Вандроўнік", 1983). Паэтызацыя роднага Палесся. Рэцэпцыя антычнай культуры. Л. Дранько-Майсюк як пясняр кахання (цыкл "Вершы для А.").

Беларуская паэма на сучасным этапе: жанравая сінтэтычнасць, разнастайнасць мастацкіх формаў, інш. Выяўленне розных аспектаў чалавечага быцця: маральнага, сацыяльнага, гістарычнага, рэлігійнага і інш.

Мастацкія дакументы часу перабудовы: П. Панчанка. “Паэма сораму і гневу”, інш. Асэнсаванне чарнобыльскай трагедыі ў сучасным паэтычным эпасе.

Паэмы ў прозе Я. Сіпакова: “Одзіум”, “Хата”, “Ахвярны двор” і інш. “Падарожжа вакол двара” — заключная паэма з ліра-эпічнага цыкла В. Зуёнка “Пяцірэчча”. Драматызацыя паэмнага жанру: творы М. Арочкі, Р. Баравіковай, Л. Рублеўскай, інш. Інтэлектуальная заглыбленасць думкі ў паэмных творах А. Разанава (“Гліна”, “Усяслаў Чарадзей” і інш.).

Актывізацыя ідэйна-творчых пошукаў, пашырэнне выяўленчых магчымасцей беларускай прозы 80—90-х гг. Мастацкія набыткі ў жанрах рамана, аповесці і апавядання. Разнастайнасць тэматыкі і праблематыкі сучаснай прозы. Лёс беларускага народа ў XX ст. у асэнсаванні сучаснай прозы (раман В. Карамазава “Бежанцы” і інш.). Трагедыйнае адлюстраванне даваеннага часу: В. Быкаў (“Аблава”) і інш. Чарнобыльская тэма ў творах беларускіх пісьменнікаў: І. Пташнікаў (“Львы”), І. Шамякін (“Злая зорка”), В. Карамазаў (“Краем Белага шляху”) і інш. Паказ пасляваеннага жыцця ў рамане Г. Далідовіча “Заходнікі”. Даследаванне складаных сацыяльных працэсаў сучаснасці, узмацненне ўвагі да маральна-псіхалагічных, экалагічных і агульначалавечых праблем (І. Шамякін, В. Казько, В. Адамчык, А. Федарэнка і інш.). Тэндэнцыя да звужэння тэкставых рамак празаічных твораў. Сінтэтычнасць і дынамізм жанравых структур. Кніга навел Г. Марчука “Урсула” (2003). Своеасаблівасць літаратурнай прыпавесці (кніга Я. Сіпакова “Тыя, што ідуць”, інш.). Лірычныя мініяцюры Я. Брыля (кнігі “Вячэрняе”, “Пішу як жыву”, “Дзе скарб ваш” і інш.).

Новыя падыходы ў мастацкім асэнсаванні ваеннага мінулага. Трагічная праўда часу ў творах другой паловы 80—90-х гг. (А. Адамовіч, В. Быкаў, І. Шамякін, І. Чыгрынаў і інш.). Творы першага дзесяцігоддзя XXI ст.: лейтматыў у творах А.Кудраўца, У.Сцяпана, Л.Дранько-Майсюка, “У кожнага – свая вайна” М.Дубоўскага, інш.

Творы, напісаныя на мемуарным матэрыяле, звязаныя з рэпрэсіямі, парушэннем законнасці: М. Бяганская, Л. Геніюш, С. Грахоўскі, П. Крэнь, Б. Мікуліч, П. Пруднікаў.

Сацыяльныя і маральна-этычныя праблемы ў прозе пра беларускую вёску (А. Жук, В. Казько, А. Федарэнка і інш.). Праблема адносін чалавека і прыроды . Працяг чарнобыльскай тэмы: творы П.Міско, Л.Левановіча. Традыцыя мастацкага урбанізму і творчасць М. Стральцова. Прыход у літаратуру “дзяцей горада”. Горад у сучаснай паэзіі (Г. Булыка, А. Глобус, Л. Рублеўская, і інш.). Адлюстраванне урбанізаванага жыцця і побыту ў празаічных творах А. Асташонка, Г. Багданавай і інш. Стасункі індывідуальнага і грамадскага, праблемы беларускага соцыуму ў творах апошняга дзесяцігоддзя (У.Дамашэвіч, Г.Далідовіч, Г.Марчук, С.Лобач, А.Рыбак, інш.).

Гістарызм мыслення беларускіх пісьменнікаў. Сінтэз гістарычнай праўды з элементамі мастацкага домыслу. Галерэя гістарычных вобразаў у сучаснай літаратуры. Гераічнае і трагічнае ў сучаснай паэзіі пра беларускае мінулае (балады, вершы, паэмы М. Арочкі, А. Лойкі, Т. Бондар, А.

Пісьмянкова і інш.). Адлюстраванне гістарычнага лёсу славян у кнізе Я. Сіпакова “Веча славянскіх балад”, жанравая спецыфіка твораў паэта. Падзеі і вобразы беларускай гісторыі ў празаічных творах сучасных пісьменнікаў (І. Шамякін, В. Іпатава, Г. Далідовіч, К. Тарасаў, У. Арлоў, В. Чаропка, А. Наварыч). Канцэпцыя мінулага ў раманах Л. Дайнекі “Меч князя Вячкі”, “След ваўкалака”, “Жалезныя жалуды”. Тэндэнцыя гістарызму ў паэзіі і прозе Т. Бондар. Дасягненні ў раманным жанры У.Гніламёдава.

Пашырэнне мастацкага досведу ў сучаснай літаратуры. Формы і прыёмы мастацкай умоўнасці (В. Казько, У. Рубанаў, А. Казлоў, інш.). Фантасмагорыя і містыка як спосаб мастацкага светаасэнсавання. Антыутопія ў сучаснай літаратуры. Выкарыстанне пісьменнікамі міфалагічных і казачных сюжэтаў і матываў. Узбагачэнне беларускай фантастыкі (А.Паўлухін, Г.Ануфрыеў). Навукова-фантастычныя гіпотэзы і іх уплыў на мастацкую літаратуру. Жанр фэнтэзі ў сучасным мастацтве (В.Грамыка). Адметнасць стылістыкі і кампазіцыі фантастычных твораў Л. Дайнекі “Чалавек з брыльянтавым сэрцам”, Я. Сіпакова “Блуканні па іншасвеце”. Фантастычныя карціны ў творах В. Гігевіча “Карабель”, “Палтэргейст”, “Кентаўры” і інш. Паэтыка дэтэктыўнай літаратуры (займальны сюжэт, прынцып загадкавасці, вострая інтрыга і інш.). У. Караткевіч і эвалюцыя дэтэктыўнага жанру ў беларускай літаратуры.

Агульныя тэндэнцыі ў развіцці сучаснай беларускай драматургіі. Зварот да вопыту тэатра і драмы абсурду: А. Дзялендзік, Г. Багданава, І. Сідарук і інш. Сучасная п’еса і герменеўтыка. П’еса-рымейк у сучаснай драматургіі. Гістарычныя рэтраспекцыі ў сучаснай драматургіі (І. Чыгрынаў, А. Петрашкевіч, А. Дудараў, Р. Баравікова, інш.). Сатыра і гумар у камедыях Г. Марчука, У. Сауліча і інш.

Сацыяльна-маральная завостранасць канфлікту ў п’есах М. Матукоўскага. Праблематыка твораў драматурга, іх жанравая адметнасць. Майстэрства тыпізацыі і камізму ў п’есе “Мудрамер” (1987). Публіцыстычная скіраванасць драмы “Бездань” (1992), выяўленне ў ёй складанасці ўнутранага стану чалавека. Гратэск і парадокс у мастацкай сістэме камедыі “Калізей” (1992).

Драматургія для дзяцей. “Рыцарская” п’еса (С. Кавалёў, Л. Рублеўская, П. Васючэнка, інш.).

Полілінгвістычнасць літаратуры Беларусі. Стварэнне мастацкіх твораў на розных мовах: рускай, польскай, ідыш, іспанскай, нямецкай, курдскай, армянскай і інш. Літаратурны друк на рускай мове. Пісьменнікі, якія пісалі ці пішуць на дзвюх або некалькіх мовах (А. Адамовіч, Р. Рэлес, Г. Чарказян, інш.). Рускамоўная літаратура Беларусі: В. Блажэнны, А. Дракахруст, А. Сульянаў, М. Чаргінец, А. Папова, С. Алексіевіч, А. Аўруцін, Э. Скобелеў, інш.

Роля і стан мастацкага перакладу на сучасным этапе. Замежныя пісьменнікі на беларускай мове. Беларускае мастацкае слова ў сусветнай культурнай прасторы. Міжнародныя літаратурныя сувязі і кантакты. Уганараванне дзяржаўнымі ўзнагародамі і літаратурнымі прэміямі іншых

краін беларускіх пісьменнікаў. Беларуская літаратура ў свеце, выхад анталогій беларускай паэзіі ў Расіі, Балгарыі, Югаславіі, інш. Перакладчыкі і папулярызатары беларускай мастацкай літаратуры за мяжой: Ф. Няўважны, Е. Путрамант, В. Жыдліцкі, Ч. Сэнюх, Н. Вылчаў, С. Паптонеў, Р. Рандаў, В. Сінг, М. Абала, Р. Эўцімава і інш. Беларуская літаратура замежжа (М. Сяднёў, Я. Юхнавец, М. Кавыль, А. Бярозка, У. Клішэвіч, інш.). Творчасць пісьменнікаў замежжа ў агульнанацыянальным літаратурным кантэксце.

## 5.1. ІВАН ШАМЯКІН
(1921—2004)

Біяграфія. Удзел І. Шамякіна ў Вялікай Айчыннай вайне.

Складанасць канкрэтных абставінаў ваеннага часу ў аповесці “Помста” (1945). Маральная сутнасць канфлікту. Гуманістычны пафас твора.

Раман “Глыбокая плынь” (1949), яго папулярнасць і высокая грамадская ацэнка. Прычыны фенаменальнага поспеху твора. Блізкасць герояў рамана да іх прататыпаў. Наватарства пісьменніка ў распрацоўцы партызанскай тэмы. Аўтарская засяроджанасць на ўнутраным свеце чалавека. Ідэйна-мастацкая трактоўка вобразаў сям’і Маеўскіх. Тэхналогія мадэлявання мастацкай прасторы ў рамане, яго кампазіцыя. Сюжэтны дынамізм, займальнасць у разгортванні падзей, чытэльнасць твора.

Адлюстраванне ў рамане “У добры час” (1952) першых гадоў мірнага жыцця. Змены ў ацэнцы твора крытыкай на працягу дзесяцігоддзяў.

Творчасць І. Шамякіна другой паловы 50-х — 60-х гг. Наватарская адметнасць рамана “Крыніцы” (1956). Надзённасць, актуальнасць пастаўленых праблем, асэнсаванне складаных грамадскіх працэсаў. Школа, вёска і калгаснае жыццё ў адлюстраванні празаіка. Стылёвыя асаблівасці рамана: публіцыстычнасць, спалучэнне рэалізму і рамантызму.

Сюжэтна-кампазіцыйная пабудова пенталогіі “Трывожнае шчасце”, якая ўключае цыкл аповесцей “Непаўторная вясна” (1957), “Начныя зарніцы” (1958), “Агонь і снег” (1959), “Пошукі сустрэчы” (1959) і “Мост” (1965). Аўтабіяграфічнасць твораў. Пятро Шапятовіч і Саша Траянава — тыповыя прадстаўнікі даваеннага пакалення моладзі. Лёс шамякінскіх герояў, багацце іх унутранага свету. Паэтызацыя чалавечых пачуццяў у “Непаўторнай вясне”. Шматстайнасць праяўленняў і формаў кахання. Хуткае сталенне герояў дзякуючы каханню. Шляхі-дарогі Пятра Шапятовіча і Сашы Траянавай у гады вайны. Драматызм аповесці “Начныя зарніцы”. Чалавек у франтавых абставінах (“Агонь і снег”) Наватарства пісьменніка ў паказе чалавека на вайне. Духоўная эвалюцыя герояў, іх вернасць каханню (“Пошукі сустрэчы”, “Мост”). Аповесць “Мост” — адзін з лепшых твораў беларускай літаратуры пра пасляваенную рэчаіснасць. Аголеная праўдзівасць у паказе жыццёвых супярэчнасцей. Лірычная плынь аповеду ў “Трывожным шчасці”. Майстэрства псіхалагічнага аналізу. Роля мастацкіх прыёмаў і сродкаў у індывідуалізацыі характараў (рамантызацыя, рэфлексія, псіхалагічная дэталь і інш.). Ацэнка пенталогіі ў беларускай крытыцы (В. Каваленка, В. Быкаў,

Д. Бугаёў, Р. Шкраба і інш.).

Значэнне зборнікаў І. Шамякіна “На знаёмых шляхах” (1949), “Дзве сілы” (1951), “Першае спатканне” (1956), “Матчыны рукі” (1961), “Вячэрні сеанс” (1968) у развіцці беларускага апавядання. Маральны пафас у асэнсаванні чалавека і жыцця.

І. Шамякін — адзін з лепшых у беларускай літаратуры майстроў паказу жаночых характараў. Складанасць чалавечых узаемаадносінаў у аповесці “Ах, Міхаліна, Міхаліна” (1966). Жанчына і вайна ў аповесцях “Шлюбная ноч” (1974), “Гандлярка і паэт” (1975), рамане “Зеніт” (1987) і інш.

Асэнсаванне пісьменнікам вострых маральна-этычных праблем і агульнафіласофскіх пытанняў чалавечага быцця. Сацыяльна-этычная сутнасць канфлікту ў рамане “Сэрца на далоні” (1963).

Праблемнасць рамана “Снежныя зімы” (1968). Крытычны пафас, канфліктная аснова твора. Асаблівасці паэтыкі рамана: інверсійная пабудова (спалучэнне сучаснага і мінулага), сюжэтная інтрыга, літаратурная ўмоўнасць, прыгодніцкія і дэтэктыўныя элементы.

Тэматычна-праблемная навізна рамана “Атланты і карыятыды” (1974). Архітэктура ў жыцці І. Шамякіна. Прататып галоўнага героя. Узмацненне інтэлектуальнага пачатку, мастацкага аналітызму. Сутнасць канфлікту твора.

Катэгорыя памяці, праблема злачынства і даравання ў рамане “Вазьму твой боль” (1979). Маральна-псіхалагічная сутнасць канфлікту.

Рамантызацыя ў паказе рэвалюцыйных падзей, вобраза Леніна (“Хлеб”, “Матрос з “Алега”, “Першы генерал” і інш.). Раман “Петраград — Брэст” (1983) у кантэксце беларускай лeнініяны. Выяўленне аўтарскіх ідэалаў і поглядаў.

І. Шамякін – летапісец эпохі (У.Гніламёдаў). Творчая актыўнасць пісьменніка ў другой палове 80-х — 90-я гг.

Аповесць “Драма” (1988) як мастацкі дакумент часу перабудовы. Мастацкае пераасэнсаванне савецкай гісторыі ў аповесці “Ахвяры” (1990).

Першы раман пра Чарнобыль у беларускай літаратуры — “Злая зорка” (1991). Праўда пра аварыю і яе наступствы. Пратэст пісьменніка супраць сляпога тэхнічнага прагрэсу, супраць антычалавечых эксперыментаў над народам, на якія яго асудзілі бяздушныя, палахлівыя і раўнадушныя кіраўнікі. Працяг асэнсавання трагічных падзей у аповесці “Зона павышанай радыяцыі” (1997).

Гістарычны раман “Вялікая княгіня” (1996). Арыентаванасць пісьменніка на ідэалы хрысціянства. Духоўны свет княгіні Алены. Паэтыка рамана.

Адлюстраванне разнастайных бакоў сучаснага жыцця і маральна-этычная праблематыка ў аповесцях “Сатанінскі тур” (1993), “Падзенне” (1994), “Без пакаяння” (1995), “Палеская мадонна” (1996), “Крывінка” (1995), “Завіхрэнне” (1998), “У засені палаца” (2000) і інш. Набліжэнне аўтарскай трактоўкі свету да антыутопіі і літаратуры абсурду. Сацыяльна-крытычная і гуманістычная пазіцыя аўтара. Кантрасты і парадоксы сучаснасці ў творах пісьменніка. Рэакцыя пісьменніка на разбурэнне чалавечых узаемаадносінаў.

Сацыяльны тыпаж герояў у прозе 90-х гг. Герой і антыгерой у мастацкім мысленні аўтара. Паказ вобразаў-масак перараджэнцаў, маральных дэгенератаў (Раман Юшкоўскі, Казімір Анкуда і інш.). Лёс людзей мастацтва, культуры і навукі ў аповесцях "Paradis auf erden" (1992), "Вернісаж" (1992), "Адна на падмостках" (1993), "Пошукі прытулку" (1999). Сям'я, дзеці і моладзь у эпоху перамен і сацыяльнай неўладкаванасці ("Палеская мадонна", "Крывінка" і інш.). Трывога пісьменніка пра захаванне духоўнасці, вечных агульначалавечых каштоўнасцей. Хваласпеў жонцы і жанчыне-маці ў аповесці "Слаўся, Марыя!" (1998). Рэалізм як вызначальны творчы метад І. Шамякіна. Інтэртэкстуальнасць твораў пра сучаснасць, постмадэрнісцкія рысы пісьма. Лаканізм стылю аповесцей, жорсткая манера адлюстравання.

Уменне І. Шамякіна ўвасобіць "уласна чалавечы бок вялікіх падзей... XX ст." (М. Тычына).

Сімволіка загалоўкаў у творах І. Шамякіна.

Экранізацыя твораў І.Шамякіна.

Публіцыстыка, літаратурная крытыка і дзённікавыя запісы І. Шамякіна. Кнігі "Размова з чытачом" (1973), "Карэнні і галіны" (1986), "Роздум на апошнім перагоне" (1998), "Начныя ўспаміны" (2002—2004. Папулярнасць мастацкіх твораў празаіка, яго сапраўдная народнасць. Уплыў І. Шамякіна на сучасны літаратурны працэс. Уклад у развіццё нацыянальнага пісьменства і культуры. Зборы твораў І. Шамякіна.

## 5.2. ІВАН ЧЫГРЫНАЎ
(1934—1996)

Жыццё і творчасць празаіка.

Апавяданні І. Чыгрынава са зборнікаў "Птушкі ляцяць на волю" (1965), "Самы шчаслівы чалавек" (1967), "Ішоў на вайну чалавек" (1973). Спецыфіка жанру апавяданняў-вандровак, апавяданняў-даследаванняў. Дакументалізм як адна з прыкмет "малой прозы" І. Чыгрынава.

Пенталогія пра вайну, яе жанравая адметнасць. Асаблівасці мастацкага хранатопу. Гісторыя напісання. Раман "Плач перапёлкі" (1972). Мастацкая канцэпцыя "ўсенароднай вайны". Вобразы беларускай прыроды ў творы. Калектыўны партрэт народа. Тыпы "народных філосафаў" (Парфён Вяршкоў, Кузьма Прыбыткоў). Гісторыя беларусаў у біяграфіі Дзяніса Зазыбы. Вобраз Радзівона Чубара, тып "сталінскага кіраўніка". Вобразы калабарантаў (Брава-Жыватоўскі, Мікіта Драніца).

Раман "Апраўданне крыві" (1977). Роля дыялогаў у вобразнай структуры. Попыт на "ідэалагічныя каштоўнасці" ва ўмовах акупацыі і спрэчкі галоўных герояў (Зазыба і Чубар). Пераасэнсаванне даваеннай беларускай гісторыі. Праблема гераізму і ахвярнасці ў разуменні персанажаў і аўтара. Цана Вялікай Перамогі.

Раман "Свае і чужынцы" (1984). Драматычны канфлікт паміж станоўчымі і адмоўнымі персанажамі твора як увасабленне трагедыі народа. Народная мараль і яе праявы ў паводзінах жыхароў вёскі Верамейкі. Паглыбленне цікавасці да гістарычных асноў нацыянальнага характару.

Апісанне народных абрадаў і культурных традыцый. Вобразы здраднікаў у рамане.

Раман "Вяртанне да віны" (1992). Праблема адказнасці і віны як сведчанне зменаў у светапоглядзе празаіка. Рэалістычны паказ трагедыі народа на акупіраванай тэрыторыі.

Раман "Не ўсе мы згінем" (1996). Змены ў стылістыцы твора. Сістэма вобразаў.

Драматургія І. Чыгрынава. Арыгінальнае прачытанне вядомых фактаў і падзей беларускай мінуўшчыны ў п'есах "Звон — не малітва", "Следчая справа Вашчылы", "Чалавек з мядзведжым тварам", "Ігракі", "Осцей — Альгердаў унук" і інш.

І. Чыгрынаў і нацыянальная мастацкая традыцыя (К. Чорны, М. Гарэцкі і інш.).

## 5.3. РЫГОР БАРАДУЛІН
(нар. у 1935 г.)

Біяграфія. Вайна ў лёсе паэта. Кнігі паэзіі "Маладзік над стэпам" (1959), "Рунець, красаваць, наліваццa!" (1961), "Нагбом" (1963), "Неруш" (1966), "Адам і Ева" (1968) і інш. Інтэнсіўнае развіццё творчай індывідуальнасці паэта, яго наватарства. Самабытнасць яго паэтычнага голасу сярод творцаў "новай хвалі". Трывога паэта пра нацыянальныя духоўныя каштоўнасці ("Неруш" і інш.).

Творчая актыўнасць. Багацце і разнастайнасць творчых набыткаў. Паэтычны плён: кнігі "Рум" (1974), "Абсяг" (1978), "Вечалле" (1980), "Амплітуда смеласці" (1983), "Маўчанне перуна" (1986), "Самота паломніцтва" (1990), "Міласэрнасць плахі" (1992), "Евангелле ад Мамы" (1995), "Босая зорка" (2001) і інш. Пераклады сусветнай класікі. Р. Барадулін як дзіцячы пісьменнік. Зварот паэта да народнага гумару, смешныя гісторыі, анекдоты ад Барадуліна, эпіграмы і шаржы.

Канцэптасфера Р. Барадуліна. Асноўныя канцэпты і матывы яго паэзіі. Багацце вобразаў і канкрэтыкі нацыянальнага космасу (Вечалле, рэкі і рачулкі, хата, дарога, лес і інш.). Радзіма як вечная і непераходная каштоўнасць быцця. Культ роднага кутка ў паэзіі Р. Барадуліна, прылучэнне да першаасноў духоўнага існавання ("Трэба дома бываць часцей" і інш.). Сувязь барадулінскай паэзіі з традыцыяй беларускай пейзажнай паэзіі. Вобразная яркасць і сакавітасць прыродаапісанняў Р. Барадуліна, жывапіснасць аўтарскага стылю. Паэтызацыя вяскова-сялянскага побыту, беларускага ладу жыцця. Імкненне паэта зберагчы моўна-этнічную, генную памяць народа. Вобраз маці як духоўны цэнтр нацыянальнага свету.

Блакадная ваенная рэчаіснасць, беларуская вёска падчас акупацыі, лёс дзяцей у адлюстраванні паэта. Раскрыццё драматызму дзіцячага свету ў паэмах "Трыпціх", "Блакада", вершах "Бацьку", "Палата мінёраў", "Стэарынавая свечка", "Хлебнічак" і інш.

Трагізм гучання твораў Р. Барадуліна пра Чарнобыль. Матывы смутку, жалобы, смяротнай пагрозы ў кнігах "Самота паломніцтва" і "Міласэрнасць плахі".

Эстэтычная адметнасць кнігі "Ксты" (2005). Скіраванасць думак-памкненняў да Бога. Рэлігійна-духоўныя і маральна-філасофскія шуканні паэта.

Грамадзянская лірыка Р. Барадуліна. Патрыятычныя пачуцці і гістарызм як аснова светапогляду паэта. Сцвярджэнне ідэі духоўнай моцы і годнасці беларускага народа. Хваласпеў роднаму слову, трывога за яго лёс.

Канцэпт кахання ў паэзіі Р. Барадуліна. Тонкі лірызм, эмацыянальная экспрэсіўнасць у выяўленні інтымных пачуццяў. Узнёслае і светлае, драматычнае і балючае ў творах на любоўную тэматыку. Краса кахання і музыка слова ў вершах паэта.

Феномен паэтычнага майстэрства Р. Барадуліна. Барадулінскі метафарызм у кантэксце нацыянальнай паэтычнай традыцыі (У. Дубоўка, Я. Пушча і інш.). Інатанацыйна-гукавая інструментоўка вершаў "Станцыя Грамы", "Крык крыг", "Да партрэтаВаўчэнскага возера ў гуках" і інш. Гульнёвы прынцып у вершах Р. Барадуліна і творчасць постмадэрністаў. Гулліва-смехавая стыхія ў паэме "Смаргонская акадэмія" (1975).

Разнастайнасць жанрава-стылёвых формаў у творчасці Р. Барадуліна: верлібр, акрасанет, пацеры, навела, лера-паэма і інш.

Моўная лабараторыя Р. Барадуліна. Майстэрства паэта ў галіне словатворчасці. Барадулінскія аказіяналізмы, лексічныя новаўтварэнні як сведчанне арыгінальнасці аўтарскага самавыяўлення, разняволення фантазіі паэта, пошукавага характару яго думкі. Адкрыццё новых сэнсаў і адценняў слова.

## 5.4. ЯНКА СІПАКОЎ
(1936 - 2011)

Біяграфія. Шырыня творчага дыяпазону пісьменніка.

Прастата і ўзвышанасць ранняй паэзіі: "Сонечны дождж" (1960), "Лірычны вырай" (1965), "Дзень" (1968), "З вясны ў лета" (1972), "Вочы ў вочы" (1978, выбранае), "Усміхніся мне" (1984). Паэзія кахання, пейзажная лірыка.

Наватарскі характар кнігі "Веча славянскіх балад" (1973). Шырокі ахоп гістарычных падзей. Канцэпцыя чалавека і часу ў баладах "Чубы", "Булава", "Вяселле", "Касцёр" і інш.

Паглыбленне філасофскага зместу ў прозе Я. Сіпакова. Цыкл апавяданняў "Жанчына сярод мужчын" (1980). Інтэлектуалізацыя прозы пісьменніка. Аповесці-канцэпцыі, апавяданні-канцэпцыі, творы — "формулы жыцця". Кнігі "Крыло цішыні" (1976), "Усе мы з хат" (1982), "Спадзяванне на радасць" (1983), "Пяць струн" (1984), "Сад людзей" (1985), "Журба ў стылі рэтра" (1990), "Тыя, што ідуць" (1993), фантастычная аповесць "Блуканні па іншасвеце" (1994) і інш.

Ідэйна-жанравыя пошукі пісьменніка. Прыпавесцевасць яго твораў. Навізна кнігі прытчаў "Тыя, што ідуць" (1993). Філасофска-канцэптуальная аснова твораў празаіка. Адметнасць стылю пісьменніка, павышэнне суб'ектывізму, выкарыстанне алегорый, сімволікі, настраёвы, пачуццёвы характар прозы.

"Паэтызацыя" прозы і "празаізацыя" паэзіі. Паэмы ў прозе з кніг "Ахвярны двор" (1991). Праблема наступстваў чарнобыльскай катастрофы ў паэме "Одзіум".

Мініяцюры, эсэ, крытычныя артыкулы Я. Сіпакова.

Пераклады класічнай паэзіі. Жанрава-стылёвае ўзбагачэнне беларускай мастацкай літаратуры ў кнігах Я. Сіпакова.

## 5.5. ВІКТАР КАЗЬКО

(нар. у 1940 г.)

Віктар Казько як прадстаўнік "міфалагічнага рэалізму" ў беларускай літаратуры. Жыццяпіс і творчасць пісьменніка.

Лёс "дзяцей вайны. Мастацкае адлюстраванне біяграфіі ў аповесцях "Высакосны год" (1972), "Добры дзень і бывай" (1974). Аповесць "Суд у Слабадзе" (1978). Сімволіка назвы. Міфавобразы і міфаматывы ў творы. Маналогі і "плынь свядомасці" ў творы.

Раман "Неруш" (1981). Праблемы экалогіі прыроды ў рамане і ў аповесцях-"спадарожніках" "Цёмны лес — тайга густая" (1973), "Цвіце на Палессі груша" (1978). Узбагачэнне паняцця рэалізму. Міфалагічнае ў прозе В. Казько (Княжбор, Жалезны Чалавек). Вобраз Палесся як Эдэму. Вобразы палешукоў.

Раман "Хроніка дзіцячага саду" (1986). Сімволіка Саду як зямнога раю. Вобразы дзяцей-сірот. Жыццё чалавека ў свеце прыроды. Роля гістарычнай рэтраспекцыі ў стварэнні вобраза сучаснасці. Міфалагічны пачатак ва ўспрыманні свету.

Драматызацыя жанру і паглыбленне філасафізму ў аповесцях "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" (1993), "Но Пасаран" (1993), "Прахожы" (1995), "Да сустрэчы..." (1997) і інш. Засваенне сэнсу экзістэнцыяльнай катэгорыі абсурду ў дачыненні да сучаснай беларускай гісторыі ў рамане "Бунт незапатрабаванага праху" і ў аповесці "Час збіраць косці" (2005). Эсэістыка пісьменніка.

## 5.6. РАІСА БАРАВІКОВА

(нар. у 1947 г.)

Асоба Р. Баравіковай, чалавечы воблік пісьменніцы. Жыццёвы і творчы шлях.

"Сонечнасць" ранняй паэзіі. Прастора ў вершах паэтэсы. Топасы радзімы і іх вобразна-паэтычнае ўвасабленне ("Наша вёска", "Прыводзяць шляхі-дарогі...", інш.). Архетыповы вобраз саду ("Мне сёння прыснілася хата...", "Мазурка", "Восеньскі сад", "Рамантычная дзяўчына шукае шчасце",

інш.). Каляровая гама твораў. Паэтыка пейзажу (адухаўленне, маляўнічасць эпітэтаў і метафар, яркасць параўнанняў, мастацкіх дэталяў, інш.).

Інтымная лірыка ў кнігах “Рамонкавы бераг” (1974), “Слухаю сэрца” (1978), “Такое кароткае лета” (1981), “Адгукнуся голасам жалейкі” (1984), “Каханне” (1987), “Пад небам першага спаткання” (1990), “Люстэрка для самотнай” (1992), “Сад на капялюшыку каханай” (1998). Парадаксальнасць і адметнасць жаночага мыслення. Роздум пра прыроду кахання. Свет кахання і прырода. Лірыка Р. Баравіковай у нацыянальным і славянскім літаратурным кантэксце (К. Буйло, Е. Лось, Я. Янішчыц, Г. Ахматава, М. Цвятаева, Л. Кастэнка, В. Шымборская і інш.). Экспрэсіўнасць вобразна-выяўленчых сродкаў.

Філасофская рэфлексія, медытатыўны роздум у лірыцы паэтэсы. Ускладненасць пачуццяў, спасціжэнне сутнасці жыцця, чалавечага шчасця, зямнога існавання (“Жыццё, жыццё,— начэй і дзён паток!..”, “Пахілы клён убор зялёны скіне...”, “Здзіўляемся загадцы Баальбека...”, “Жыву, і, дзякуй, не ў прасторы голай...”, інш.). Раз’яднанасць мары і явы, прага суладдзя, красы і гармоніі.

Зварот да вобразаў мінулага ў творах “Партрэт жонкі Станіслава Ксаверыя Прушынскага XVIII стагоддзя”, “Кастусь Каліноўскі”, “Саламея”, “Барбара Радзівіл”, інш. Драматургічнае майстэрства ў паэме “Барбара Радзівіл” (1992). П’еса “Пятля часу” (1996): праблемная скіраванасць, жанравыя і сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці.

Проза Р. Баравіковай. Аповесць “Кватарантка” (1980): асэнсаванне праблем свайго часу, жаночых лёсаў. Наватарства кнігі “Вячэра манекенаў” (2002). Асаблівасці псіхалагічнай фантастыкі Р. Баравіковай.

Творы для дзяцей “Галенчыны “Я”, альбо Планета Цікаўных Хлопчыкаў” (1990), “Дзве аповесці пра Міжпланетнага Пажарніка і казка пра жабяня Квыш-квыш” (1996).

Перакладчыцкая дзейнасць.

## 5.7. АЛЕСЬ РАЗАНАЎ

(нар. у 1947 г.)

Жыццяпіс і творчасць. Лёс зборніка “Адраджэнне” (1970). Сімволіка назвы. Праблематыка кнігі. Пошукавы характар зборніка “Назаўжды” (1974). Агульныя рамантычны пафас кнігі і паглыбленне ў нацыянальную гісторыю беларусаў, цікавасць да яе трагічных старонак. Эксперыменты ў сферы жанру і стылю. Аўтарскі жанр “пункціраў” як варыянта філасофскай лірыкі. Асаблівасці асацыятыўна-вобразнага пісьма і адцягнена-філасофская змястоўнасць верша.

Зборнік “Каардынаты быцця” (1976). Жанр філасофскай паэмы ў кнізе. Пошукі “новай рэальнасці” (“метарэальнасці”). Зварот да старажытнагрэчаскай міфалогіі ў “Паэме калодзежа”.

Зборнік “Шлях — 360” (1981). Наватарства ў сферы тэматыкі і паэтыкі. Уплыў усходніх філасофскіх сістэм на творчае станаўленне. Біблія ва

ўспрыняцці і ацэнцы паэта. Квантэмы як аўтарскі жанр і яго мастацка-вобразныя характарыстыкі.

Зборнікі "Вастрыё стралы" (1988) і "Паляванне ў райскай даліне" (1995) як працяг інтэлектуальна-філасофскіх і творча-эстэтычных пошукаў паэта. Імкненне да філасофскага асэнсавання глабальных праблем. Версэты як аўтарскі жанр філасофскай лірыкі і яго стылёвыя прыкметы. Працяг паэтычнага аповеду пра жыццё рэчаў у нацыянальнай гісторыі беларусаў у зборніку "У горадзе валадарыць Рагвалод" (1992). Узбагачэнне паэтычнай лексікі (фанетыка і паэтыка і іх узаемасувязь у вершах). Умоўна-асацыятыўная вобразнасць.

Зборнікі "Рэчаіснасць" (1998) і "Гановерскія пункціры" (2002) як працяг і развіццё пошукаў паэта ў новай літаратурнай сітуацыі. Кніга "Wortdichte" (2003), напісаная па-нямецку. Паэмы "Гліна", "Камень", "Жалеза" і сэнс архетыпаў у беларускай ментальнасці. Узбагачэнне вобразна-паэтычных магчымасцей беларускай прасодыі. Абвостранае адчуванне навізны ва ўспрыняцці свету. Асэнсаванне супярэчнасцей гістарычнага прагрэсу. Пошукі духоўнай апоры ў гісторыі старадаўніх цывілізацый. Жанрава-стылёвыя інавацыі (квантэмы, зномы, вершаказы, версэты) і іх творчыя трансфармацыі ў сучаснай паэзіі.

Эсэістыка А. Разанава ("Васілёк і жыта", "Сёе-тое пра карані і пра ісціну", "Нататкі на дубовых лістах", "Медытацыі наўзбоч "Шляху — 360").

Пераклады А. Разанава.

## 5.8. ЯЎГЕНІЯ ЯНІШЧЫЦ

(1948—1988)

Асоба і лёс. Першая кніжка "Снежныя грамніцы" (1970) і яе ацэнка ў тагачаснай крытыцы. Я. Янішчыц і яе літаратурныя раўналеткі. Далейшая творчая эвалюцыя паэтэсы, выхад кніг "Дзень вечаровы" (1974), "Ясельда" (1978), "На беразе пляча" (1980), "Пара любові і жалю" (1983), "Каліна зімы" (1987). Кнігі творчай спадчыны паэтэсы "У шуме жытняга святла" (1988) і "Выбранае" (2000).

Я. Янішчыц як прадаўжальнік нацыянальных мастацкіх традыцый — лірызму, духоўнасці, псіхалагізму і інш. Рэалістычна-зямная аснова яе паэзіі. Архетыпы і топасы (балота, лес, поле, Ясельда і інш.). Паэтызацыя родных краявідаў і палескага краю ("Прыедзь у край мой ціхі...", "Старана мая азёрная" і інш.). Вясковы свет як сфера ідэальнага, прыгожага, гарманічнага быцця. Увага да жыццёвай канкрэтыкі і дэталяў вяскова-сялянскага побыту. Імкненне прымірыць у сваім сэрцы вёску і горад ("Я вас люблю"). Трывога за будучыню беларускай вёскі. Выяўленне ў творах філасофіі еднасці чалавека і прыроды. Меладыйнасць і пластычнасць паэтычнай мовы.

Інтымная лірыка.

Вобразы землякоў, працавітых людзей беларускага Палесся. Вобраз маці як апірышча духоўнага свету Я. Янішчыц. Аднавяскоўцы паэтэсы як ахвяры часу, пакутнікі, людзі трагічнай эпохі. Адбітак вайны на чалавечых

лёсах. Знакі і сімвалы народнай бяды ў творах, іх антываенны пафас. Абвостранае гуманістычнае разуменне чарнобыльскай трагедыі.

Музычна-песенная прасодыя верша. Зварот да народнай культуры, арганічнае выкарыстанне фальклору сваёй мясцовасці (песні, пабытавыя гісторыі, прымаўкі, народныя прыкметы, параўнанні і інш.), палескай дыялектнай лексікі, імёнаў, тапонімаў.

Творчасць паэтэсы ў кантэксце нацыянальнай (Цётка, К. Буйло, Е. Лось, І. Мележ, І. Пташнікаў і інш.) і сусветнай (Г. Ахматава, М. Цвятаева, П. Верлен, А. Блок, С. Ясенін, М. Рубцоў, Р. Казакова, Л. Кастэнка і інш.) літаратур.

Паэмныя творы Я. Янішчыц, іх жанравая спецыфіка, вобразны свет, сюжэтна-кампазіцыйная адметнасць. Спалучэнне сілаба-танічнага верша і рыфмаванай прозы ў паэме "Ягадны Хутар". Лірыка-драматычны пачатак, эмацыянальная экспрэсія і псіхааналіз у паэмах "Акно ў дождж" і "Прызнанне вачамі". Грамадзянскасць пафасу "Зорнай паэмы".

Набыткі Я. Янішчыц у жанры апавядання. Непасрэднасць, даверлівасць аповеду, паэтычнасць і гумар як вызначальныя стылёвыя асаблівасці яе прозы.

Асоба і творчасць Я. Янішчыц у ацэнках вядомых пісьменнікаў і крытыкаў.

## 5.9. АЛЯКСЕЙ ДУДАРАЎ
(нар. у 1950 г.)

Асоба і творчасць А. Дударава ў кантэксце сучаснай беларускай драматургіі. Дасканалае веданне ім законаў сцэны. Сцэнічнасць яго п'ес.

Жыццяпіс і творчасць. Шлях да поспеху. Акцёрская кар'ера. Творчыя пошукі свайго стылю ў драматургіі.

Зборнік апавяданняў "Святая птушка" (1979). Жанрава-стылёвыя асаблівасці прозы А. Дударава і праблема драматызацыі сюжэта. Вобразы герояў-"дзівакоў" як носьбітаў беларускіх уяўленняў пра мараль (павышаная чуласць, ранімасць, арыентацыя на высокае і прыгожае ў жыцці, вонкавая прасцякаватасць). Праблема духоўнасці ў бездухоўным свеце. Тыпалогія твораў А. Дударава і В. Шукшына, сувязь дударaўскіх персанажаў з традыцыйнымі героямі твораў беларускіх класікаў, блазнамі — дзівакамі, жартаўнікамі, прытворшчыкамі, з сусветнай традыцыяй "карнавальнай літаратуры".

П'есы "Выбар" (1979) і "Апошні ўзлёт" (1982). Актуальнасць маральна-этычнай праблематыкі (каштоўнасці чалавечага жыцця, "неперспектыўных вёсак"). Яскравыя людскія тыпы ў п'есе "Вечар" (Гастрыт, Мульцік, Ганна). Канфлікт асобы і асяроддзя. Антыномія як прынцып пабудовы сістэмы вобразаў. Рамантыкі і рэалісты, ідэалісты і прагматыкі.

П'еса "Парог" (1981). Сімволіка-метафарычны пласт у змесце п'есы (вобраз "парога"). Руская і беларуская крытыка пра п'есу.

П’еса “Радавыя” (1984), яе сцэнічны поспех. Ідэйна-вобразныя і жанрава-стылёвыя асаблівасці твора ў кантэксце беларускай і рускай “ваеннай прозы”. Сістэма вобразаў.

Творчы пошук у час змены літаратурнага цыкла. Ідэйна-мастацкія і жанрава-стылёвыя эксперыменты ў сферы сюжэта (тэатральныя эфекты, чыста драматургічныя прыёмы, схематызм вобразаў). Новыя героі (“лішнія людзі”, “людзі дна”, бамжы, бадзягі) у п’есе “Злом” (1987). Рэальнае і фантастычнае ў драме “Адцуранне” (1994), раскрыццё ў ёй трагізму Чарнобыля. Засваенне драматургічнага вопыту майстроў сімвалістычнай трагедыі (сімволіка, умоўнасць, фантасмагорыя, “кніжнасць”).

Зварот да нацыянальнай гісторыі ў п’есах “Купала” (“Князь Вітаўт”, 1994), “Палачанка” (1998), “Чорная панна Нясвіжа” (1998), “Крыж” (2000), інш. Гістарычная праўда і творчая фантазія А. Дударава. “Новы” Дудараў. Мастацкае пераасэнсаванне (“тэатралізацыя”) беларускай гісторыі. Вобразы беларускіх жанчын (Рагнеда, Еўфрасіння Полацкая, Барбара Радзівіл). Вобразы антыгерояў (Бона Сфорца, Мнішак, Бжэнка). Творчы працяг маральна-этычных пошукаў драматурга на гістарычным матэрыяле і хрысціянская традыцыя. Спроба аўтара зрабіць пэўныя філасофскія высновы. Шэкспіраўская тэатральная традыцыя ў інтэрпрэтацыі А. Дударава (сюжэтная хранікальнасць, тэатральная відовішчнасць, вольны верш, масавыя сцэны, асаблівасці кампазіцыі, пабудова мізансцэн, імклівая змена месца дзеяння, пераключэнне стылёвых рэгістраў, вобразы міфалогіі, сімволіка дэталей і падрабязнасцей).

Пераклады і інсцэніроўкі А. Дударавым драматургічнай класікі на беларускай сцэне (“Песня пра зубра”, “Рычард III”, “Макбет”, “Гамлет”, інш.).

П’есы “Кім” (2000) і “Люці” (2002), іх жанравая адметнасць і вобразы-персанажы.

Погляды А. Дударава на перспектывы інтэграцыі беларускай драматургіі і нацыянальнага тэатра ў еўрапейскі літаратурна-культурны працэс.

А. Дудараў — сцэнарыст мастацкіх фільмаў (“Белыя росы”, “Суседзі”, “Кола” і інш.).

Бібліяграфія арыгінальных выданняў А. Дударава: “Дыялог” (1987), “Крыж” (2002), “Князь Вітаўт” (2005).

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## КРЫНІЦЫ МАСТАЦКІХ ТЭКСТАЎ

*Адамович А.* Собрание сочинений: В 4 т. — Мн., 1981—1983.
*Адамовіч А.* Vixi. — Мн., 2002.
*Адамовіч А., Брыль Я., Калеснік У.* Я з вогненнай вёскі... — Мн., 1983.
*Адамовіч А., Гранін Д.* Блакадная кніга. — Мн., 1985.
*Адамчык В.* Выбраныя творы: У 2 т. — Мн., 1983.
*Адамчык В.* Выбраныя творы: У 2 т. — Мн., 1995.
*Адамчык М.* Забойства на Каляды: Аповесць, апавяданні. — Мн., 1994.
*Алексіевіч С.* У вайны не жаночае аблічча. — Мн., 1991.
*Анталогія беларускай паэзіі:* У 3 т. — Мн., 1983. — Т. 2, 3.
*Арлоў У.* Сны імператара: Аповесці, эсэ. — Мн., 2001.
*Арочка М. М.* Памяць зярнятаў: Выбр. — Мн., 1991.
*Асташонак А.* Жоўты колер белага снегу: Камерная проза. — Мн., 2006.
*Багданава Г.* Чалавек без адраса: Апавяданні. — Мн., 1991.
*Багдановіч М.* Выбраныя творы. — Мн., 1996.
*Багдановіч М.* Поўны збор твораў: У 3 т. — 2-е выд. — Мн., 2001.
*Баравікова Р.* Каханне: Кн. лірыкі. — Мн., 1987.
*Баравікова Р.* Люстэрка для самотнай: Вершы, пер. і драм. паэма. — Мн., 1992.
*Баравікова Р.* Сад на капялюшыку для самотнай: Лірыка. — Мн., 1998.
*Барадулін Р.* Выбраныя творы: У 2 т. — Мн., 1984.
*Барадулін Р.* Збор твораў: У 4 т. — Мн., 1996—2002.
*Беларуская дакастрычніцкая драматургія.* — Мн., 1968.
*Беларуская дакастрычніцкая паэзія.* — Мн., 1967.
*Беларуская дакастрычніцкая проза.* — Мн., 1965.
*Беларуская драматургія:* Альманах. — Мн., 1994—2003. — Вып. 1—7.
*Беларуская літаратура:* Проза 20-х гадоў: Хрэстаматыя. — 2-е выд. — Мн., 1997.
*Беларуская літаратура:* Хрэстаматыя. — Мн., 2004.
*Беларускія пісьменнікі Польшчы:* Другая палова XX ст. — Мн., 2000.
*Бічэль Д.* Снапок: Выбр. вершы. — Мн., 1999.
*Бондар Т.* Рагнеда. — Мн., 2005.
*Бондар Т.* Спакуса: Раман. — Мн., 1989.
*Броўка П.* Збор твораў: У 7 т. — Мн., 1975—1978.
*Броўка П.* Збор твораў: У 9 т. — Мн., 1987—1992.
*Броўка П.* Крыніца з-пад Вушачы: Вершы і паэмы. — Мн., 2003.
*Брыль Я.* Выбраныя творы: У 3 т. — Мн., 1992—1993.
*Брыль Я.* Запаветнае: Выбр. тв. — Мн., 1999.
*Брыль Я.* Збор твораў: У 5 т. — Мн., 1979—1981.
*Буйло К.* Выбраныя творы: У 2 т. — Мн., 1981.
*Бураўкін Г.* Выбранае. — Мн., 1998.
*Бураўкін Г.* Чытаю тайнапіс вачэй...: Вершы пра каханне. — Мн., 2001.
*Быкаў В.* Выбраныя творы. — Мн., 2004.

*Быкаў В.* Збор твораў: У 4 т. — Мн., 1980—1982.
*Быкаў В.* Збор твораў: У 6 т. — Мн., 1991—1994.
*Бядуля З.* Збор твораў: У 5 т. — Мн., 1985—1989.
*Веснаход:* Апавяданні "Маладняка". — Мн., 1987.
*Вялюгін А.* З белага камення — сіняе пламенне: Кн. паэзіі. — Мн., 1993.
*Вярцінскі А.* Хлопчык глядзіць...: Выбр. вершы і паэмы. — Мн., 1992.
*Галасы вёснаў:* Сучас. бел. паэзія. — Мн., 1997.
*Галасы маіх сяброў:* З паэзіі народаў свету / Пер. У. Караткевіча. — Мн., 1993.
*Галубовіч Л.* Таемнасць споведзі: Вершы. — Мн., 1993.
*Галубок У.* Творы. — Мн., 1983.
*Гартны Ц.* Збор твораў: У 4 т. — Мн., 1987—1989.
*Гарун А.* Выбраныя творы. — Мн., 2003.
*Гарун А.* Сэрцам пачуты звон: Паэзія, проза, драматургія, публіцыстыка. — Мн., 1991.
*Гарэцкі М.* Збор твораў: У 4 т. — Мн., 1984—1986.
*Гарэцкі М.* Прысады жыцця: Апавяданні, аповесці. — Мн., 2003.
*Гарэцкі М.* Скарбы жыцця // Полымя. — 1993. — № 2.
*Гарэцкі М.* Творы. —Мн., 1990.
*Геніюш Л.* Выбраныя творы. — Мн., 2000.
*Гігевіч В.* Карабель: Аповесці, раман. — Мн., 1989.
*Гігевіч В.* Марсіянскае падарожжа: Раман, аповесці. — Мн., 1990.
*Гілевіч Н.* Выбраныя творы: У 2 т. — Мн., 1991.
*Гілевіч Н.* Збор твораў: У 4 т. — Мн., 1996—2003.
*Гілевіч Н.* Любоў прасветлая. — Мн., 1996.
*Глебка П.* Збор твораў: У 4 т. — Мн., 1984—1986.
*Глобус А.* Адзінота на стадыёне: Апавяданні. — Мн., 1989.
*Грахоўскі С.* Выбраныя творы: У 2 т. — Мн., 1994.
*Грачанікаў А.* Выбранае. — Мн., 1988.
*Дайнека Л.* Меч князя Вячкі; След ваўкалака: Раманы. — Мн., 1993.
*Далідовіч Г.* Жывы покліч: Выбр. — Мн., 1995.
*Далідовіч Г.* Заходнікі: Раман. — Мн., 1994.
